**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

**Установа адукацыі**
**"Гомельскі дзяржаўны універсітэт**
**імя Францыска Скарыны"**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**В. С. НОВАК, А.А. КАСТРЫЦА**

# ФАЛЬКЛОРНАЯ ПРАКТЫКА

**ПРАКТЫЧНЫ ДАПАМОЖНІК па раздзеле**
**"КАЛЯНДАРНАЯ АБРАДНАСЦЬ"**
**для студэнтаў спецыяльнасці**
**1-21 05 01 "Беларуская філалогія"**

**У 2 частках**

**Частка 1**

**Гомель**
**УА "ГДУ імя Ф. Скарыны"**
**2009**

УДК   398.3 (= 161.3) : 378.147.88 (075.8)
ББК    82.3 (4  БЕІ = 411.3) - 4 : 63.52 (=411.3) – 731 я73
Н 723

Рэцэнзент:
кафедра беларускай культуры і фалькларыстыкі установы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны”

Рэкамендаваны да выдання навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны”

Новак, В.С.
Н 723 Фальклорная практыка : практычны дапаможнік па раздзеле “Каляндарная абраднасць” для студэнтаў спецыяльнасці 1- 21 05 01“Беларуская філалогія”. У 2 ч. Ч.1 / В. С. Новак, А.А. Кастрыца; М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 119 с.

Практычны дапаможнік па раздзеле “Каляндарная абраднасць” фальклорнай практыкі накіраваны на аказанне дапамогі студентам ў авалоданні навыкамі апрацоўкі набытага матэрыялу ў адпаведнасці з асноўнымі пытаннямі і адрасаваны студэнтам спецыяльнасці 1- 21 05 01 “Беларуская філалогія”.

УДК   398.3 (= 161.3) : 378.147.88 (075.8)
ББК 82.3 (4     БЕІ = 411.3) - 4 : 63.52 (=411.3) – 731 я73

© Новак В.С., Кастрыца А.А., 2009
© УА “Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны”, 2009

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

## ЗМЕСТ

Уводзіны ……………………………………………………….... 3
1 Зімовы цыкл земляробчага календара .......................................... 4
Піліпаўка ........................................................................................ 4
Калядна-навагодні комплекс......................................................... 6
2 Веснавы цыкл земляробчага календара ...................................... 24
Масленіца ...................................................................................... 24
Гуканне вясны……………………………………………....... 38
Вялікдзень…………………………………………………… 55
Юр'е……………………………………………………………… 73
Пахаванне стралы......................................................................... 85
Тройца (Сёмуха)……………………………………………... 103
Праводзіны русалкі…………………………………………..... 110

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

# Уводзіны

Практыкі з’яўляюцца часткай адукацыйнага працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў і накіраваны на замацаванне ў вытворчых умовах ведаў і ўменняў, якія атрыманы ў працэсе навучання ў вышэйшай навучальный установе, на авалоданне вытворчымі тэхналогіямі і навыкамі вырашэння сацыяльна прафесіянальных задач.

Мэтай фальклорнай практыкі з’яўляецца авалоданне першаснымі практычнымі навыкамі прафесійнай дзейнасці, звязанай са збіраннем фальклору. Практычная работа студэнтаў па збіранні вусна-паэтычных матэрыялаў паглыбляе і пашырае веды па фальклору, атрыманыя на лекцыях і практычных занятках, знаёміць з жывым бытаваннем вуснай народнай творчасці, дазваляе непасрэдна сустрэцца з выканаўцамі фальклорных твораў і набыць навыкі збіральніцкай дзейнасці.

Частка 1 практычнага дапаможніка па раздзеле “Каляндарная абраднасць” фальклорнай практыкі ўключае матэрыл зімовага і веснавога цыклаў земляробчага календару, накіравана на аказанне дапамогі студентам ў авалоданні навыкамі апрацоўкі набытага матэрыялу ў адпаведнасці з асноўнымі пытаннямі і адрасавана студэнтам спецыяльнасці 1- 21 05 01 “Беларуская філалогія”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# 1 Зімовы цыкл земляробчага календара

## Піліпаўка

*Пытанні*
Чым займаліся ў піліпаўскія вечары?
Чаму іх называлі попрадкамі?
Якія выконвалі песні на Піліпаўку?

*Узор запісу*

На гэтае свята ў асноўным збіралася маладзёж. У асноўным пралі лён. Пелі песні, казалі прымаўкі, пелі песні:

Пасеяла агурочкі блізка над вадою,
Буду хадзіць, паліваці горкаю слязою.
Расціця, расціця, гурочкі, у 4 радочкі,
Не бачыла я мілага 4 гадочкі.
А на пяты ўвідала, як сірэнь завяла,
Не сказала яму: “Здраствуй, калі маці стаяла,
Люлі-люлі, стаяла”.

***Запісана ў в. Нівы***
***ад Татарынавай Марыі Іванаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Дзмітрачковай А.***

У піліпаўскія вечары дзяўчаты і жанчыны збіраліся ў адной хаце, прадзілі прадзіва. Гэтыя сустрэчы называліся попрадкамі. Дык вось на іх за работай, канешне, спявалі. Песні былі жыццёвыя. Пеліся і жартоўныя песні. Таксама і розныя былі расказваліся. Расказвалі па чарзе. Вось за гэтай працай і не заўважылі, як і заставаліся на ноч. Пагэтаму піліпаўскія вечары ў нас яшчэ называліся вечарыніцамі. Я ведаю такую жартоўную песню:’

–Мышка, мышка, дзе была?
– У Бога была.
– Што рабіла?
– Кросны ткала.
– Што саткала?
– Кусок сала.
– Дзе тое сала?
– Кот з’еў.
– Дзе кот?
– На паляну збег.
– Дзе тая паляна?
– Кветкамі зарасла.
– Дзе кветкі?
– Дзеўкі парвалі.
– Дзе ж тыя дзеўкі?
– Хлопцы пабралі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

А яшчэ існуе такое павер'е ў народзе, што на Пиліпаўку ваўкі ходзяць.

***Запісана ў г. Жлобін***
***ад Казловай Эльвіры Іванаўны, 1936 г.н.***
***(ураджэнка в. Саланое Жлобінскага р-на),***
***студэнткай Ульянкінай У. (2004 г.)***

На Піліпаўку песні пелі, цяпер то не. Баяліся хадзіць у лес, баяліся ваўкоў і гаварылі: "На Піліпаўку воўк нема вые".

***Запісана ў г. Жлобін***
***ад Мурашкінай Зінаіды Мікалаеўны, 1924 г.н.,***
***студэнткамі Петрыкавай Ю., Шэндзелевай І., Мазай І., Шкаруба Н.***

У нас в деревне Большие Роги был Пилиповский пост, он был до Рождества. Это строгий пост. Его пересекал единый праздник, пристольный праздник – Микола. На Миколу собирались только родственники.

***Запісана ў г. Жлобін***
***ад Пракоф'евай Валянціны Іванаўны, 1935 г.н.,***
***студэнткамі Поляк К., Абрамавай В., Івановай Я. (2008 г.)***

Зачын Піліпаўкі быў ранняй зімой. Шэсць нядзель пасцілі, ня елі мяса, малако, масла, рыбу. Калі хто балеў, можна было есці. У пост пяклі сачні (сухія бліны з бульбы). З печы вымяталі шуму (мусар) і на голы падол клалі тыя сачні. Пасля клалі на стол. Сачні засыхалі і імі пасціліся. Елі ў пост і кіслую капусту. Сачні дзелалі так: варылі бульбу нячышченную, как сварыцца – чысцілі. Кідалі бульбу ў ступу і пярстом талклі, пака не палучаўся шар. З печы вымяталі шуму і раскатвалі з бульбы бліны. Толькі сначала іх валялі ў муке, а патом клалі на чысты дол у печы, вілашнікам іх варочалі. Потым выцягвалі, клалі на стол, яны засыхалі і ўсё – гатоў.

***Запісана ў в. Забалоцце***
***ад Дарафеевай Раісы Данілаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткай Скобелевай Т.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Калядна-навагодні комплекс

*Пытанні*

Як у вашай мясцовасці адзначаюць Ражаство, Новы год, Вадохрышча?

Як у вашай мясцовасці рыхтавалі куццю? Калі адзначалася і як яна называлася (бедная, багатая, вадзяная)?

Якім чынам рыхтаваліся да калядных святкаванняў?

Якія прыкметы і павер'і былі звязаны з першай куццёй?

На якую куццю ў вашай мясцовасці выконваўся рытуал заклікання марозу?

Ці запрашалі на куццю (дзядоў, ваўкоў)?

З якой мэтай выкарыстоўвалі на Каляды сена, салому?

Ці пераапраналіся ў вас падчас калядавання і шчадравання?

Якімі былі маскі пераапранутых калядоўшчыкаў?

Хто ўваходзіў у склад каляднай світы?

Як прасілі дазволу пакаладаваць, пашчадраваць?

Як адбываўся абрад "ваджэння казы" (мядзведзя, жорава, каня, кабылы, сабачкі)?

Як дзякавалі за падарункі?

Ці насілі ў вас "зорку" ("звязду", "гвязду")?

Ці паказвалі батлеечнае прадстаўленне?

Ці хадзілі са "шчодрай" падчас шчадравання?

Хто такія "засявальнікі", калі хадзілі засяваць?

Якія калядныя песні выконваліся гаспадару, гаспадыні, дачцэ, сыну?

Ці вядомы вам такія гульні, як "Жаніцьба Цярэшкі", "Памярла наша Мальвіна, памярла"?

Якія вы ведаеце варожбы шлюбнага характару, варожбы аграрна-магічнай скіраванасці (як варажылі на Ражаство, Новы год, Вадохрышча)?

*Узор запісу*

## Каляды

Урэмя от Рождества до Крышчэння называлоса дзве недзелі святыя або Мясоед. Дзень пэрэд Роством называўса Посная куцця. У гэты дзень робілі 12 страў. На стол под скацерць клалі сено. За вэчэрой цягалі сено, гадалі, які будзе ўрожай, які лён: як выцягвалі доўгую сеніну, то – добры, а як кароткая сеніна, то – плохі. Гэтое сено лежало на столе от пэрвой куцці до другой. Потом его звязвалі ў фартушок, і воно лежало под столом до Крэшчэння. Уранку на Крышчэнне гэто сено хозяйка ці хозяін нёс его і отдаваў худобі.

До вэчэры стараліса подвязаць сад. Хто молодзейшы – ішоў пэрэвеслом подвязваць дрэвы. Казалі, шо так робілі, коб сад добрэ родзіў.

Пэрэд святам выпэкалі спецыяльны хлеб, які называлі "хлебцы". Іх спецыяльно качалі ў муку і рабілі продоўговатой формы, а не круглой, як обычно.

За вэчэрой прыглышалі есці кашу мороза. Мороз прыглышалі на ўсе тры куцці. Прыглышалі ўсе члены сем'і. Казалі:

Мороз, мороз, ходзі куццю есці,
Не йдзі ні на овёс,
Ні на яблоні, ні на худобу.

Так казалі тры разы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Колі ўрано на Роздво ці на Новы год у хату прыйдзе первы мужчына, то казалі, шчо корова оцеліць быка. Колі прыходзілі дзеці, то казалі, шчо гэто добрэ.

На Шчэдрэца дзеўкі гадалі про свою судзьбу. Гадалі так: бралі вэршок з куцці і клалі под голову. Пэрэд сном казалі:

Куцця, дай мне знаці
З кім мне ў пары стаці.

Ловілі чорну куру, трэба, шчоб кожная з дзевок, якія гадаюць, подзержала ее ў руках; кожная дзеўка насыпае перад собой гурбу зерна, куру пускаюць у серэдзіну. До чыёй гурбы гэтая кура подыдзе і клюне, тая дзеўка і першая замуж пойдзе.

Бралі первы млінец і бегалі з ім на двор, слухалі, з якога боку собакі гаўкалі, значыць у той бок замуж пойдзе.

Бралі дровы з костра ў охапку, потом шчыталі, калі до пары – у гэтым годзе будзеш до пары (замуж выйдзеш), а колі не – не пойдзеш замуж.

На крыжову дорогу бегалі, калі стрэцяць, то одну ногу розувалі, трэба шоб тобе носок надзевае.

Вэршок з куцці і ўсе остаткі еды покідалі на столе. Ставілі на стол яшчэ воду. Пожні клалі ў гурбу, казалі коб сем'я не распаласа, была разам, у гурбі.

Вэчор на Новы год называўся шчодры або багатая куцця. От Роства до Хрышчэння куццю спраўлялі тры разы. Першая куцця называлася піліпаўская, посная куцця, другая – багатая, шчодрая, мясоедная, трэцяя – строгая галодная куцця.

Колядоваць ходзілі ўвэчэры на багатую куццю. Тых, хто ходзіў колядоваць, называлі колядністамі.

Колядоваць ходзілі со звездой. Надзевалі маскі, робілі коня з кошэля порваного. Ёго вельмі баяліся, бо вон біўся. Убіраліся ў "смэрць з косой". Коляднікі подыходзілі до хаты і казалі:

Добры вэчор, пані дзяцьку,
Засповаці вам колядку,
Ці гэ пірожка подасьце.

Калі гаспадар разрэшаў, то споваліі песні. Сповалі столько калядок, колькі хозяін загадваў. Былі такіе колядкі:

Под Покровой ночы-звёзды,
Дрэмлёт руское село.
Все дорожкі, все тропінкі,
Белым снегом замело.

Кое-где огні погаслі,
Слаўно звёздочкі гораць.
На огонь бегуць сугробом
Со звёздой толпа реб'ят.

Под окошкамі стучатса,
Рождество твоё поюць.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Хрысту слава! Хрысту слава!
Раздаёцца там і тут.

*   *   *

Небо і земля, небо і земля
Ныне торжествуюць.
Анголы з людзьмі, анголы з людзьмі
Весёло празднуюць.

Прыпеў:
Хрыстос родзіўся, бог уплоціўса,
Анголы спэвалі, царне вітаюць,
Поклоны даюць, пасторі граюць,
Чудо, чудо возвешчаюць.

Во Віфліеме, во Віфліеме,
Вэсёла новіна.
Чыстая дзева, чыстая дзева
Родзіла сына.

Прыпеў.

Трые царые, трые царые
З Востока прыходзяць.
Смірное ліво, смірное ліво
У злото прыносяць.

Прыпеў.

*   *   *

Пані куры рэзала
На чэвічок кроў капала – 2р.
З чэвічка на ногу,
З чэвічка на ногу,
Дэй на жоўтую подлогу – 2р.
Адзе пані пана дзела?
Я до войска пшоважала
А мы з туля едземо
Недзе пана не відзёло
Адзе пані пана дзела?
Пані пана зарэзала,
У грудэчку схавала,
На ём ружы насеяла.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Росці, ружа, высоко,
Под тобою пан глыбоко.
Пані куры рэзала,
На чэвічок кроў капала,
А з чэвічка ды на ного
Дэй на жоўтую подлогу.
(Кожны радок паўтараецца 2 разы).

* * *

Калі праспявалі калядку, то казалі:
Дай Бог за год дождаці
І на той гад добры калядкі маці,
Шоб родзлі свінні чорны, белы,
Шоб сало хорошэ мелі.

Калі ж гаспадар не дазваляў калядку споваці, то казалі:

У гэтой хаці,
Нема мо даці,
Солому тоўкуць,
Пірогі пэкуць

***Запісана ў в. Беражное Столінскага р-на ад Тульман Алены Аляксандраўны, 1933 г.н., студэнткай ХвацюкН.***

## Варажба

Гэту варажбу рабілі на Каляды да дваццаці чатырох гадзін. Бралі стакан, на яго ставілі сподак. Узяць паперку, на ёй напісаць імя, потым завярнуць у яе тры капейкі арлом уверх. Каля голай сцяны ці каля дзвярэй спальвалі паперку. Калі паперка пачынае тлець, то на сцяне ці дзвярах з’явіцца адлюстраванне. Гэта можа быць дарога, рука, змяя, пярсцёнак.

Рабілі гэта на Каляды да дваццаці чатырох гадзін. Бралі стакан, налівалі ў яго вады. Прывязвалі да вырванага валаска пярсцёнак і трымалі яго над стаканам з вадой. Колькі разоў стукнецца, у столькі гадоў выйдзеш замуж. Калі вельмі многа, то доўга бу-дзеш жыць.

На вілкі завязвалі ніткі і запальвалі ўсе разам. Пры гэтым дзяўчына запаміната сваю нітку. Чыя першая згарыць – тая дзяўчына першая выйдзе замуж.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У багатую каляду пяклі бліны. Дзяўчына выходзіць на вуліцу і першму мужчыне дае блін і пытае, як яго завуць. Імя гэтага чалавека будзе імем суджанага.

Рабілі гэту варажбу на Каляды пасля 24. 00 гадзін 2-3 чалавекі.

Аднаму завязвалі вочы, выключалі святло. Бралі чатыры стаканы. У адзін куток ставілі стакан з соллю, у другі – з цукрам, у трэці – з меддзю, у чацвёрты – пусты або наліць вады.

Раскруціць аднаго чалавека. Потым ён павінен паказаць пальцам у любы куток. Калі пакажа на стакан з соллю, то будзе дрэннае жыццё са слязамі, калі на стакан з цукрам – салодкае жыццё, добрае, калі на медзь – багатае, калі на пусты стакан, то будзе пустое жыццё з клопатамі.

Рабілі на Каляды да дваццаці чатырох гадзін.

Напісаць 21 паперку з імем суджаных, пакласці пад падушку.

Класціся спаць у адным наску, прыгаворваючы: "З кім мне век векаваць, прыйдзі да мяне насок надзяваць". Да ўсходу сонца трэба было прачнуцца, выцягнуць адну паперку і прачытаць імя. Імя гэта будзе імем суджанага.

***Запісана ў г.п. Буда-Кашалёва***
***ад Каралёвай Ганны Дзмітраўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Цімашэнка Н.***

## Калядка

Пайшла каляда, калядуючы,
Ой, каляда-калядзіца!
А за ёю хлопчык, жабруючы,
Ой, каляда-калядзіца!
Пайшла каляда па лесу, лесу,
Ой, каляда-калядзіца!
Рассыпала каляду па верасу,
Ой, каляда-калядзіца!
А вы, дзевачкі, дай не гуляйце,
Ой, каляда-калядзіца!
Ідзіце, каляду сабірайце,
Ой, каляда-калядзіца!
Красны дзевачкі не пайшлі гуляць,
Ой, каляда-калядзіца!
А пайшлі ў лес каляду збіраць,
Ой, каляда-калядзіца!

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Мы ж цябе, панначка, не ўзневажаем,
Ой, каляда-калядзіца!
А з Новым годам паздраўляем,
Ой, каляда-калядзіца!
А з Новым годам, святым Ражэством,
Ой, каляда-калядзіца!
Святое Ражэство радасць прынясло,
Ой, каляда-калядзіца!
Святое Васілле ўзвесяліла,
Ой, каляда-калядзіца!
Іван-Красціцель ваду пасвяціў,
Ой, каляда-калядзіца!
Ваду пасвяціў, на ўвесь свет пусціў,
Ой, каляда-калядзіца!
Дый за сім словам жывіце з Богам!
Ой, каляда-калядзіца!

***Запісана ў г.п. Буда-Кашалёва***
***ад Нікіценка Марыны Пятроўны, 1917 г.н.,***
***студэнткай Мяркулавай М. (1994 г.)***

На Каляды хадзілі шчодры. Пераапраналіся і пелі песні. Пераапраналіся хто ў каго: то куфайкі панадзяваюць, то лісу якую здзелаем і ўсё такое. На Каляды гадалі. Гадалі на жаніха. Клалі пад кравацъ лесвічку і загадвалі, штоб прысніўся сужаны і перавёў цераз ваду.

На кладачку клалі ежу і звалі сабаку. Чыю ежу первую ўхваця, кажуць, тая первая дзеўка і замуж выйдзе.

Быў такі ў нас случай. Адна жанчына гадала ля кладбішча, а када ваз-врашчалася, за ей сабачка які-та чорненькі ўслед бяжыць. Яна таго сабачку адштурхівала, адштурхівала, а ён услед за ёй бяжыць. І яна, як толькі пайшла дамоў, чераз парог пераступіла і кончылася, памёрла.

***Запісана ў г.п. Буда-Кашалёва***
***ад Прусавай Зоі Фёдараўны, 1922 г.н.,***
***студэнткамі Азарэвіч В., Карлікавай К., Смірновай А.***

Хадзілі па хатам ў асноўным малышы. Пераапраналіся абычна ў лісу хітрую. Пелі:

Шчодзер-бодзер,
Бацька-злодзей.

Варажылі: пад кравацъ клалі лесвічку, штоб ён прысніўся. Калі жаніх пераходзіў яе, то гэта твая судзьба.

Дзеўкі ложаць ежу, да чыей сабака першай падыдзе ці ўхваціць кусок, тая першая замуж і пойдзе.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Не было прыкметы, калі ў першы дзень пасля Новага году зойдзе мужчына, то год будзе ўдачны, а калі жанчына – то не.

У гэты дзень сена кладуць пад абразы, вараць грэчневую кашу і куццю. У гэты дзень была добрая прымета, еслі куццю давалі і жывёлам, і людзям.

***Запісана ў г.п. Буда-Кашалёва***
***ад Прусавай Зоі Фёдараўны, 1922 г.н.***
***(нарадзілася ў в. Кутнева Салігорскага р-на),***
***студэнткамі Міненка В., Барадзіной В., Валошынай А., Кашлаковай А.***

Прыходзілі ў хаты пераадзетыя. Пелі песню калядную:

Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую.

У калядную ноч жанчыны хадзілі пераадзетыя ў мужчын.

Гэтае гаданне гадалі ў Каляды. Перакідвалі праз забор бот ці цераз крышу палку або снегу, штоб жаніх найшоўся скарэй.

***Запісана ў г.п. Буда-Кашалёва***
***ад Усцінавай Ніны Арцёмаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткамі Міненка В., Валошынай А., Кашлаковай А.***

Першая куцця 6 январа – постная куцця, варажылі ноччу. На дарозе семям абсыпаліся і стаялі, ждалі, дзе сабакі забрэшуць. У якой старане сабакі забрахалі, туды і замуж дзеўка пойдзе. Калі клаліся спаць, казалі: “З кім мне век векаваць, прыйдзі лён збіраць”. Жаніх должэн прысніцца.

Забор абдымалі з закрытымі вачамі і лічылі, колькі дасок – у пару ці не ў пару. Таксама хадзілі карову мацалі з закрытымі вачамі. За рогі – за багатага пойдзеш, за хвост – за пастуха.

Другая куцця перад Новым годам 13-14 января. У хату прыносілі куру. Ставілі перад ёй зеркала, ваду і зярно. Калі кура ваду піць будзе – муж п’яніца, у зеркала глядзець – свякроў сварлівая, зярно есці – муж багаты.

На цыганках хадзілі. Дзелалі куклу і ў цыганскім адзенні хадзілі па хатах. Цыган з пугай, а цыганка з куклай, варажылі. За тое, што варажылі, збіралі грошы і прадукты. Гэтыя прадукты астаўлялі на Крашчэніе і на Крашчэніе гулялі. Міханоша – той, хто прадукты вазіў.

## Песня цыганская

Збіраліся, збіраліся, збіраліся
Дзеўкі ў лес, у лес, у лес
Па ягады, па смародыня душы.
Все дзеўкі панабраліся,
Адна дзеўка не набралася.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Прыйшоў к дзеўкам незваны госць.
Сталі дзеўкі шаптаць, перашэптваць,
Чым нам госця папоштаваць.
Адна ў косы, другая за валасы
Сталі яго цераз стол ташчыць,
Ажна яго валасы трашчаць.

Перад Новым годам куцця багатая. Запраўлялі яе жырам, а посныя куцці не запраўлялі. Куццю варылі з пярлоўкі. На шчедры дзеці хадзілі па хатах разам з цыганамі.

### Шчодрынская песня

Ля калодзежа, ля рублёнага
А там Васечка ж коніка паіў.
Коніка паіў, з канём гаварыў,
Святы вечар!
А коня, коня, я цябе прадам
За бочку віна, за трубку сукна,
Святы вечар!
А таго віна Оля сцерагла.
Сцерагла, сцерагла, легла заснула,
Святы вечар!

Трэцяя куцця 18-19 января перад Крашчэніем. Дзеўкі дзелалі качэлі і качаліся. На іконе, на дзверах, на сарае ставілі красты – куццю красцілі.

На ўсе тры куцці варылі куццю з пярлоўкі і кралі яе. Дзеўкі кралі куццю ад маці, каб тая не бачыла. З украдзенай куццёй гадалі: “З кім мне век векаваць, прыйдзі мне куццю браць”. Таксама на куццю калодзеж замыкалі: “З кім мне век векаваць, прыйдзі ка мне ваду браць”. На Крашчэніе дзелалі русалку. Дзеўкі дзелалі русалку, каб запугаць дзяцей. Каб тыя ў грады не хадзілі, не таптапі, не рвалі.

***Запісана ў в. Буда-Люшаўская***
***ад Свірыдзенка Таццяны Дзянісаўны, 1923 г.н.,***
***студэнткай Кузьмянковай Н.***

На Каляды пеклі праскуркі – аладдзі, якія ўпрыгожвалі хрэсцікам. У каробку клалі сена, кажух і ставілі куццю. Куццю варылі 3 разы: 6-7 – посная куцця, 13-14 – багатая куцця, 18-19 – простая куцця. На Хрышчэнне дзеўкі калыхаліся на качэлях. Гадалі. Зняць адзін чулок. Другі – на наге. Гаварыць: “З кім век векаваць, прыдзі чулок надзяваць!” Лажыцца і ні с кем не гаварыць да ўтра.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

На ўсе 3 куцці хадзілі кароў мацаць. Закрыеш вочы, і за што ўхваціш: за рогі – жаніх будзе багаты; за сярэдзіну – пасярэдзіне; за хвост– пастух.

Забор абнімалі з закрытымі вачамі – парная колькасць стаўбцоў, тады будзеш у пары, замуж пойдзеш у гэтым годзе.

На багатую куццю цыгане хадзілі з кабылай, з казой. Дзеўкі станавіліся сярод дарогі. Абсыпалі сябе вакол льняным семям і гаварылі: “З кім мне век векаваць, прыдзі лён пасяваць!”

Замыкалі калодзеж. Ставілі ваду пад караваць і кладку. Суджаны сніўся і пераводзіў цераз ваду.

Калядаваць хадзілі і пелі:

У ляску, у ляску на жоўтым пяску,
Святы вечар!
Пава лятала, пер’е раняла,
Святы вечар!
(Імя) збірала, у рукавок клала,
З рукаўка брала, вяночак віла,
Святы вечар!
Звіўшы вяночак, пашла ў таночак,
Святы вечар!
У тым таночку траіх палюбіла,
Святы вечар!
Аднаму дала шоўкавы платочак,
Святы вечар!
Другому дала залаты пярсцёнак,
Святы вечар!
За трэцяга сама пайшла,
Святы вечар!

***Запісана ў в. Буда-Люшаўская***
***ад Свірыдзенка Таццяны Дзянісаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткамі Фяськовай К., Варажун С., Валошынай А.***

Я не дзелала, а мая баба дзелала. Раней прынясе сена і пакладзе на куту, дзе іконы, на палаценчык харошанькі, а хто-небудзь малое залезе пад яго і будзе крычаць: “Кудах-дах-дах, кудах-дах-дах”. А баба несе з печы гаршчочык із куццёй і кажа: “Ко-ко-ко” – через усю хату ідзе і крычыць: “Ко-ко-ко”, і тая там: “Кудах-дах-дах”. І на стол паставіць на сена і тады ставіць каўбасы, мёд, пампушкі і ўсё, што гатовілі. Гэта багатая куцця.

Шчадрую, шчадрую, каўбасу чую.
Дайце каўбасу, дамоў панясу.
Шчадрую, шчадрую, каўбасу чую.
Скарэйце дарэйце, за нас не барэйце.
Кароткія кажушкі – памерзлі нашы петушкі.
Шчодзер-бодзер, Гаўрыла-сябрук – злодзей,
Кабылку украў, пад печ захаваў,
Ногі тырчаць, сабакі гірчаць.

***Запісана ў в. Сямёнаўка Гомельскага р-на***
***ад Карэба Таццяны Іванаўны, 1931 г.н.,***
***студэнткамі Мендзелевай Т., Ачарэт А. (2006 г.)***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

З 13 на 14 студзеня хадзілі ўсе па хатах, дварах шчадраваць. Зайдзем у двор, у акно пастучым, начынаем песні пець, а хазяева стол накрывалі, нас частавалі. Як багатыя людзі – стол харошы накрывалі, нас угашчалі добра. А бедна жылі – нечым было частаваць, мажа сала ў каго ёсць, а так – жыта місачку, проса.

Вось прыходзілі да хазяіна, пачыналі песні пець. Каза з намі ідзець, яшчэ звязду дзелалі. Прыйдзем да хазяіна, спяваем:

Эй, добры вечар табе, пан-хазяін,
Святы вечар!
Мы твайго двара не мінавалі,
Святы вечар!
А канец стала сядзіць Васіля,
Святы вечар!
Галоўку схіліў, звёздачку раніў,
Святы вечар!

Што ж ты, як лязы разліўся Дунай,
Святы вечар!
Што ж ты ў Дунаю само Бог купаўся,
Святы вечар!
Сам Бог купаўся, на муку здаўся,
Святы вечар!

Вот эта песня, як Бог радзіўся і яго ў яслях у авечак захавалі, сёмага чысла, гэта як яго распіналі і песню пелі.

Яшчэ, калі прыходзілі к хазяіну, тады каза падае, а мы маленькую песенку пяём, а каза ляжыцць і толькі "ге-ге-ге".

Го-го-го, каза,
Го-го-го, сера!
Дзе каза нагой,
Там жыта капой.
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.
Дайце казе сала,
Каб сала ўстала.
Дайце казе мёду
Цэлую калоду.

Паходзім па хатах, насабіраем усяго, а тады дзеўкі маладыя нанімаюць "грышчы". Прададуць усё, грошы сабяруць – нанімаюць гарманіста, плацяць хазяіну за хату і маладзёж гуляе 3 дні за тыя грошы, што сабяруць на шчадроўках.

***Запісана ў в. Урыцкае Гомельскага р-на***
***ад Нядолі Марыі Паўлаўны, 1947 г.н.,***
***студэнткай Доліч Т. (2005 г.)***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У нас на Каляды всегда ўбіралі хату, бялілі паталок, мылі пол, усё прыбіралі, штоб было чысценька. Маці заўсёды гатовіла куццю, ну, гэта такая каша з ячмянёвых круп. У нас гаварылі, што яе трэба было гатовіць з адзінакавай колькасці круп, але ж мы, калі пасаявалі, то дзелалі так, а калі ж не, то ўжэ колькі ўсыпалі, столькі ўсыпалі. Гэту кашу гатовілі всегда ў адным і том жа гаршку. Кашу нельзя було пробаваць, калі яе гатовілі, а так жа яе нельзя было пробаваць і тады, калі яна ўжэ была гатова, да самага вечара.

У нас было 3 куцці. Калі каша была гатова, то вось тую корачку, што на ёй рабілася, не знімалі, на яе клалі трошкі солі і вынасілі ў хлеў, а патом, кагда яе забіралі, то глядзелі: калі куцця была пагрызена, то казалі, што лета будзе вельмі жаркае, а калі не, то будзе дождж і ўраджай будзе харошый.

У нас на куццю заўсёды запрашалі мароза, всегда адчынялі акно, а інагда і дзверы і казалі так: “Эй, мароз, ідзі куццю есці, каб летам не марозіў, а калі зараз не прыдзеш, то летам, каб тожэ не прыходзіў”.

Калі накрывалі стол, то всегда сначала клалі сена на стол, а потым ужэ засцілалі белай скацерцю і ставілі ўжэ всю еду. Сена клалі, таму што ведалі, што Ісус Хрыстос нарадзіўся на сене.

Кагда ўсе сядзелі і елі, всегда ў хаце было ціха, куццю всегда да канца не з’ядалі, адносілі ў хлеў скаціне. Патом, кагда ўжэ все паелі, мама всегда выцягвала з-пад скацерці саломіну, калі яна была доўгая, то і ўраджай лёну будзе добры, а калі кароткая, то плахі. А бацька выходзіў на вуліцу і глядзеў на неба: кагда была многа звёзд, то ў лесе будзе многа ягад, грыбоў.

Казу ў нас не вадзілі, а таксама не дзелалі касцюмаў, а проста ўсе чысценька адзяваліся, дзеўкі всегда адзявалі красівыя платкі з махрамі. Хадзілі ўсе па хатах, стучалі ў акно і пелі песні. Звязду ў нас тожэ не насілі і іграў такіх не было. Ну, проста ўсе сабіраліся разам, гулялі са снегам і ўсё. Дзеці малыя бегалі, песні пелі, стукалі ў акно, а хазяйка ім ужэ што-небудзь давала, каб у іх быў добры ўраджай. У нас такіх песен не пелі, што зараз: “Каза там прыехала, дайце грошай, каб назад уехала”. Не, у нас была вось такая песня:

Учора з вячора
У нас настала навіна –
Божа маці Ісуса радзіла,
А парадзіўшы, у Ядрані скупала,
А скупаўшы, да ў шаўкове спавіла.
На зыход сонца прыязджае 3 цары,
Яны прыводзяць Божай маці 3 дары:
Што едзін цар кветачкай надзяляў,
А што кветачка, то святое Ражаство,
То ўсяму свету вяселька і радасна,
А за ўсім словам, святкуйце здаровы.

***Запісана ў в. Урыцкае Гомельскага р-на***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

***ад Ашомка Ганны Раманаўны, 1927 г.н.***
***(прыехала з в. Прыбалавічы Лельчыцкага р-на),***
***студэнткай Сядзько Н. (2003 г.)***

У нас было тры куцці. Першая куцця адзначалася 6 студзеня, другая куцця – 13 студзеня, а трэцяя – 18. Куццю называлі яшчэ Калядою. Страву рабілі з пярловых круп. Адрозненняў паміж куццямі ніякіх не было.

На стол слалі скацерку, пад скацерку клалі сена. Сена ляжала да Крашчэння. Сена гэта худобе не давалі. Верх куцці аддавалі курам.

Час калядавання. Тады было вельмі вясёла. Збіраліся дарослыя, дзеці, падлеткі. Ішлі, некаторыя перадзяваліся ў казу і пастуха, другія – не.

Звычайна пастухом рабілі дзядзьку, а жанчына была абавязкова казой. Ішлі ўсе чарадой, падыходзілі да хаты гаспадароў, каза падала на пол, і толькі тады калядоўшчыкі пачыналі гаварыць: “Наша каза ўстала, дайце ёй кусок сала!” Давалі нешта, часцей за ўсё сала, але маглі даць і хлеб, капейкі нейкія сыпнуць, тады каза падымалася:

Го-го-го, каза,
Го-го, серая!
Ну-тка, козачка,
Расхадзіся-тка
Па ўсяму двару
Гаспадарскаму.

Дзе каза ходзе,
Там жыта родзе,
Дзе каза не бывае,
Там вылягае.

Іншыя ўвогуле і не перапраналіся. У іх песні вельмі адрозніваліся:

– Святы вечар! Ці папець вам?
– Папець!
– Каму папець?
– (імя)
– А раным-рана (імя) устала?
– Рана ўстала, хусткі качала,
Хусткі качала, сабіралася.
Сабіралася ў цэркву ідціць,
У цэркву ідціць Богу маліцца.
І Хрысту кланяцца.

Пасля ўжо калядоўшчыкі збіраліся і распачыналі гульню.

Навагоднія варожбы былі вельмі цікавымі для дзяўчат. Мы варажылі і верылі, што наваражанае збудзецца.

Дровы насілі: ці ў пары будзе дзяўчонка? У калодзеж камені кідалі: калі вада бурчэць, будзе сварлівая свякруха. Кідалі за вароты башмакі: у які бок носік паверне, туды і замуж пойдзеш.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Бліны пяклі і сабак карміліі: чый блін сабака першы схопе, тая і выходзіла першая замуж.

Яшчэ б хацелася дадаць. Сустракаліся і такія гаспадары, што і не выходзілі, калі да іх прыходзілі калядоўшчыкі. Тады шчадроўшчыкі пелі: “Шчодзер-бодзер, а твой бацька злодзей!”

***Запісана ў в. Церуха Гомельскага р-на***
***ад Міранoвіч Марыі Герасімаўны, 1935 г.н.***
***(перасяленкі з в. Малашкі Кармянскага р-на),***
***студэнткай Яшанковай В. (2006 г.)***

Калядкі праўлялі ў студзені.

Спачатку прыбіраліся ў хаце, рабілі святую вячэру, на ёй абавязкова была куцця, якую гатавалі з ячменю на алею, называлі яе “вялікай куццёй”. Таксама на стале былі і іншыя стравы – рыба, бліны, але абавязкова посныя, і розныя падліўкі. Перад тым, як сесці за стол, абавязкова запальвалі свечку і маліліся Богу. Потым ўжо, позна вечарам, усёй сям’ёй садзіліся есці куццю.

Стукалі ў акно, звалі Мароза і гаварылі: “Мароз, Мароз, хадзі куццю есці. Не хадзі, не марозь летам, а марозь зімой”.

Уранні сена няслі ў хлеў, клалі ў кубло, прыгаворваючы: «А ты, сена, трасіся, каб куры нясліся».

На калядаванне пераадзяваліся дзеўкі ў цыганскія спадніцы і хадзілі пець песні. Прыходзілі таксама і калядоўшчыкі, пелі калядныя песні, а гаспадары частавалі ўсіх рознымі стравамі (блінамі, мачонымі яблыкамі). Яны вадзілі з сабой і казу, пераапранутую дзяўчыну або хлопца. Лічылася, што каза выганяе ўсіх нячысцікаў са двара і прыносіць добры ўраджай.

На Каляды спявалі песні:

Шчадроўка шчадравала, пад вакенцам начавала,
Што хазяйка напякла, прынясі нам да вакна.
Што горыча будзе ўсем, што халодна будзе нам,
Святы вечар, добры вечар!

***

Каляды, калядкі,
Вазьмі бліны, аладкі,
У маляваным вазочку,
На вароненькам канёчку.

А пад Новы год адзначалі другую куццю. Яе называлі «шчодрай», бо была яна ў поўным дастатку, гатавалася з мясам, каб сытней была. У навагоднюю ноч вялікае значэнне прыдавалася варажбе. Дзеўкі збіраліся ў адной хаце і гадалі аб будучым замужжы. Вось кожная з іх брала кусочак каўбаскі або сала, клала ў розныя месцы на падлозе, а потым кідалі сабаку

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

або кату. Чый кусочак першым будзе з’едзен, тая першай выйдзе замуж. Верылі ў сны: трэба было з’есці што-небудзь салёнае на ноч і не піць нічога, і так легчы спаць, пры гэтым сказаць: “Суджаны-ражаны, прыйдзі ка мне ноччу і прынясі вадзіцы”. Той, хто ў сне прыйдзе з вадою, той і будзе мужам. Некаторыя пісалі імёны хлопцаў на паперы і клалі пад падушку. Той, хто прысніцца ноччу, той і будзе мужам.

Трэццю куццю называлі “поснай” або “вадзяной”. Гатавалі яе перад Вадохрышчам. Хрышчэнне – хрысціянскае свята. У гэты дзень гаспадары свяцілі ваду і акраплялі ёю свае хаты. Пеўчыя спявалі бажэственны песні. Лічылася, што гэтая вада дапамагае ад розных хвароб чалавека і жывёлы і захоўваецца на працягу ўсяго года ў кожнай хаце за абразамі.

***Запісана ў в. Церуха Гомельскага р-на***
***ад Казіміравай Кацярыны Ксенафонтаўны, 1918 г.н.,***
***студэнткай Слесарэнка А.***

Ого, на Каляды добра гулялі, елі добра, усё насмачнейшае шоб было: варэнікі варылі, пеклі калачы. Так і сустракалі Каляды, гулялі ў гульні, перадзяваліся, але тое была мужчынская работа, а бабы да дзеўкі ўжо песні пелі. Хадзілі па хатам, а як жа. То раней хадзілі толькі да таго, дзе свае, знакомыя. Гэта цяпер ідуць, дзе свет гарыць. Пелі песні, паказвалі прадстаўленні розныя. Хто ўгосціць калбасой, салам, а хто і чарку нальє. Ну, вабшчэ, давалі, у каго што было. Гэта, значыць, калядавалі так. Мужчыны хадзілі з кабылай, з казой, бывала, зорку неслі. Да ў Бога прасілі:

Урадзі, Божа, жыта
Да на новае лета,
Штоб Машачка расла
Да жыта жала,
У снапочкі вязала.

Варылі жа кашу, на куццю саломку клалі. Гэта так рабілі, каб жыта добра расло, год багаты быў. Мароз звалі, у акно стукалі: “Мароз, Мароз, хадзі куццю есці!” І так тры разы гаварыць нада было.

Пелі песні калядныя:

А ў пана, у пана
Двор гароджаны вінаградам.
Прачыста Маці сына радзіла,
У рай узяла, Хрыстом назвала,
Святым Ражаством.

* * *

Ходзіць-паходзіць месяц па небу,
Святы вечар!
Ходзіць-папросіць зорак з сабой,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Святы вечар!
Пажадайце, мае зоркі,
Святы вечар!
Бога маліці і Бога прасіці,
Святы вечар!

***Запісана ў г.п. Лоеў***
***ад Хмелянок Марыі Яўсееўны, 1927 г.н.***

Варылі куццю з пярловай крупы. Тады ставілі яе ў кут. Сена немножка туда, куццю эту становяць, і яна стаіць. Не пераадзявалі нікога.

***Запісана ў г.п. Лоеў***
***ад Шумігай Валянціны Лаўрэнцьеўны, 1933 г.н.,***
***Шумігая Міхаіла Пятровіча, 1929 г.н.***

На Каляды варажылі: уносілі трэскі, заплюшчвалі вочы, неслі іх у хату, шчыталі: у пары ці не? Калі чотнае, то будзеш у пары.

Яшчэ на зеркала свечку палілі. Еслі пакажацца хто, той будзе сужаны, а калі страшнае пакажацца, то зеркала кідалі.

***Запісана ў г.п. Лоеў***
***ад Язікавай Зіновіі Калінікаўны, 1924 г.н.***

Усяк гулялі. І з падарожнікам варажылі, гаварылі: "Падарожнічак, падарожнічак! Ты стаіш ля дарогі, усё бачыш: і старога, і малога. Скажы імя сужанага майго".

Варылі на Каляды куццю, усё варылі. Потым накрывалі стол скацеркай, станавілі куццю і ўсю пішчу. А пад куццю сена лажылі. Уся маладзёж закрывала глаза і выцягвала сена. Значыць, длiннае сена – длінны лён будзе, кароткае – кароткі лён.

Куццю гатавалі з ячменнай крупы. Абычна на Каляды пераапраналіся: і ў казу, і цыганкамі былі. А я абычна цыганкай была.

Таксама на куццю запрашалі мароз. А як запрашалі, у акно стане ацец ілі кто і крычыць: "Мароз, мароз, прыходзь куццю есці!" А патом сабіралі яду і неслі ў рэку кідалі. А я ўжэ не знаю, чаго так рабілі. Мароза трэба было карміць, каб ён быў большы, штоб ураджай быў лучшы.

Казу на Каляды вадзілі, вядом яе з гармошкай, мужчына казу вёў з бубнам. Спявае, танцуе казёл, брыкаецца, па хаце бегае. А і звязда была абязацельна. Звязда сімвалізавала празнік.

Потым да каго-небудзь у хату заходзяць, паздраўляюць з Новым годам.

Казу вадзілі па ўсёй дзярэўні і калядавалі, а потым пакалядуюць дзяўчаты, а потым ужо встречаюць Новы год, гуляюць. А на каляду давалі (гэта ж пасля вайны) хлеб, там яшчэ чаго давалі: сала кусок, хто мяса дасць, хто сала дасць, хто калбасы дасць, хто капеек дасць.

***Запісана ў г.п. Лоеў***
***ад Пожык Мар'і Сяргееўны, 1929 г.н.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

6 января – першая посная куцця. Рыхтавалі на вадзе. Нужна, штоб была пшанічная крупа.

А ўжэ на 13 января збіраліся на багатую куццю. На Шчадруху ўжэ тут расшчэдрывалісь на ўсё: хто парасёнка зарэжа, хто што.

19 января – галодная куцця. Галодная, таму што, калі Ісус Хрыстос пайшоў па зямлі, дак ён спаткаўся з сваімі вучнямі. Патом в этат дзень едзят до асвешчэнія вады, а яно дзе-та ў час начынаецца. Ядзяць усё поснае, нічога не дабаўлялася.

Хадзілі калядаваць, пераапраналіся. У асноўным спявалі “Вумную жану” і хадзілі па знаёмым. Напрымер, заходзім (там Іван ілі Раман, як яго завуць) і пяем:

У нашага Івана вумная жэна,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.
Вумная жэна семячкі мяла,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.
Семячкі мяла – золата найшла,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.
Да купіла ж яна да 3 горада,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.
Первы горад славен, славен Кіевам,
Святы вечар.
Втары горад славен, славен Чарнігавам,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.
Трэці горад славен, славен Лоевам,
Бог даў яму вумную жэну в ево даму.

Я пераадзявалася ў цыгана. Казу не вадзілі. Звязду кагда-та даўно насілі. Яна сімвалізавала раждзеніе Ісуса Хрыста.

Потым ужэ ж пайшло Крышчэніе: вадзічку акрэшчвалі, красіва было.

На багатую куццю звалі Мароза: “Мароз, мароз, хадзі кашу есці”. А падходзіш к яблыне з тапорыкам да кажаш: “Не будзеш пладаносіць – ссяку цябе”. Глядзіш, на следушчы год усё добра.

У нас пад куццю ложаць сена. Салому лажылі кагда-та, длінную такую, на ўвесь стол. Скацерцю закроют, ну і ставяць куццю. А патом хазяйка ўжо выцягвае, перакрэсціцца і выцягвае. Калі длінную выцяне – длінны лён будзе. Салома ляжала на стале, яе цягнулі на багатую куццю. Ну, хазяйка перакрэшчываецца і кажа: “Пашлі, Божа, лён высокі”.

А ў нас ставілі куццю на сена, таму што Ісус Хрыстос радзіўся, в яслі палажыўся на сена. Вот мы і куццю ставім на сена.

Куццю ставілі ў кут на сена перад іконамі. А патом, када ўжэ ўсцілалі сенам стол на вячэру, дык ставілі на стол куццю. Усе па 3 ложкі куцці далжны былі ўзяць, таму што празнуем мы Ражджаство 3 дня, Пасху – 3 дня, Троіцу – 3 дня, крэсцімся-то мы трыма пальцамі.

Спачатку куццю пачыналі есць радзіцелі. Яны ўжо на Шчадруху збіраліся сваім сямействам кажды дома. А потым сабіраліся ўжо ў якую хату і дапазна гулялі.

***Запісана ў г.п. Лоеў***
***ад Кардаш Вольгі Нікіцічны, 1927 г.н.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Гадалі. Тухлі нада кідаць чэраз вароты.

Вынасіць нада смецце і слухаць, дзе сабака брэшыць, адтуль і суджаны.

Калісь я бегала з блінам. Мама іспекла першы блін, а я яго схапіла і пабегла. Іду і нікога не страчаю. Бегла, ідзе мужчына: "Дзядзечка, скажыце, як вас зваць?" Дык ён кажа: "Іван". Ды я і вышла замуж за Івана.

Кірпічыны кусочак, кусочак хлеба, гарошыну, а тады соль, ваду, а тады іголка на суровай нітке – усё гэта ложаць на стале. Ложаць крэсцікам. А тады тая нітка будзе ўжэ ў старану круціць.

Прыйдзеш назаўтра ў хату і стой ля парога. Маўчаць, і ты стой. Скажа: "Праходзь", дзвярамі ляпнуў – значыць, пойдзеш замуж. А скажа: "Ідзі, садзіся", – то ўжэ ўсё, у гэтым годзе не пойдзеш замуж, то будзеш сядзець дома.

Кашу варылі. Абыкнавенную кашу із пярлоўкі зварацьды ўсё.

Было 3 куцці. Посная была куцця 6-га, а то такая багатая – ета перад шчадрухай, а тады трэцяя, гэта ўжэ тады хрэст пішуць на дзвярах у Ражаство.

На посную куццю ставілі картошачку посненькую, сена кусочак, гаршчочак кашы. Сена нада, каб на яго хлеб палажыць, соль паставіць, гэта карове аддавалі – гэта рабілі даўней.

Звалі мароз на Крышчэнне: "Мароз, мароз, ідзі к нам вячэраць. Летам не хадзі, грэчкі не марозь". І так 3 разы. Эта ўжэ на Крышчэнне.

Хадзілі шчадраваць. Пелі "Вумную жэну". Падходзяць звечара пад акно, дзе жылі мужык і жонка :

А ў нашага Івана была вумная жэна,
Вумная жэна семечкі мела,
Семечкі мела, шэлежок нашла.
За той шэлежок свечачку купіла,
Свечачку запаліла. Святы вечар!

А тады і зноў начынай.

Када-та хадзілі з казой, казу вадзілі: "Казе паскакаць, а нам паспяваць. Святы вечар".

Мы калісь на шчадруху (матка дае нам сумку) чэраз плячо яе павесім, як цяпер вешаюць еты рукзак. Хто што дае: хто кусочак сала, хто блінца, хто калбасы. А тады мы ўжо ідзём у адну хату і начынаем вячэраць. Ходзім можа да поўначы, можа, болей шчэ.

***Запісана ў г.п. Лоеў***
***ад Ніцко Ніны Пятроўны, 1921 г.н.***
***(раней пражывала ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на),***
***Прыцэп Галіны Іванаўны, 1934 г.н.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

# 2 Веснавы цыкл земляробчага каляндара

## Масленіца

*Пытанні*
Як спраўлялася Масленіца?
Якія масленічныя звычаі вы ведаеце?
Ці палілі на Масленіцу пудзіла? З чым гэта было звязана?
Якія стравы гатавалі на Масленіцу?
Ці каталіся на Масленіцу на санях і да т.п.?
Якія масленічныя гульні вы ведаеце?
Ці вядомы ў вас звычай “цягаць калодку”?
Ці хадзілі віншаваць маладых людзей, што ўзялі шлюб?
Ці ездзілі ў госці да цёшчы? У які дзень масленічнага тыдня?
Якія масленічныя песні ведаеце?

*Узор запісу*

**Масленіца**

Ездзюць на конях, гуляюць, з гармошкай ездзюць. Частушкі пяюць.

На масленку пякуць бліны з маслам, сыр заліваюць маслам, эта ўжо ядзяць толькі масла. Сыр такі жаруць на сковарадах, вот дзелаюць сыр такі: адціскаюць яго пад гнётам, такім каржом падсушваюць яго ў печы, а тады рэжуць кусочкамі малымі ў гаршчок у бальшы і заліваюць маслам. А тады ўжо на Масленіцу етае ядзяць. Масла жарацьна скаварадзе з бульбай, і ета ўжо масленіца.

***Запісана ў в. Данілавічы***
***ад Дзмітрачковай Тамары Кузьмінічны, 1936 г.н.,***
***Чуяшковай Любові Кузьмінічны, 1933 г.н.***
***студэнткамі Кушнаровай К., Булдзінай М.***

Масленіцу гулялі, ды мала. Бліны елі, на санках каталіся, ды не толькі з гары. Ставілі дзеравянны кол, прывязвалі да яго санкі і каталіся. Вечарам збіраліся ў адзін дом і гулялі. Гарманіст іграў, мы пелі, гулялі з хлопцамі па-рознаму. Харавод вадзілі, а песні былі розныя, хто якія знаў (тэксты песен не памятае). Калодку не цягалі, а толькі тыя маладыя, што нядаўна свадзебку гулялі, хадзілі па хатах і іх паздравлялі, усяго ім жалалі.

***Запісана ў в. Залаты Рог***
***ад Лук’яненка Вольгі Цімафееўны, 1935 г.н.***
***студэнткай Лапіцкай В.***

**Як я ў таткі загавела**



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Як я ў таткі загавела,
Як я ў таткі загавела,
Загавела, штоб яго баня
Згарэла, згарэла.

Як я ў таткі заставалася,
Як я ў таткі заставалася,
Заставала, штоб яго хінця,
Запятавала, запятавала.

Мы ж думалі масленкі
Сем нядзель, ажно тыя
Масленкі адзін дзень.
Масліная! Шчаслівая!
Расцяніся да Вялікадня!
Запрашу я шэрага сабаку
Да й паеду ў горад па табаку
Масліная! Шчаслівая!
Расцяніся да Вялікадня!

***Запісана ў в. Янова***
***ад Цімашэнка Еўдакіі Іванаўны, 1916 г.н.,***
***студэнткай Касьянавай Г.***

На Масленіцу сала не елі. Пяклі бліны, пампушкі і елі з маслам, з малочным. На Масленіцу абычно былі заказы на жаніцьбу (а пасля Вялікадня жаніліся).

На масленіцу пабіўся баран з казлом.
Белакурачка бычка прадала.
Памяшалася вада з пяском.
Парасёначак яечка знёс.
Голы, голы карапуз закрычаў.
Голы голаму ў запазуху схаваў.

***Запісана ў в. Стаўбун***
***ад Чуяшовай Галіны Фёдараўны, 1930 г.н.,***
***студэнткай Трухановіч Л.***

На Масленіцу абязацельна пяклі бліны, бальшыя, укусныя, румяныя. Угашчалі ўсіх, хто прыходзіў. Гулялі весела. На санках каталіся пад гару, у снежкі гулялі. Шчэ вясну звалі, яго хутка ўжо прыходзіла.

***Запісана ў в. Залаты Рог***
***ад Чайковай Клаўдзіі Цярэнцьеўны, 1930 г.н.,***
***студэнткай Глазковай М.***

Называлі яе масленка. У той дзень пеклі бліны. Разныя-разныя: і тонкія, і тоўстыя, і з начынкай, і без. Нашы дак з квашанаю капустаю дзелалі, мне нравілася. Калодку не вадзілі, затое на санках што вытваралі. Ішлі на самую крутую горку і ехалі: і так і сяк, і ўперад, і ўзад, і ўбок. Сядзем учатырох – і пакаціліся. Увечары сабіраліся ўсе ўмесце, танцавалі, гулялі, смяяліся. Ігры розныя прыдумывалі. Усякае было. А як жа мы жаніліся, вось так паходзім, пагуляем, пасмяемся – і пад вянец.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Друг друга блінамі ўгашчалі. Устраівалі конкурсы на лепшую хазяюшку. Аднажды і я выйграла. Толькі стыдна было, кагда ўзналі, што бляны маці пякла.

Яшчэ хлопцы на столб лазілі, ну эта рэдка. Вот частушкі пелі пад гармошку.

Спецыяльна паздраўляць толькі што пажаніўшыхся не хадзілі. Песні пелі розныя.

***Запісана ў в. Старое Сяло***
***ад Васільцовай Матроны Сяргееўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Задзірака А.***

Масленіца – перад постам, за сем нядзель да Пасхі. На Масленіцу пеклі бліны, елі ўсё малочнае. Прыгожа адзяваліся. Хадзілі адзін к аднаму ў госці. Калі ў якой сям'і быў первы год зяць, то цешча пякла бліны і прыглашала на іх зяця з сям'ёй.

На Масленіцу абязацельна каталісь і на санях, і на санках, і на салазках.

На Масленіцу нічога па хаце не робяць.

***Запісана ў в. Перадавец***
***ад Суглоб Марыі Іванаўны, 1932 г.н.***
***студэнткай Барсуковай А.***

На Масленіцу цэлую нядзелю гуляюць: каней маладых аб'язджаюць, катаюцца на конях, на санях з горак. Быў такі звычай, што зяці абавязкова ездзілі к цёшчам загаўляць. У гэтыя дні абязацельна пеклі бліны, рабілі сыркі – усё з малочнага. Таксама ў нас было такое: маладыя хлопцы пасадзяць бабку-павітуху ў сані, а самі запрагуцца замест коней і катаюць яе па сяле, а потым частуюць яе. А так, здаецца, болей нічога не было. А песні пелі:

Я думала, масленкі сем нядзель,
Ажно тыя масленкі адзін дзень.
Масленая Шчаслівая,
Расцяніся да Вялікадня – у,

Як я ў таткі загавела, загавела,
Штоб яго баня згарэла, згарэла,
Як я у таткі залетавала, залетавала,
Штоб яго хінця запятавала, запятавала.
Масленая шчаслівая,
Расцягніся да Вялікадня – у

***Запісана ў в. Янова***
***ад Таўсцянковай Еўдакіі Іванаўны, 1929 г.н.***
***студэнтамі Крупскай Н., Шабалінай Н.,***
***Малашковай Л., Вержахоўскай В., Фяськовым С.,***
***выкладчыцай Новак В.С.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

На Масленіцу банкет вадзілі. Сабіралася двароў пяць, хадзілі старыя, пажылыя, дзевачкі не хадзілі; песні пелі, выпівалі.

***Запісана ў в. Неглюбка***
***ад Барсуковай Анастасіі Афанасьеўны, 1925 г.н.***
***студэнткамі Чарняўскай В., Платонавай А., Цэпавай Ю.***

На Масленіцу зіму праводжаюць, а вясну сустракаюць. Пякуць бліны, ядзяць сыр да масла, мяса есці нельга. На арэлях не гушкаліся, ляльку не спальваюць. На яе яшчэ ходзяць у сваты.

***Запісана ў в. Вялікія Нямкі***
***ад Дрыгуновай Анастасіі Канстанцінаўны, 1912 г.н.,***
***студэнткамі Чарняўскай В., Платонавай А.,***
***Цэпавай Ю., Пракапоівч І.***

На Масленіцу нежанатаму ступу прывязвалі да нагі і ён адкупліваўся салам або хлебам. Маладых коней аб'язджалі. Пелі пад хатай той дзяўчыны, якая ў Коляды выйшла замуж:

Латаць, латаць не ўмее,
Нявестка красён латаць.

***Запісана ў г. Ветка***
***ад Дзюньдзікавай Праскоўі Еўдакімаўны, 1920 г.н.***
***студэнткай Крупскай Н.***

На Масленіцу ўсяго многа пяклі, варылі, бліны трэба каб былі, таму што бліны – гэта як тое сонейка. Клікалі, каб сонейка прыйшло. Масленіцу заклікалі:

Наша Масленка гадавая,
Госцейка наша дарагая,
Яна не пешшы да нас ідзе,
Яна на коніку едзе.

***Запісана ў в. Свяцілавічы***
***ад Палтарацкай Ганны Фёдараўны, 1930 г.н.,***
***студэнткай Карніеўскай Т.***

Перад пастом 7 нядзель, а потым Пасха.

Масленіца спраўлялася ў гарадах. Пеклі бліны ўсю нядзелю. Елі толькі малочнае, мяснога не елі. На Масленіцу пелі вясеннія песні:

Наша масленіца гадавая,
Яна госцейка дарагая.
Яна пешшу к нам не ходзіць,
Усё на коніках раз'язджае,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Штоб коні былі вараныя,
Штоб слугі былі маладыя.

У первую нядзелю да паста песень не пелі.

***Запісана ў в. Брылёва Гомельскага р-на***
***ад Гарбузавай Марыі Яўсееўны, 1929 г.н.,***
***перасяленкі з в.Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на,***
***студэнткай Кашлаковай А.***

Маладзейшыя дзеўкі крычалі: «Масленіца шчаслівая, працяніся да Вялікадня». Пелі, танцавалі, гулялі.

– Весняначка, дзе твая дачка Мар'яначка?
– Пагнала быцу на травіцу…

– Вясна, вясна, што ты нам прынясла?
– Прынясла ты нам карабец яец…

***Запісана ў п. Станкі***
***ад Воінавай Ганны Пахомаўны, 1921 г.н.***
***студэнткай Страха М.***

На Масленіцу каталісь мы на санках. Раньша снягі вялікія былі. Каталісь на санках, што самі дзелалі. Сабіралісь парні, дзеўкі. Парні выводзілі лучшых коней. Коней украшалі, калакольчыкі вешалі, ленты вязалі, дугі ўкрашвалі. Коней украшалі, заплятaлі ім хвасты ў касічкі.

Садзіліся ў сані. Прыдзелывалі задок да саней. Гэта спінка такая высокая.

На Масленіцу бліны ўтрам пяклі. Хто первым схваціт, той первы замуж выйдзе.

Запісана ў г. Мазыр (б.в. Пхоў)
***ад Салаўёвай Марыі Еўдакімаўны, 1920 г.н.***
***(перасяленкі з в. Свяцілавічы Веткаўскага р-на)***
***студэнткамі Кірылавай Ю., Сапонавай А.***

Масленіцы ў нас не было. Ну, як: бліны пеклі, у госці хадзілі. Хадзілі ў другую дзярэўню да родных (у каго там былі). А так па чужых не хадзілі. А такого нічога не палілі, не праводзілі зіму. Елі такое, хто што меў. Так як і на Каляды: колькі душ у ся'і,  столькі і кусочкаў сала. На малаке маці разбівала бліны, ды тое сала; бліны макалі ў жаранае сала.

***Запісана ў г. Мазыр***
***ад Масько Тацяны Мікалаеўны, 1930 г.н.,***
***Сядлецкай Аксеніі Сцяпанаўны, 1922 г.н.,***
***Верамеевай Кацярыны Птроўны, 1926 г.н.***
***студэнткімі Кушняровай К., Мельчанка Т.,***
***Краўцовай Л., Карнеявец В., Сакаловай Ю.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Бліны пяклі, но ў нас большэ варэнікі. Собыраліся, у нас складчына называлася. Но надо ўжэ ж собрацца, потом ужэ ж і последні дзень. Заўтро ўжо пост. У суботу, у васкрасенні попылі, поелі, у панядзелак ужэ пост. Пелі пэсні, яка попалася, яка нравіцца, яку знаеш.

***Запісана ў г. Мазыр***
***ад Кандратавай Галіны Пятроўны, 1916 г.н.***
***(раней пражывала ў в.Капякі Рэшацілаўскага***
***р-на Палтаўскай вобл.)***
***студэнткамі Данчанка Ю., Маскаленка Ю., Васільевай І.,***
***Вяргеенка С.А. 2004 г.***

Тады ж каровы дзяржалі і масла збіралі, да ў такія дзежачкі, збіралі ды елі. Даўней у нас на Стары Новы год, на коляды, музыку нанімалі, гралі цэлыя суткі, асобенна духавая была.

***Запісана ў г. Мазыр (Бабры)***
***ад Багданік Паўла Матвеевіча, 1923 г.н.***
***(вул. Гагарына, 20 ( раней вул. Багданікі.)***
***студэнткамі Невяроўскай Н., Вярэніч М.,***
***Ступінскай М., Кабадзейцавай І. 2004 г.***

Масленіцу атмечалі. Масленіца – эта ўжо, шчыталась, пост наступаў, бальшой пост перад Ражжаством. Значыць, паследняя недзеля – Масленіца. Можна было толькі масло есці, малочные прадукты, паэтаму называлась масленіца. Нельзя было свадзьбы дзелаць. Ужо ўродзі бы пост наступаў.

***Запісана ў г .Мазыр (вул. Я.Коласа, 25/15)***
***ад Бондаравай Васіліны Сяргееўны, 1923 г.н.***
***(прыехала з в.Тульгавічы Хойніцкага р-на),***
***Станкевіч Валянціны Станіславаўны, 1927 г.н.***
***студэнткамі Невяроўскай Н., Вярэніч М.,***
***Ступінскай М., Кабадзейцавай І.***

На Масленіцу ўсе гаспадыні спякалі шмат бліноў, а хто ўмеў, рабілі і сыр. Длілася Масленіца цэлую нядзелю. У апошні дзень нельга было працаваць, і пагэтаму ўся радня ездзіла адзін к аднаму ў госці. Хадзілі паздраўляць маладых людзей, што ўзялі шлюб. Пелі масленічныя песні:

У нас маслены дзень,
На гары бабы сядзелі,
Кулаком зямлю пабілі,
Аб нявестак судзілі.
Адна нявестка шэльма была:
Клець запаліла, упроч пайшла.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

А як там багацця згарэла:
Жалудова бочка віна было,
Арэхава міса масла была.

Масленніца, а к нам ластавіцца,
Маладая, маладая, маладзіцца,
Выйдзі ты на вуліцу,
Вынясі сыру – радзіш сына,
Вынясі мачку – радзіш дачку.
Як я маю выходзіць,
Як я маю выносіць?
Свёкар скажа: "Пасялуха",
Свякроў скажа: "Пабягуха",
Мілы скажа: "З другім ходзіш,
Другога любіш".

***Запісана ў г. Мазыр Гомельскай вобл.***
***ад Чырыс Вікторыі Паўлаўны, 1921 г.н.,***
***студэнткай Рэчыц А.***

Када ў нас справлялі Масленіцу, дык нас надзевалі ў абрадныя касцюмы. Я таргавала ў кіоске блінамі з маслам. На Масленіцу палілі саламянае чучала. Пелі песні, гулялі.

***Запісана ў г. Буда-Кашалёва***
***ад Усцінавай Ніны Арцёмаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткамі Азарэвіч В., Карлікавай К., Смірновай А.***

На Масленіцу запрагалі коней у тройку, украшалі коней, усякімі каўрамі засцілалі, балабончыкі віселі, ну і бабалобіны. А потым ездзілі, каталіся. Маладзёж заўсёды каталася. Вот, і чыя тройка лучшая за ўсіх, лучшай прыбрана, красівейшая каторая, дак таму – прыз. Кажды паэтаму, хто выязджаў на тройцы, дак дзелалі красівае ўсё, коней украшвалі і павозку.

А потым ужо выносілі бліны, пяклі ўсе і выносілі ў каго якія. Падыходзіш потым, бярэш гарачы блін і еш.

І калодку цягалі. Гэта ўжо еслі хто жаніцца сабіраўся, ну, і не жаніўся ў тыя Каляды, ну, значыць, ужэ яму калодку. Ета значыць, што еслі хто не жаніўся ці замуж не пайшла, дак гаварылі, што вам ужэ і калодка [асаблівасцей правядзення звычая і хто цягаў калодку, інфарматар не памятае].

***Запісана ў в. Бацунь***
***ад Цітарэнка Евы Іванаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Цітарэнка Н. (2001 г.)***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Масленіцу спраўлялі, ездзілі на канях, пяклі бліны. Калыхаліся на арэлях і дзеўкі, і хлопцы. На Масленіцу хадзілі па сватах. Дзевак сваталі. На Масленіцу пелі ўсякія народныя песні.

Вясну загукалі на Благавешчанне. 25-27 апрэля, перад Паскай. Да Паскі не пелі, да Благавешчання. Тады пачыналі пець песні:

Пусці, маменька, на ручай гуляць,
На ручай гуляць, селязнёў ганяць.
То не селязні ўсе касатыя,
Два малодчыкі нежанатыя.
Яны ішлі, ішлі, станавіліся,
За адну дзевачку пасварыліся.
Вы не біцеся, не сварыцеся,
Па-харошаму разыдзіцеся.
Астануся я аднаму каму,
Ваньку браваму,
Кучараваму.

***Запісана ў в. Буда-Люшаўская***
***ад Свірыдзенка Тацціяны Дзянісаўны, 1923 г.н.,***
***студэнткай Кузьмянковай Н.***

На конях каталіся, пеклі бліны. Абавязцельна на качэлях качаліся. Застолле было.

***Запісана ў в. Буда-Люшаўская***
***ад Свірыдзенка Тацціяны Дзянісаўны, 1923 г.н.,***
***студэнткамі Фяськовай К., Варажун С., Валошынай А.***

Надзевалі абрадныя касцюмы. Спальвалі чучала – як прашчанне з зімой.

***Запісана ў в. Глазаўка***
***ад Усцінавай Ніны Арцёмаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткамі Міненка В., Барадзіной В.,***
***Валошынай А., Кашлаковай А.***

Нежанатыя ў гэты дзень цягалі калоды.

***Запісана ў в. Глазаўка***
***ад Мільячэнка Анатоля Мікалаевіча, 1941 г.н.,***
***Мільячэнка Веры Аляксандраўны, 1946 г.н.,***
***студэнткамі Міненка В., Барадзіной В.,***
***Валошынай А., Кашлаковай А.***

Апошняя нядзеля перад Вялікім Постам называецца сырнай, масленай, або Масленіцай. Гэтую нядзелю елі толькі малочную ежу, а таксама рыбу. Людзі доўга чакалі гэтага свята, рыхтаваліся да яго і радаваліся яго

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

прыходу. Масленіца – вясёлы, з рознымі гульнямі і забавамі святочны дзень. Традыцыйным на гэткім свяце было катанне на тройцы коней з бубенчыкамі і звончыкамі. Такое катанне суправаджалася пеннем вясёлых песень. У гэтае свята людзі хадзілі ў госці, частавалі гасцей. Абавязковым пачастункам на Масленіцу былі бліны. Людзі прасілі адзін у другога прабачэння за ўсе грахі і мірыліся. Бо гэта было яшчэ "Прашчённае васкресенье", так называлі Масленіцу. На Масленіцу яшчэ рабілі розныя пугалы з добрымі і адмоўнымі персанажамі, вакол якіх вадзілі карагоды, спявалі песні. У прысутных прасілі дазволу вясну гукаць, што ажыццяўлялась напрыканцы свята:

Благаславіце, людзі,
Вясну гукаць,
Цёплага лета даждаць!

Яшчэ ўстрайваліся спартыўныя спаборніцтвы, мераліся сіламі. У канцы палілі пугалы з адмоўнымі персанажамі і зноў пелі, спявалі, вадзілі карагоды аж да цямна.

***Запісана ў в. Губічы***
***ад Торманавай К.П., 1925 г.н.,***
***студэнткай Ламанос А.***

Маслініца бывае розная: бывае каляднага мясаеду – 8 нядзель, бывае 9 нядзель, бывае 6 нядзель. Было раней, калодку прывязвалі на маслініцу хлопцу, які не жаніўся. Да Маслініцы пралі, ткалі, а на маслініцу ўжо не. Вышывалі, кружава дзелалі. А толькі гэта ўжо ў васкрасення – эта ўжо нічога не дзелалі. Так ужо нядзеля цэлая масленая, а толькі ў васкрасення нічога не дзелалі.

***Запісана ў в. Забалоцце***
***ад Чыкезавай Ганны Сцяпанаўны, 1929 г.н.,***
***Мацвеевай Марыі Раманаўны, 1944 г.н.,***
***Юранавай Анастасіі Андрэеўны, 1924 г.н.,***
***студэнткамі Малаковіч І., Пархоменка Д., Помазавай Т.,***
***Зубец Т., Фяськовай К., Байдаковай К.***

У нядзелю пяклі бліны з грэчнявай і пшанічнай мукі. Яе змешвалі. Бліны былі пульхныя, наздраватыя. Пеклі багата і клалі на рушнік на стале. Бралі мяса, сала, дзелалі мачанку к блінам. Хазяін садзіўся за стол першым на кут. Наліваў усім па чарцы гарэлкі. Хазяйка ставіла на стол усё смашнае: масла, сыр, каўбасы. У гэты дзень прасілі адзін у другога прашчэння за абіды. Потым ішлі на вуліцу гуляць. Спявалі песні, скакалі пад гармонь.

**А мы Масленку чакалі**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

А мы Масленку чакалі
І ў вакенца выглядалі,
Гару блінчыкаў складалі,
Яду маслам палівалі. 2 р.

А як Масленка прыйшла,
За сталы ўсіх прасіла,
Каўбас, сыру прынясла
Ды й прашчэння прасіла. 2 р.

***Запісана ў в. Крыўск***
***ад Цыркуновай Вольгі Цімафееўны, 1912 г.н.,***
***студэнткай Герцавай Т. (2002 г.)***

А на вуліцы Масленіца, Масленіца,
Вылецела з куста ластавіца, ластавіца,
Села ж яна на тыну, на тыну,
А кідала масла па таму, па таму,
А хто ўхопіць, дык таму, дык таму.

У нас сягодня Масленіца,
У нас сягодня Масленіца.
Даганяйце Масленіцу ў поле,
У нас сягодня Масленіца,

Садзіцеся, мальцы, на кані,
Даганяйце Масленіцу ў поле.

***Запісана ў в. Ліпа***
***ад Юркавай Надзеі Мікалаеўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Кудзінавай А. (2000 г.)***

На Масленіцу пяклі бліны і пасвяцалі ў царкве (інфарматар не памятае гульні і песні).

***Запісана ў в. Мікалаеўка***
***ад Мацюшэнка Марыі Васільеўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Мацюшэнка А. (2001 г.)***

Масленіца – гэта провады зімы. Яе лічаць па нядзелях пасля мясаеда. Катаюцца на канях, украшаюць дугу, пякуць бліны. А нас былі горкі, дык дзеці каталіся з іх на санках і ўсе.

Запісана ў в. Аздзеліна Гомельскага р-на
***ад Санько Вольгі Маркаўны, 1941 г.н.,***
***перасяленкі з в. Нудзічы Брагінскага р-на,***
***студэнткай Буйневіч В. (2005 г.)***

Масленіца, Масленка, Сырніца – гэта свята праводзін зімы і сустрэчы вясны. Гэта свята длілася цэлы тыдзень, але ў нашай вёсцы святкавалі толькі ў нядзелю. А было так: з саломы, паперы, каляровых стужак рабілі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вялікую бабу, якой малявалі ці вышывалі вочкі, нос, бровы, вусны. Затым апраналі яе ў кофту, спадніцу, фартух. У адну руку давалі блін, а ў другую падмазку. Такую бабу насілі па вёсцы і спявалі:

Ідзі, зіма, да Кракава,
Зноў ты прыйдзеш аднакава.
Ідзі, зіма, да Кіева,
Ты нам лета пакінула.
Ідзі, зіма, да крынічкі,
Ды забірай рукавічкі.

Аднавяскоўцы выказваюць адзін аднаму такія пажаданні: “Сырна вам! Маслена вам!” А таксама спявалі песні пра Масленіцу, часцей такую:

А нас сягодня Масленіца,
Прыляцела ластавіца,
Села-пала на жэрдачку,
Шчабятала вестачку,
Сыры ў масле тапіла,
Сырам гору набіла.

Нагуляўшыся па вёсцы, усе сабіраліся на жытнім полі, дзе загадзя было складзена вогнішча, куды была пастаўлена самае вялікае пудзіла Масленіцы. Калі яно запалае, людзі пачынаюць вадзіць карагоды і спяваць:

Ой, масленка-няшчаслінка,
Сера вутка сказала:
− Вясна скора, да й няхутка,
Праводзім зіму з качаргамі,
Стрэнем вясну з пірагамі.

Насвяткаваўшыся ўдоваль каля вогнішча, людзі сваімі кампаніямі разыходзяцца па дамах, дзе іх чакае абед. Галоўным пачастункам на Масленіцу з’яўляюцца бліны, таму што яны падобны на сонца.

Пасля абеда, калі пазваляе надвор’е, свята працягваецца на вуліцы. Моладзь гушкаецца на арэлях. Катаюцца на санках з гор, каб доўгім рос лён. А катаючыся, спявалі песню пра вясну “Ой, на гарэ”:

Ой, на гарэ, на гарэ,
Ды на камяніцы
Масленіца, Масленіца.
Як увідзеў дзяцюк дзеўку,
Скінуў рукавіцы,
Масленіца, Масленіца.

А на гарэ, на гарэ,
Ды на камушочку
Масленіца, Масленіца.
Як увідзеў дзяцюк дзеўку,
Скінуў сарочку,
Масленіца, Масленіца.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Сярод моладзі таксама праводзіліся розныя гульні. Любімай была такая: в гульне ўдзельнічаюць 2 чалавекі (хлопцы), яны сцапляюць рукі за спіной, падгібаючы адну ногу і скачуць на другой назе, пры гэтым імкнуцца талкнуць свайго праціўніка. Тыя, хто першы ўстане на дол дзвюма нагамі, выбывае з гульні. Яго месца займае іншы.

Старэйшыя людзі ў гэты вечар збіраліся на пасядзелкі, дзе спявалі, жартавалі, плясалі.

Калі пасля хаджэння гуртам па вёсцы ў гэты дзень сустракалі на сваім шляху мужчын халасцякоў, то жартавалі з імі:

Ох, ты, Масленіца-палізуха,
Палізала сыры, яйцы-каравайцы.
Ох, ты, Масленіца, красны бурак,
Хто не жэніцца – вечны дурак.

***Запісана ў в. Грабаўка Гомельскага р-на***
***ад Каменка Маргарыты Міхайлаўны, 1944 г.н.,***
***студэнткай Чарняўскай Г.***

Масленіца пачыналася не ў адно ўрэмя ўсягда. На паследняй нядзеле перад пастом, які перад Паскай.

На Масленіцу ядзяць толькі масла, сыр, мяса ні елі. Бліны з маслам пеклі, кашу любую запраўлялі маслам слівачным. У той дзень садзіліся на сеначкі, ездзілі па вуліцы, і гаварылі, і пелі “А мы сваю Масленіцу пракаталі”.

***Запісана ў в. Калініна Гомельскага р-на***
***ад Хамяковай Анастасіі Васільеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Шупляковай Г. (2002 г.)***

На Масленіцу дзяўчаты хадзілі і гадалі. Ну, гэта ж усё после вайны было, дак у нас асоба не гадалі, мы не панімалі асоба гэтага шчэ. А нашы ўжо мамы, дак тыя сабіраліся, гулялі. Сабіраліся па вечарах. Сабіраюцца ўжо і бліны пякуць. Гатовяцца, потым учыняюць бліны грачнёвыя. А маладжёж ужо, дзевачкі такія о бегалі гадоў па 13, па 14, дажа па 15, і ўжо ў вакно падслухалі: “Ага, там во бліны пякуць”. Харошае слова сказалі, а яны паслухалі і кажуць: “О, харошыя людзі жывуць, значыць, будзе ў мяне харошы мужык”.

Тады ўжо каго ўстрэціш. Во, напрымер, я хачу замуж выйсці. Еслі я ўстрэціла сабе харошага хлопца, там як яго завуць, напрымер. О такі ўжо будзе ў мяне і мужык, так будуць зваць.

***Запісана ў в. Клімаўка Гомельскага р-на***
***ад Кукалевай Марыі Данілаўны, 1935 г.н.,***
***студэнтам Дзіньдзікавым С.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Святыя вечара пасярэдзіне паста. Пякуць хрэшчыкі, ідуць на поле, каго сустрэнуць – святкуюць.

Дзеўкі пякуць блінцы зрання. Блін дзеўка кладзе ў карман і выходзіць з дому. Першага чалавека (мужчыну), якога сустрэне, пытае імя, так і будуць зваць яе суджанага.

Запісана ў в. Макаўе Гомельскага р-на
***ад Маісеенка Праскоўі Рыгораўны, 1920 г.н.***
***(перасяленка з в. Глухавічы Брагінскага р-на),***
***студэнткай Бажковай С. (2006 г.)***

Як какая-нібудзь жанчына дачку замуж не аддала ці сына не ажаніла, то сабіраюцца бабы і той жанчыне прывязваюць к наге калодку або дравіну, і ходзяць па хатах. Гэта жанчына далжна адкупіцца – даць бутылку ці дзеньгі.

***Запісана ў в. Макаўе Гомельскага р-на***
***ад Мікалайчанка Анастасіі Пятроўны, 1933 г.н.,***
***студэнткамі Ерафеевай І., Назарэнка М. (2006 г.)***

А мы масляную прагулялі, о-о-ой,
Прагулялі, прагулялі.
А мы масляную пракаталі.
Прайшоў лесавед, не жаніўся,
Ой, не жаніўся,
І ў манахах астаўся.

***Запісана ў п. Мірны Гомельскага р-на***
***ад Абрамцавай Лідзіі Уладзіміраўны, 1927 г.н.,***
***студэнткамі Яськовай Т., Парашчанка С. (2006 г.)***

Масленіцу празнавалі ў канцы феўраля ці ў начале марта. Бабы пяклі бліны з маслам. Блін считалі сімвалам сонца. Мужыкі радзілі сані, наражалі коней, ездзілі парамі і па аднаму запрэжанаму каню (у каго сколькі было коней). Каталі на санях дзяцей. Сарэўнаваліся, чыя ўпражка красівейшая.

Шчэ на Масленіцу ставілі стоўб вельмі высокі, каб цяжка на яго было залезці. На самы верх етага стаўба што-нібудзь вешалі, а самыя сільныя хлопцы лазілі даставаць. Лазілі і слабейшыя, але далажывалі толькі да палавіны, а то і меней.

Шчэ ў нас гулялі ў гульню “цягаць калодку”. Выбіралі самых старшых хлопцаў, якія да Масленіцы не ажаніліся, прывязывалі ім к наге калодку і ён яе доўжан быў цягаць.

Маладзёж гуляла, вадзіла хараводы, пелі вясеннія песні.

***Запісана ў в. Міхалькі Гомельскага р-на***
***ад Кавалёвай Еўдакіі Фадзееўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Гук Ж. (2003 г.)***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Масленіцу атмячалі ў канцы Каляд. Пяклі бліны. Хадзілі зяці к цешчам. А тыя стараліся задобрыць іх. У гэты дзень смачна наядаліся і рыхтаваліся да паста. Таксама каталіся на конях. Спявалі песні:

А мы сваю масленіцу пракаталі,
Сваю вясну прагулялі.
Наша масленіца – баламутка,
Хутка сына пажаніла,
А дачку аддала не хутка.

***Запісана ў в. Пакалюбічы Гомельскага р-на***
***ад Грыбанавай Н.І., 1935 г.н.,***
***студэнткай Падцерабковай Ю. (2001 г.)***

Масленіцу святкавалі пасля Каляд. На гэтае свята пяклі бліны, аладкі, пірагі. Першы блін пяклі і давалі маладзіцам. Яны выходзілі з хаты і першаму, каго сустракалі, давалі блін і пыталі яго імя – гэта імя было імя суджанага. На Масленіцу спальвалі чучала, якое рабілі з саломы і ўпрыгожвалі рознакаляровымі лентамі, гэта азначала «смерць» зімы і надыход вясны. Спявалі песні, гулялі, каталіся з горак на санках. Маладыя дзелалі качэлі і качаліся:

Сорак вожак пераваліласяя,
Сорак хлопцаў убілася,
Сорак дзевак зажурылася.

У гэты дзень таксама каталіся на канях. Калі хлопец да Масленіцы не жаніўся, то яму прывязвалі калодку, ён з ёй хадзіў, пакуль не адкупіцца (канфетамі, грошамі, гарэлкай).

***Запісана ў в. Церуха Гомельскага р-на***
***ад Казіміравай Кацярыны Ксенафонтаўны, 1918 г. н.,***
***студэнткай Слесарэнка А. (2005 г.)***

Садзіў всегда ацец на каня нас всех, і мы ехалі ў саседнюю дзереўню. Там жыў кросны наш з крёснай. Мы ездзілі к нім у госці са сваімі блінамі, і іх бліны былі. Вот так была. А штоб такія гулянні масавыя – не была. Мы ждалі этого празніка, патаму што эта была інцересна, што мы на кане паедзем в саседнюю дзеревню ў госці. Ехалі з песнямі.

***Запісана ў г. Гомель***
***ад Шумілінай Зінаіды Іванаўны,***
***перасяленкі з в. Чкалава Гомельскага р-на,***
***студэнткамі Юрчанка Н., Радзькінай Т. (2002г.)***



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Масленіца святкавалась за 45 дзён да Вялікадня. Гэта першае вясновае свята, якое завяршае зіму і ўслаўляе прыход вясны, сонца і цяпла. Маслены тыдзень ад панядзелка да нядзелі праводзіцца сумна. Па вечарах не працуюць. Ходзяць адзін да аднаго ў госці. Днём усе лічаць сваім абавязкам пракаціцца адны – на санках, другія – на лядзяшках, высячаных у рацэ, або замерзшай кадцы. Другія ездзяць на перавернутых, трохі падмарожаных лаўках або на простых досках.

На Масленіцу забаранялася есці мяса. Яго замянялі блінамі – сімвал сонца, надыходзячай вясны. Іх гатавалі з творагам, растопленым маслам, смятанай. Запрасіць гасцей на масленічныя бліны значыла, што вы жадаеце ім здароўя і доўгай жызні.

Маладыя каталіся на тазах, вазілі на санках чучала зімы, а потым спальвалі яго, развітваліся з халадамі.

Была і такая гульня, як калодка. Масленіца бярэ калодку і стараецца непрыкметна накінуць рэмень каму-небудзь на плечы. Пры гэтым гавораць:

– Будзеш цягаць, ці маеш выкуп даць?

Калі гуляючы дае выкуп у выглядзе чаго-небудзь смачнага, то Масленіца здымае рэмень з плячэй. Калі ж ён кажа:

– Лепш калодачку цягаць, чым гасцінца ўсім даваць.

Тады Масленіца зашпільвае рэмень на плячах і ўдзельнік гульні цягае калодку, а ўсе астатнія спяваюць:

– Ой калодачка, калодка, стала жыццё не салодка.

Спяваюць, пакуль гуляючы не аступіцца.

– Затаміўся цягаць, магу выкуп даць.

У канцы свята ўсе водзяць масленковы карагод.

***Запісана ў в. Яроміна Гомельскага р-на***
***ад Сакаловай Праскоўі Адамаўны, 1920 г. н.,***
***студэнткай Сакаловай В. (2005 г.)***

## Гуканне вясны

*Пытанні*

Калі ў вас гукалі вясну?

Ці запальвалі вогнішча? Ці выходзілі пры гэтым на высокае месца?

Ці выбіралі дзяўчынуна ролю вясны?

Ці вадзілі яе вакол вогнішча?

Якое абрадавае печыва рыхтавалі (напрыклад, “жаўрукоў”)? Якія дзеянні з імі выконваліся?

Ці гушкаліся на арэлях?

Ці рабілі саломеннае пудзіла? Што з ім рабілі?

Якія песні-вяснянкі спявалі?

Якія вам вядомы веснавыя карагоды, танцы?

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Узор запісу*

Празнік называўся Стрэценья. Людзі кажуць, шчо ў гэты дзень зіма з летам стрэчаецца. У гэты дзень свяцілі свечкі ў цэркві, іх называлі стрэценьскімі свечкамі. Як гэтыя свечкі прыносілі ў хату, то робілі крысціні на вушаках, подпальвалі дзецям косы, каб грому не бояліса. Потом гэтыя свечкі хранілі ўвэсь год. Запальвалі её, калі грымело. Кусок гэтой свечкі давалі ў руку покойніку, і трэба каб гэтая свечка горэла, колі покойнік у хаці.

Недзелю пэрэд Вялікім постом называлі запускі. На гэтой недзелі гукалі вэсну. Пэклі пірожкі, коровая, варылі яйца і другія стравы. Збіраліса дзеўкі, плелі вэнкі. Одну дзеўку бралі за молоду, надзевалі на её вэнок і шлі чэрэз усё село і сповалі песні. Спявалі такія песні:

Проскоч, зайчыку, праз дзірочку,
Выбірай, зайчык, собе дзеўчыночку
Которую хоч, которую хоч.

Як возьму я тэнцу,
Накладу огэнцу,
Ды навару камні.
Шо ў тую кашку?

Тры ложэчкі масла.
–А кому отдам я есці?
Дзевочкам, дзевочкам.

–Ой, заеньку, да чэрэшеньку,
Дзе ж ты бываў, дзе ж ты бываў?
Дзе ж твое дзетонькі
Бог подзеваў?

–Гром побіў, дождж помочыў,
Шоўковым неводом звоночыў.

* * *

Вэсна, красна, хороша, хороша,
Закідай сані, да бэри колёса, колёса.

Бо ўсе жонкі ткуць кросна, кросна.
Бо я молодзенька ўсю Піліпоўку проспала.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Як возьму вэдзерочко по воду, по воду,
Мое вэдзерочко по лёду, по лёду.

Мое вэдзерочко камэнем, камэнем,
А я молодзенечка яворэм, яворэм.

**Гуканне вясны**

Выходзяць бабы на вуліцу, вот увечары выйшлі, давай песні-веснянкі етыя пець, ну, разныя песні. Як вясну ўстрэцілі, назаўтра ідом на работу, абратна паўтараем – ета ў нас так.

Пры вуліцы, пры шырокай,
Люлі-люлі-люлі,
Пры шырокай.
Там малойчык гуслі грае,
– Люлі-люлі-люлі,
Гуслі грае.
Там дзевачка танцавала,
– Люлі-люлі-люлі,
Танцавала.
Танцаваўшы, прыпявала,
Люлі-люлі-люлі,
Прыпявала.
Прыпяваўшы, задрамала,
Люлі-люлі-люлі,
Задрамала.
У малойцы на каленях,
Люлі-люлі-люлі,
На каленях.

***Запісана ў в. Шарсцін***
***ад Ганчаровай Аляксандры Аляксандраўны, 1929 г.н.,***
***Трусавай Валянціны Агееўны, 1923 г.н.***
***студэнткай Супрун Н.***

Гэта было перад Благавешчаннем. Ужо заканчувалася зіма, і нужна было зваці вясну. Утрам сабіралася нескалька чалавек, выбіралі самае высокае месца (хоць у нас аніякіх-та гор не было) і ішлі зваці вясну.

Адну дзяўчыну прыбіралі лучшэ ўсех. Яна была як бы каралева- вясна. Надзевалі ва ўсё белае, як нявесту. Гулялі, вадзілі карагоды, песні пелі. Усё дзелалі, штоб вясна прышла. Мы, дзеўкі, любілі пець песню адну:

– Ты, чырвона каліна,
Ах, і што цябе зламіла?

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

– Зламілі мяне буйныя вятры
Са лютымі маразамі.
Зламілі мяне сільныя вятры
Са лютымі маразамі.
– Ой, ты, беленькі малойчык,
Ах, і што цябе ссушыла?
Ссушыла мяне дзяўчына тая,
Што і з чорнымі брывамі.
– Ссушыла мяне дзяўчына тая,
Што і з чорнымі брывамі.
Стаю я пад вярбою,
Хаджу я за табою.
Выйдзі, дзяўчына, выйдзі, рыбчына,
Ах, і рада б выхадзіці
І з табою гаварыці.
Ляжыць нялюбы на правай ручцы,
Я ж баюся разбудзіці.

***Запісана ў в. Старое Сяло***
***ад Васільцовай Матроны Сяргееўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Задзірака А.***

Вясну звалі, када снег сашоў. Тады дзеўку бралі, выбіралі, прыбіралі яе. І яна ўжэ была вясной. І тада што, хадзілі на гару якую і там ужэ звалі вясну. Даўней і жаўранкаў пеклі з цеста. Ну, і песні пелі. Гаварылі так:

Ой, вясна! Ой, красна!
Што нам прынясла?
Ці гуркоў? Ці яйка?
Ці, можа, сала?
Ой, прыдзі, вясна!
Ой, прыдзі, красна!

А патом гулялі. Танцавалі.

***Запісана ў в. Старое Сяло***
***ад Мацюковай Ніны Данілаўны, 1930 г.н.***
***студэнткай Пісарэнка С.***

Гукалі вясну на Стрэчанне, 15 февраля.
Выхадзілі на высокае места, над рэчкай. Пелі песні.

Зіма з летам стракалася.
Зіма ў лета пыталася.
Ці было лета, ці не бывала.
Маці дзеўку на вуліцу не пускала.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

А на 22 марта на Соракі калыхаліся на арэлях. Пеклі сbooракі (кругленькіе пышкі). Это быў пост. У пост не пелі і не скакалі.

7 апрэля вадзілі карагоды і пелі:

Жонка мужа не любіла,
Узяла атравачкі купіла,
Свайго мужа атравіла,
У садочку схараніла,
Яліну пасадзіла.
Яліна, расці высока,
Ляжы, міленькі, глыбока.

***Запісана ў в. Стаўбун***
***ад Чуяшовай Галіны Фёдараўны, 1930 г.н.***
***студэнткай Труханoвіч Л.***

* * *

Выйду я, выйду на вулачку,
Выйду я, выйду на вулачку,
Да і ўрэжу ў ладоначкі,
Да і ў залатыя пярчатачкі.
Дзевачкі, падружачкі,
Раскажу вам, пажалюся.
Маё плача дзіцяці маленькае,
Некаму даці пакалыхаці.
Свёкар сядзіць на краваці,
Не пакалыша майго дзіцяці,
Ды свякрушачка не прадыша,
Майго дзіцяці Бог пакалыша.

***Запісана ў в. Стаўбун***
***ад Зуевай Марыі Лаўрэнцьеўны, 1927 г.н.***
***студэнткай Мельнікавай В.***

Мы гукалі вясну, калі толькі пачынаў раставаць снег, калі толькі паяўляліся праталіны. Мы станавіліся на гэту праталіну і гукалі вясну, пелі. Песні пеліся з вечара. Потым ішлі гуляць па дзярэўні. На гэта свята не прыбіраліся, былі адзеты як заўсёды.

Дык вось, калі мы станавіліся на праталіну, пачыналі пець:

Ой, вясна-маці, выйдзі гуляці,
Ужо парабачка не відаці.
Пайшлі на коняй начаваць,
Хлопцы на конніцу,
Дзеўкі-паненкі на ўліцу.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Пасля гэтага ішлі гуляць па дзярэўні. Пасярод яе палілі касцёр, кругом яго танцавалі і пелі песні. Мужчыны агледзяць, што касцёр гарыць, ганялі нас, а мы ўцякалі. У нас не пяклі нічога. Усё было, як заўсёды.

***Запісана ў в. Радуга***
***ад Данілковай Арыны Фёдараўны, 1909 г.н.,***
***студэнткай Данілковай А.***

Гуканне вясны было да Паскі, у марці, як толькі пачынае раставаць.

Маладзёж выходзіла на ўзгорак, гулялі, танцавалі. Вогнішча паліць за дзярэўню хадзілі:

Я кароў пасу, я па верасу,
А дамоў ганю, слёзна плачучы,
Сваю мамачку праклінаючы.
–Ты на што мяне замуж выдала
За п'яніцу, за нядбаліцу?
Ён у шынок ідзець, напіваецца,
А з шынка прыйдзець –
Са мной, маладой, усё ругаецца.

***Запісана ў в. Данілавічы***
***ад Дзмітрачковай Тамары Кузьмінічны, 1936 г.н.,***
***Чуяшковай Любові Кузьмінічны, 1933 г.н.,***
***студэнткамі Кушнаровай К., Булдзінай М.***

Вясну пачынаюць гукаць на Благавешчанне. Жанчыны і дзяўчыны апраналіся ў прыгожае адзенне, ішлі на рэчку, на ваду. Бралі з сабой хлеб-соль (адразалі кусочак хлеба, соль уторкнуць туды) і кідалі ў ваду. Пелі песні.

Вясна з летам сустракалася,
Вясна ў лета пыталася.
Дабрыдзень табе, цёмная ночка.

* * *

Пасею ружу за гарою,
За гарою, штоб прайшоў дожджык стараною.
Стараною над маею ружай зялёнай,
Зялёнаю, расці, розачка, зялёна –у-у-у,
Розачка мая зялёная.Чырвоным цветам зацвіта –у-у-у,
Зацвітала й усе садзікі ўкраша– у-у-у,
Украшала, ходзе хлопчык па садо –у-у-у,
Па садочку, сарваў цвяточык за шапачку,
Сваёй дзевачцы за коса–у-у-у,
За косачку, за шаўковаю ўплётачку.
Насі, дзевачка, і ўкрашайсь,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Сваім падружкам выхваляйсь – ух.

* * *

На рэчцы была, бель бяліла,
Свайму лічаньку гаварыла:
– Лічанька маё бяленькае,
Каму ты будзеш слухмяненькае:
Ці старому, ці малому,
Ці казачаньку маладому?

Вадзілі карагоды, пры гэтым спявалі песні. У сярэдзіне карагода стаіць ці хлопец, ці дзеўка, ці абодва і робяць усё, што ім загадваюць.

**Карагод**

Паўз рэчаньку красна дзевіца ідзёць,
Наўстрэчу к ёй добры моладзец ідзёць.
Вот ён ідзёць, вот ён ідзёць,
Нізка кланяецца, а яна ад яго адварачваецца.
Ой, гордая, ой, гордая, непакорлівая,
Прыйдзет врэмя, перапросіш ты меня,
Папросіш, пацалуеш меня.
Прасці, мой друг, прасці меня,
Мы памірымся з табой,
Памірымся, пацалуемся з табой.

А хлопец у карагодзе адварочваецца ад дзяўчыны, а яна за ім ходзіць і ўпрошвае. А тады ён астановіцца і цалуе яе ў карагодзе.

**Карагодная песня**

Жана мужа, жана мужа не ўзлюбіла,
Взяла, атравушкі купіла.
Взяла атравы, взяла атравушкі купіла,
Взяла, мужа да й атравіла.
Жана мужа, жана мужа й атравіла.
У садочку схараніла 2 р.
І алеечкай абсадзіла.
Ты расці, мая алея, 2 р.
Пака міленькі сатлее.
Мяту ў хату, 2 р.
Мяту ў сені,
Прылятаюць два сакалочкі, 2 р.
А то міламу браточкі.
Братавая, братавая, маладая,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

А сабакі ў сабакарне,
А сядзелка, а сядзелка на куточку сядзіць,
Конь вароны ў стайне стаіць.
Братавая, братавая, маладая,
А што ў садзе за магілка?
А я, млада, парадзіла 2 р.
І ў садочку схараніла.

* * *

У карагодзе мы былі, 2 р.
Што мы там відзелі?
Відзелі парачку:
Гусара і гусарачку.
З круга вылятали,
Пары выбіралі.

* * *

Моладзец, моладзец, харошы, прыгожы,
Памый-ка баціначкі з камаровай кожы.
Дзяўчонка-рыбчонка, душа, маё сэрца,
Напрадзі-ка дратвачкі з дажджавыя капелькі.
Моладзец, моладзец, харошы, прыгожы,
Памый-ка мне плацейка з турэцкія ружы.
Дзяўчонка-рыбчонка, душа, маё сэрца,
Напой майго конейка і з сіняга мора,
Штоб конік напіўся і капыт не змачыўся.

***Запісана ў в. Акшынка***
***ад Гусаковай Л.І., 1907 г.н.,***
***студэнткай Лютай А.,***
***выкладчыцай Новак В.С.***

У пост вясну гукалі. Выхадзілі на вуліцу і пелі песні:

Ой, вясна, вясняначка,
Дзе твая дочка Мар'яначка?
Пагнала бычу на травіцу,
Старому дзеду на рукавіцу,
А маладому на панчошкі.

На Сoракі пеклі жаваранкаў.

***Запісана ў г. Ветка***
***ад Дзюньдзікавай Праскоўі Еўдакімаўны, 1920 г.н.,***
***студэнткай Крупскай Н.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Калі пачынаў раставаць снег, выходзілі на вуліцу і пелі песні:

Вясна, вясна, вясняначка,
Дзе твая дачка Таццяначка?
Пагнала быську нараначкі:
"Пасіся, быська, пад ліпкай,
А я пайду патанцую пад скрыпкаю".

Выходзілі на гару каля ракі Бесядзь:

Ой, на рэчушкі, на Волге,
Эй, на Волге.
Ой, па шырокаму раздоллю
Занімалася пагодушка.
Ой, пагодушка небальшая,
Волгавая.

***Запісана ў в. Брылёва Гомельскага р-на***
***ад Гарбузавай Марыі Яўсееўны, 1929 г.н.,***
***перасяленкі з в. Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на,***
***студэнткай Кашлаковай А.***

Гукалі вясну. А во й на вуліцы пелі, а і ў хаце пелі, а ўсюду, а дзе хочаш, там і пей вясну.

А як едуць вясной поле ўжо скародзіць, бярэ хазяін саху, плуг, бярэ барану, бярэ каробку, бярэ зярно, сеюць і песню гэту пяюць.

Быў Вялікі Пост на 7 недзель.

***Запісана ў в. Стаўбун***
***ад Зуевай Марыі Лаўрэнцьеўны, 1927 г.н.***
***студэнткай Ведзь А.***

Выходзілі на высокое место і пелі:

Як я выйду на гару, 2 р.
Зірну на ваду, 2 р.
А мой нялюбы топіцца. 2 р.

***Запісана ў в. Буда-Люшаўская***
***ад Ерашовай Любові Яўхімаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткамі Фяськовай К., Варажун С., Валошынай А.***

Сабіраліся кампаніямі і вадзілі хараводы. Пелі:

Пусці, маменька, на ручэй гуляць,
На ручэй гуляць, селязнёў ганяць.
То не селезні ўсе касатыя,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тры малойчыка нежанатыя.
Яны ішлі-ішлі – станавіліся,
За адну дзевіцу пасварыліся.
Вы не біцеся, не сварыцеся,
Па-харошаму разайдзіцеся.
Астануся я аднаму каму,
Ваньку браваму нежанатаму.

***Запісана ў в. Буда-Люшаўская***
***ад Свірыдзенка Тацяны Дзянісаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткамі Фяськовай К., Варажун С. Валошынай А.***

Гукаць вясну ў нас пачыналі з Саракоў (9 сакавіка). З гэтага дня вадзілі хараводы, спявалі вяснянкі. На Благавешчанне (25 сакавіка) пяклі з цеста маленькіх птушачак, рабілі птушкі-свісцёлкі і давалі дзецям. Пасля абеду дзяўчаты кучкамі ішлі на горку і вадзілі там хараводы, пелі вяснянкі, гукалі вясну, каб хутчэй прыйшла:

Прыйдзі, вясна,
Прыйдзі, красна,
К нам у таночак.
Прынясі нам збожжа,
Прынясі нам красак,
Каб нам звіць вяночак.

У нас дзяўчаты расходзіліся на дзве грамадкі і перагукаліся между сабой. Выбіралі адну дзеўку і адзявалі ў вясну. Другія дзеўкі пыталі ў яе некалькі разоў:

Гэй, вясна-красна!
Што ты нам прынясла?

Вясна кажа:

Я вам прынясла тры карысці ў радасці:
Шаўковую траву на вясну,
Буйное жыта на лета,
Ядрыцу-грэчку на восень.

Трэба было зіму замкнуць, лета адамкнуць, каб зіма хутчэй ад нас ушла, а вясна з цяплом прыйшла. Станавіліся ў харавод і пелі:

Ты, пчолка ярая,
Ты вылець з-за мора,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Ты вынясі ключыкі,
Ключыкі залатыя,
Адамкні лецечка, лета цёплае,
Замкні зімачку, зіму студзёную!

Свісцелі ў свісцёлкі і казалі:

Прыйдзі, вясна, прыйдзі, красна,
Адамкні лецечка, замкні зімачку.

Калі было цёпла, то пры гуканні находзілі маленькія бярозкі і завівалі іх лентачкамі. Кругом іх вадзілі хараводы. Вечарам дзяўчаты ішлі па вуліцам з хараводамі, спявалі песні. Бывала і так, што вечарам моладзь збіралася на горцы, палілі касцёр, вадзілі кругом яго хараводы, скакалі цераз касцёр.

***Запісана ў в. Глазаўка***
***ад Дзенісенка Ніны Мітрафанаўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Барадзіной В. (2000 г.)***

Гукалі вясну на Благавешчанне. Участвавалі дзеўкі і хлопцы. Ішлі на паляну к возеру. Бралі з сабой жаваранкаў, якіх пяклі. Па дароге пелі:

Вясна, вясна красная,
Прыйдзі, вясна, з радасцю,
З бальшой міласцю.

На полі жаваранкаў кідалі ўверх і казалі: "Жавараначкі, прыляціце к нам. Прынясіце нам лета цёплага, хлеба вольнага. Прынясіце вясну на сваім хвасту". Дзеўкі станавіліся ў круг і выбіралі багіню вясны "Жыву". Заранее дзелалі цвяты, бралі ленты і прыхарошвалі яе. У Жывы спрошывалі: "Вясна, вясна, зачым прыйшла, ці ты прыехала на чым?" А яна гаварыла: "На сошке, на баране да вас прыехала, каб с вамо пеці, гуляць, хараводы вадзіць". У круг дзеўку прывазілі на баране. І тады палілі агонь, каб абагрэлася зямля. Начыналі пець песні і гулялі ў гульні. Ё такая гульня-песня "Як дзеўка грушу пасадзіла". Усе дзеўкі станавіліся ў круг, а адна была ў серадзіне (груша). Усе пелі, а тая як бы расла:

А мы грушу пасадзілі, пасадзілі,
А я, маладзенька, топ, топ, топ.
І ўжэ груша прымаецца, прымаецца,
А я, маладзенька, топ, топ, топ.
І ўжэ груша расце, расце,
А я, маладзенька, топ, топ, топ.
І ўжэ груша цвіце, цвіце.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

А я, маладзенька, топ, топ, топ.
І ўжэ грушу пара есці, есці,
А я, маладзенька, топ, топ, топ.

Груша расла, а дзеўкі топалі нагамі. Яшчэ выбіралі самую красівую дзеўку. Яе звалі Ляля, акружалі яе і прычэплівалі да яе адзежы ветку з лісточкамі. Украшалі Лялю цвятамі і ставілі вакруг розную яду. Патом ёй гаварылі:

Дай нам жыта, дай пшаніцу.
У гародзе сенажаці роўны, грады жыта поўны.
Каб наша жыта ў трубы павілося,
У трубы павілося, набок схілілася.
На полі – снапамі,
А ў гумне – цапамі,
У агародзе прысыпна,
А ў млыне прымолна,
А ў дзяжы падходна,
А на стале красіста.
Вясна, вясна, дзе ты была?
Ды што ты нам прынясла?

Ляля ім атвячала: “Прынесла хлопцам па паясочку, малым дзецям па яечку, малодачкам па чэпчыку, а дзевачкам па цвяточку. Хлопчыкі ў войска пайшлі, а малыя дзеткі быстра раслі, малоданькі ўбраны былі, красны дзеўкі замуж пайшлі”. Патом дзеўкі пелі для Лялі песню:

Вясна-красна к нам у госці прышла,
У гумне сена ўсё павынесла,
У клеці жыта ўсё й павыперла,
Красных дзевак замуж выдала,
Малойчыкаў усіх пажаніла.

Спеўшы песню, бралі яду, што стаяла, і ішлі на ўзгорак пець песні. Пелі такую песню “Мядуніца, мядуніца лугавая”:

Мядуніца лугавая, ой, лугавая,
Чаму не пахнеш, чаму не пахнеш па ўсім лугу,
Ой, па лужочку?
Як мне пахнуць, як мне пахнуць па ўсім лужку,
Ой, па лужку.
Стары бабы, стары бабы прасядзелі,
Ой, прасядзелі.
Маладухі, маладухі прастаялі,
Ой, прастаялі.
Красны дзеўкі, красны дзеўкі праплясалі,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Ой, праплясалі.

Вадзілі также харавод “Ой, у агародзе ды на пераходзе”:

Ой, у агародзе ды на пераходзе,
Вясна-красна на ўвесь свет.
… паненка ячмень жала,
Ячмень жала, грэчку вязала.

Ды прыйшоў да яе кавалер яе,
Ды загадаў ёй сем загадак.
Кагда не адгадаеш, то мая будзеш,
Кагда не адгадаеш, то мая будзеш:

– Ды што чорна ды не чарнячы,
Ды што бела ды не бялячы,
Ды што раба ды не рабячы,
Ды што расце ды без кораня,

Ды што бяжыць ды без ножачак,
Ды што плача ды без слёзачак.
– Воран чорны ды не чарнячы,
Лебедзь белы ды не бялячы,

Дзяцел рабы ды не рабячы,
Камень расце ды без кораня,
Зара гарыць ды без полымя,
Вада бяжыць ды без ножачак,
Скрыпка плача ды без слёзачак.

Яшчэ пяюць песню “Вол бушуе, вясну чуе”:

Вол бушуе, вясну чуе,
Воран крача, сыру хоча,
Дзеўка плача, замуж хоча.
Не крач, воран, накрачашся,
Не плач, дзеўка, нажывешся,
Не марайся, вол улёгся.
Воран крача, сыра з’еўшы,
Дзеўка плача, сына меўшы.

Пелі яшчэ “Благаславі, Божа”:

Благаславі, Божа, благаславі, маці,
Вясну заклікаці, зіму праважаці:
Зімачку – у вазочку, лецечка – у чаўночку.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Благаславі, маці, вясну заклікаці,
Адамкнуць зямліцу, выпусціць травіцу
На ранняе лета й на буйнае жыта.
Прыдзі, вясна-красна!
Прыдзі, вясна-красна!

Хлопцы тады прыносілі саломеннае чучала і палілі яго возле возера. Чучала патом кідалі ў ваду, каб вада забрала бяду, балезнь. Самі набіралі ў вядро ваду і мылі рукі – знак ачышчэння. У знак ачышчэння прыгалі яшчэ цераз агонь. Расцілалі скацерць, клалі на яе ежу і гаварылі: “Вот табе, матухна, вясна!” Яду астаўлялі на полі. Ішлі і бралі з агню па вугальку і неслі яго дамой на шчасце.

***Запісана ў в. Губічы***
***ад Цюлюновай Тамары Канстанцінаўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Герцавай Т. (2002 г.)***

Вясну гукалі, як сыходзіць снег і надыходзіць вясна. На вуліцы збіраліся маладыя дзеўкі і пелі песню:

Вясна-вясняначка,
Дзе твая дачка Улляначка?
Пагнала бычка на паляначку...

Запісана ў в. Калініна Гомельскага р-на
***ад Хамяковай Анастасіі Васільеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Шупляковай Г. (2002 г.)***

Выходзілі на рэчку, станавіліся на мосцік і пелі:

Вясна, вясна,
За лес пайшла.
За крутыя горы.
Чаго дзеўкі не йдуць замуж,
Што чорныя бровы?
Мае бровы калясамі,
Ой, гора мне з вамі.

Запісана ў в. Краўцоўка Гомельскага р-на
***ад Дубадзелавай Надзеі Мікалаеўны, 1942 г.н.***
***(пераехала з в. Дзікалаўка Гомельскага р-на),***
***студэнткамі Мендзелевай Т., Ачарэт А. (2006 г.)***

Эта ў марце. Кастры не палілі, нельзя было. Качаліся на качэлях, тагда бралі такія бальшыя доскі, вяроўкі длінныя і дзелалі харошую качэлю для всех. Садзіліся і дзеўкі, і хлопцы – все, хто хацеў, а другія баяліся. Ка-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

чаліся сільна, высока, смяяліся ўсе, віжжалі. Эта ігра такая, весяліліся. А было, што качаліся, а дзевачка адна не ўдзяржалася, упала і ўбілася. Дак пасля ўжэ паўмнелі.

Ігралі яшчэ ў мячыка. Дзве групы станавіліся, адзін браў лапатачку, а з другой групы яму мячыка брасаюць, і той адбівае, а тыя ўжэ ловяць. Ігралі і яшчэ многа.

Гадалі, перабрасывалі цераз забор цветы. Спіной стаялі з двух старон забора: адны брасаюць, а другія ловяць. Хто словіць, дак ужэ радаваўся: будзе шчаслівым і скора пажэніцца.

Пяклі да пяклі: і кругленькія, хто як хацеў, выдумваў. Эта ўжэ як абычай было, значыцца па-коляшняму, уродзе яно нада так. Дзевачку выбіралі, сабіралі яе і замуж аддавалі. Хараводы вадзілі і песні пелі.

***Запісана ў в. Пакалюбічы Гомельскага р-на***
***ад Сцепаньковай Наталлі Мікалаеўны, 1913 г.н.,***
***Сярковай Ірыны Афанасьеўны, 1913 г.н.,***
***студэнткай Сцепаньковай Т. (2001 г.)***

Была прыкмета: убачыш грача – вясну сустракай.

У гэты дзень распальвалі вогнішча, гушкаліся на арэлях, вадзілі карагоды. Спявалі песні пра пасевы, працу:

Слава Богу, вясна прыйшла,
Дурная дзеўка замуж пайшла,
А разумная дома засталася,
Многа красёнцаў наткала
І з дзеўкамі нагулялася.

***Запісана ў в. Пакалюбічы Гомельскага р-на***
***ад Грыбанавай Н.І., 1935 г.н.,***
***студэнткай Падцерабковай Ю. (2001 г.)***

Гэтае свята мы спраўлялі на Стрэчанне, калі зіма з летам сустракаліся.

Зіма з летам страчаліся,
Дачка ў маці пыталася:
– Пусці, маці, гукаці.

Жыццё было труднае, таму нічога не пеклі. Толькі хадзілі па вуліцы, карагоды вадзілі дзеўкі і хлопцы гадоў ў 14-15, пелі песні, вясну гукалі:

– Вясна, вясна, вясняначка,
Дзе твая дочка Мар’яначка?
– У садочку шые сарочку
Свайму супругу Васілёчку.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

– Вясна, вясна, куды пайшла?
– За крутыя горы.
– Чаму дзеўка ня йдзе замуж?
– Што чорныя бровы.
Ох, вы, бровы, мае бровы,
Горка мне з вамі –
Не выйсці на вуліцу
За ўсімі врагамі,
Як врагі лягуць спаць –
Выйду пагуляці.

Людзі верылі, што калі ў чалавека чорныя бровы, дык ён злы. Песні пелі ўсякія, якія ўзгадаем. Шмат пелі любоўных песен, сэрдцэшчыпацельных.

Калі і на качэлях гушкаліся. Бывала, Марцін павеша вяроўкі і прыходзяць да нас з розных вёсак дзеўкі да хлопцы катацца. І тады яны ўжо вісяць усё лета.

***Запісана ў в. Пясочная Буда Гомельскага р-на***
***ад Пыталёвай Антаніны Іосіфаўны, 1921 г.н.,***
***студэнткамі Максіменка Н., Пушкарскай Т. (2001 г.)***

## Вялікдзень

*Пытанні*

Што вы ведаеце пра Велікодны тыдзень (Чысты чацвер, Красная субота і нш.) ?
Якія дзеянні выконваліся на Вялікдзень? Якія забароны існавалі?
Якія ёсць велікодныя прыкметы і павер’і?
Ці фарбавалі яйкі? У які колер? Якім чынам?
Ці гулялі з яйкамі ў біткі?
Ці качалі яйкі ў латках? Як? З якой мэтай?
Дзе яшчэ выкарыстоўвалі велікоднае яйка?
Ці хадзілі ў царкву? Што асвячалі? Што рабілі з асвечанымі яйкамі?
Што сабой уяўляў працэс выпякання пасхі і гатавання абрадавай ежы?
Што рабілі з рэшткамі пасхальнай ежы?
Ці хадзілі на могілкі?
Ці хадзілі на Вялікдзень валачобнікі?
Хто ўваходзіў у склад гурта?

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Якія валачобныя песні выконваліся ў час абыходу хат? З якім прыпевам?

Якая размова адбывалася паміж валачобнікамі і гаспадарамі?

*Узор запісу*

А нічога такога не існавала, акрамя таго, што на Пасху нічога не трэба рабіць. Гэта грэх. У ноч, калі моляцца ў царкве, таксама нічога не трэба рабіць паганага, нельга спяваць песні. Гэта таксама грэх.

Яйкі фарбавалі ў красны колер. Лупілі цыбулю і ў гэтай шалухе варылі. Яны тады красненькія, прыгожыя. У біткі таксама гулялі. Хадзілі на вуліцу і гулялі. Тады малым інтарэс быў, чые яйка крапчэй.

Быў абрад "Праводзіны русалкі". А ніхто яе не выконваў, гэта толькі гаворка такая была. А праводзілі яе 7 ліпеня ў жыце. Праводзілі яе таму, што была русальная нядзеля. Яшчэ на гэтай нядзеле не трэба было спаць, бо, казалі старыя, што ўвесь год праспіш.

***Запісана ў в. Аздзеліна Гомельскага р-на***
***ад Санько Вольгі Маркаўны, 1941 г.н.,***
***перасяленкі з в. Нудзічы Брагінскага р-на,***
***студэнткай Буйневіч В. (2005 г.)***

Пасха – эта всенародны празнік. Перад Пасхай убіралі хату, перамывалі пасцель, шылі нарадныя плацці; білі кабаноў, дзелалі смачны абед.

Перад Пасхай красілі яйца, пяклі пасхі, гэты дзень называўся краснай суботай. Яйцы красілі ў лукавай шкарлупе ў красны цвет. Паску пяклі на жырах, насыпалі сахар, штоб была сладкая, убіралі цвяточкамі, кружочкамі. На пасцы абавязкова должан быў быць крэсцік.

Сабіралі карзінку ў 6 часоў вечара, туды лажылі сала, калбасу, пасху, яечкі, тваражок, соль і ехалі ў цэркву. Ету ноч не тушылі свет у доме да самага ўтра. Пасля таго, як у цэркве адправілі адправу, бацюшка пасвяціў пасху. Затым усе ехалі па дамах.

Прыехаўшы дамоў, бацька, які абычна свяціў пасху, паздраўляў сваю сям'ю славамі: "Хрыстос васкрэс" (3 р.). Яму атвячалі: "Ва ісціну васкрэс" і цалаваліся. Становяць гэту карзінку на кут. Каждая сям'я, памаліўшыся Богу, вымала з карзінкі прадукты, лажыла на стол усё пасвяцонае, ставіла графін і заўтракала.

Пазаўтракаўшы, маладзёж ідзе гуляць. Мужыкі гуляюць наўбіткі: чыё яйцо паб'ецца, той аддае яго таму, у каго яно цэлае. Так святкуюць первы дзень Пасхі. Назаўтрашні дзень ідуць хрыставаць. Уходзяць у хату і гаворать: "Хрыстос васкрэс". Ім атвечают: "Во ісціну васкрэс" і дораць хто сала, хто яйцы.

Усю святочную нядзелю нічога ні робяць. Эта называлася Святая нядзеля. Радныя прыходзілі друг к другу ў госці. Пасля празнікаў наступала рабочая нядзеля.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

*Запісана ў в. Аздзеліна Гомельскага р-на
ад Грышчанковай Домны Мітрафанаўны, 1921 г.н.,
студэнткай Ткачовай Т. (2003 г.)*

Сначала нада было поставаць нядзелю ілі две, а патом ісці ў цэркву маліцца. Прыходзілі з цэрквы, ужо бабушка давала нам паесць: яечка краснае, паску давала. Хлеб не давала есці, толькі паску давала. І елі мы нядзелю паску, а хлеб ляжаў на стале.

Хто ў жоўты колер крсіў яйкі, як у каго палучыцца. На паске рабілі крыжы, дабаўлялі масла, яечкі. Усёй вёскай гулялі ў біткі. Хто ў каго больш навыбівае. Хадзілі на могілкі. Велікодныя яйкі клалі ў баразну, каб урадзіла.

На Вялікдзень сонца, кажуць, гуляе, мярцае.

*Запісана ў в. Бабовічы Гомельскага р-на
ад Царыкава Васіля Паўлавіча, 1935 г.н.,
студэнткамі Максіменка Н., Пушкарскай Т. (2002 г.)*

Перад Пасхай пасцяць 7 нядзель. Да Пасхі дзелаюць уборку дамоў. Пякуць паску, красяць яйкі і ідуць у цэркаў свяціць.

Пасля Паскі на шастой нядзелі ў чацвер усе выходзяць на вуліцу і, узяўшыся за рукі, ідуць па дзярэўне за ваколіцу з песнямі. Там водзяць карагоды і закапваюць стрэлу. Гэта вельмі інтарэсна і весела. Дзецішкі стаяць у кругу, а вакруг іх водзяць карагоды.

Наступаюць цёплыя дні. Хазяевы гатовяцца да першага выгану ската. Чысцяць іх, а на шэю авечак вешаюць свае знакі, каб хазяін разлічаў сваіх.

Бралі лазовыя веткі і сцягалі імі скот, каб не было ніякіх балезняў і няўдач, а потым гэтымі веткамі сцягалі і хазяеў, каб былі здаровыя.

*Запісана ў в. Высокае Гомельскага р-на
ад Калюзы Соф'і Цімафееўны, 1928 г.н.,
студэнткамі Бунько Н., Якіменка С. (1994 г.)*

Перад Вялікаднём быў пост, апошняя нядзеля асобенна. У красную суботу перад Пасхай усе гатаваліся.

Абязацельна ў красны колер фарбавалі яйкі. Гэта ж як Ісуса Хрыста распялі, значыць тыя іуды прыказвалі дзецям (цыганятам) закідваць яго каменнем, а яны, штоб яму больна не было, закідвалі яйкамі. Вось з тых пор і абычай – красіць яйкі. Ну, як пакрасяць яйкі, дык ідуць у царкву. Усёй сям'ёй ідуць, каб пасвяціць пасхі ды і яйкі. Тады ўжо рэзалі, білі.

Пяклі звычайна пасху ў рускіх печах. Мясілі цеста, дабаўлялі здобы ўсялякія і ў печы ў форму садзілі. Я ўжо як напяку, дык штук 12-13, усю нядзелю елі. Да абеда ўсе спяць, потым на вуліцы гармонікі пелі. А да абе-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

да не разрашалі – празнік вялікі, а потым можна ўжэ. Дзеці асобенна гулялі ў біткі.

На другі дзень Пасхі хадзілі людзі, хрыставанікамі называлі іх. Давалі ім не жалеючы. На Пасху не было ў нас валачобных песен. К чужым не хадзілі, толькі к сваім.

Хто пчол дзяржаў, стараліся хутчэй з цэрквы да хаты бегчы. Для пчол добра. Шалушкамі ад яек па гароду пасыпалі, каб вароны не кралі нічога. Пасвяцоныя яйкі ў вадзе настойвалі, потым націралі рукі, ногі. Лячылі, каб суставы не балелі. Яшчэ дзяўчаты ліцо націралі, умываліся значыць, штоб прыгажэй жылі, маладзейшымі былі. Не разрашалася, каб яйкі па двару валяліся, бо таптацца па іх грэх вялікі.

***Запісана ў в. Зялёны Гай Гомельскага р-на ад Максіменка Зінаіды Цімафееўны, 1940 г.н., студэнткамі Жогла К., Грыгор'евай В., Сямко Г., Цугаевай Я. (2004 г.)***

Пасля Масленіцы пост сем нядзель да Пасхі. Нельзя было есць скаромнае, толькі грыбы, рыбу, поснае масла. Тады настае Паска. Убіралі ў хатах перад етым, самі адзяваліся чыста. Ужо можна было есць усё і скаромнае. Пяклі паскі, кулічы. Перад Паскай білі кабаноў, каўбасы дзелалі. У паследнюю нядзелю перад Паскай дзелалі ета. Былі тады макатры, як гліняныя каструлі, гаршкі. Туды каўбасы і складалі, і залівалі свіным жырам. А на Паску падагравалі і елі. Яйкі красілі ў красны цвет, патаму што ў Ісуса была кроў жа красная, вот і яйкі такія даўжны быць. Шалухой із цыбулі красілі.

На первы дзень Паскі хрыстосаваліся ўсе і гаварылі: "Хрыстос васкрэс". Патаму шта Бог-ацец уваскрасіў Ісуса, так і гаварыць нада. У 12 часоў ночы ён уваскрэс. І празнавалі так цэлую нядзелю да Радуніцы.

У следуюшчае васкрасеніе Хомава Паска. Называецца так, патаму што, калі васкрэс Хрыстос, Хама не паверыў, пайшоў у пустыню і сказаў: "Еслі я сам не ўбачу Ісуса собственнымі вачамі, еслі не ўкладу рукі на яго раны, то не паверу". І Хрыстос паявіўся перад ім і Хама ўвераваў. І паэтаму ета так называецца. После етай Паскі ўсё.

Патом была Радуніца – памінкі па мёртвых. Тады хадзілі на могілкі, маліліся там, абедалі, паміналі. Качалі яйкі на могілках, астаўлялі памёршым яду, цвяты прыносілі. Такі абычай.

Для Радуніцы пяклі паскі і красілі яйкі. На Паску гуляліся з яйкамі, біліся. А яшчэ калі на Паску спекці хрэст, палажыць яго куды-небудзь, то праз тры гады там завядзецца Божая кароўка. І якога цвету яна будзе, такога нада цвету і скаціну дзяржаць.

На другі дзень Паскі вадзілі карагоды, пелі песні, гулялі. Дзеці, маладыя дзеўкі на качэлях каталіся. А яшчэ на Паску глядзелі, як гуляе сонца.

Чэраз 6 нядзель было Вазнясенне. Ад первага дня Паскі шчыталі. У еты дзень маліліся. 6 нядзель не здароваліся, а нада было гаварыць: "Хрыстос васкрэс". Пасля празніка ўжэ здароваліся.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

А Вазнясенне так называлася, патаму шта Хрыстос узнёсся на неба. Сначала ён уваскрэс, а цераз 6 нядзель ужо на неба.

***Запісана ў в. Калініна Гомельскага р-на***
***ад Хамяковай Анастасіі Васільеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Шупляковай Г. (2002 г.)***

У нас пачыналася з Вербнага васкрасенія. Тады хадзілі ў царкву, свяцілі вярбу, а калі прыходзілі, дык гэтай лазой білі родных і гаварылі: “Вярба б’е, здароўя дае”. Так 3 разы.

На Вербнае абязацельна кут трэба было ўбіраць у чыстае. А ўжо к чыстаму чацвергу ўсё ўжо мылі ў хаце, бялілі, самі мыліся ў бане.

У суботу ўжо ўчынялі паскі, пеклі мы ж па 15 пасак, а пад вечар яйкі красілі. Красілі з цыбулі з шалупак, каб былі красненькія.

А на ноч зноў ішлі ў царкву, свяцілі хлеб, соль, яйкі, мяса, хрэн, паскі.

Раніцай ужо разгаўляліся, з усімі хрыстасаваліся. Дзеці гулялі ў біткі, але толькі да абеда.

У гэты дзень на стале не павінна быць мяса пеўня, з курыцы так можна, а вот з пеўня нельзя.

Яшчэ ў гэты дзень сонца грае, калі яно ўзыходзіць, то можна бачыць, як яно радуецца. Шчэ свяцілі ў царкве мак, а потым абсыпалі вакруг хаты, каб нічога дрэннага не было. А ўжо пад вечар у госці хадзілі, спявалі.

***Запісана ў в. Лапаціна Гомельскага р-на***
***ад Казаковай Марыі Аляксандраўны, 1917 г.н.,***
***студэнткай Зроспікавай В. (2003 г.)***

К Вялікдню прыбіралі ў хатах, у двары. Бялілі паталок, печы, мылі вокны і вешалі чыстыя фіранкі, па магчымасці красілі падлогу, дзверы, стаўні. На ікону вешалі чысты ручнік.

У чысты чацвер, перад Пасхай, абавязкова мыліся да ўсходу сонца, каб смыць грахі.

У пятніцу, перад краснай суботай, начынялі булкі (паскі).

Зрання ў суботу пяклі булкі, якія ўпрыгожвалі хрэсцікамі і мазалі сахарам. Яйкі красілі ў красны цвет, шалухой ад цыбулі.

На ўсяночную ішлі ў цэркаў свяціць паскі і яйкі, мяса, соль, мак. Са свячоным шлі дамоў разгаўляцца.

У гэты дзень прыбраныя людзі выходзілі на вуліцу, сядзелі на лавачках, гулялі ў біткі. Бабы пелі песні, дзяды гулялі ў карты і выпівалі.

У Вялікдзень людзі віталіся так:

– Хрыстос уваскрэс.

– Ваісціну васкрэс!

Хросныя хрэснікам абавязкова насілі валачобнае – розныя прысмакі.

***Запісана ў в. Макаўе Гомельскага р-на***
***ад Маісеенка Праскоўі Рыгораўны, 1920 г.н.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***(перасяленка з в. Глухавічы Брагінскага р-на),***
***студэнткай Бажковай С. (2006 г.)***

Як яйца на Пасху лупіш, этую шкарлупу нада закапываць у баразну. Эта ад таго, штоб быў ураджай харошы.

***Запісана ў в. Макаўе Гомельскага р-на***
***ад Машуровай Любові Паўлаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткамі Ерафеевай І., Назарэнка М. (2006 г.)***

На Паску красілі яйкі ў красны цвет, шалушкамі з цыбулі. Булкі пекліся як абычна: мука, дрожжы, малако, сахар, мак.

У біткі гулялі ўсе: старыкі, моладзь, дзеці.

На могілкі ў нас на Паску не хадзілі. На могілкі хадзілі на Радаўніцу. Валачобнікаў у нас не было, а вось па валачобнае (падарак) хадзілі хрэснікі да сваіх хросных, а цяпер ужэ хросныя самі носяць хрэснікам падаркі.

***Запісана ў в. Макаўе Гомельскага р-на***
***ад Сяргейчык Марыі Мікалаеўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Бажковай С.В. (2006 г.)***

На Пасху сулу вадзілі, вяснянкі гулялі. У першы дзень Пасхі: калісь вышываныя кофты былі такія, мая матка вышывала. І вот яны павыходзяць, становяцца ў круг і водзяць хараводы. Гэта первае гуканне вясны. А на другі дзень сулу вадзілі. Сула – гэта гульня такая. Бяруць гармоні да ідуць па Маркавічах. Да з барабанамі, да з усім, і ўсе Маркавічы збяруцца на пабярэжжы да самае Ластаўкі. “Ад Ластаўкі да Тыркі перашчытаныя кватыркі”, – эта ад хаты Ластаўкі да хаты Тыркі (усе Маркавічы 272 хаты).

***Запісана ў в. Маркавічы Гомельскага р-на***
***ад Уніятава Івана Сцяпанавіча, 1924 г. н.,***
***Мельнікавай Веры Уладзіміраўны, 1926 г.н.,***
***Трыгубавай Ірыны Уладзіміраўны,1924 г.н.,***
***студэнткай Яськовай Т.***

У чацверг прыйдуць, павячэраюць і ўсе да Пасхі больш не ядзяць і дажа не п’юць. Эта тайну дзяржалі – так называецца.

Тады ўжо на Пасху прычышчаліся. Песні пелі, у гарэтню гулялі. Жэншчыны маладыя бяруцца за рукі па дзве і ідуць усім сялом, іх усе болей і болей становіцца. І ідуць да Маркавіч, там астанаўліваюцца і там ужо музыка іграе, і хлопцы ідуць, і дзеўкі ідуць і пяюць усякія песні.

***Запісана ў в. Маркавічы Гомельскага р-на***
***ад Юравай Анастасіі Яфімаўна, 1922 г.н.,***
***студэнткамі Яськовай Т., Парашчанка С. (2006 г.)***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Як мясаед кароткі, Пасха цераз 5 нядзель, як длінны – нядзель цераз сем. Яйца красілі ў  луке, паскі пяклі, украшалі хрэсцікам. Усе хадзілі на ўсеначную. А ўтрам, кагда разгавяцца, абязацельна хадзілі пецъ. Мы, бывала, павыскакваем: “Папа, папа, там ужэ пяюць валачобнікі!” Яны прыдуць пад вакно і гаворацъ: “Хрыстос васкрэс!” (тры разы). “Добры дзень, пане гаспадару, ці можна дам развесяліць, ці можна песню вам запець? Гаспадар атвячае: Пажалуста”. І яны пяюць:

Суботне полымя прашло,
Зара ў нядзелю чуць узыйшло.
Как ангел двер ва гроб атверт,
Хрыстос васкрэс!
Хрыстос васкрэс!
Хрыстос васкрэс!

В ту ноч ка гробу жоны шлі,
І міра цэннае няслі.
Но смотрят у гроб, а гроб атверт,
Хрыстос васкрэс!
Хрыстос васкрэс!
Хрыстос васкрэс!

Це жонкі плакаць пачалі,
Што цела ў гробе не нашлі,
Но смотрят у гроб – там кто-та есць.
Хрыстос васкрэс!
Хрыстос васкрэс!
Хрыстос васкрэс!

То был у блесцяшчых різах лік,
Пасланнік божы быў для ўсіх,
То светлы ангел  быў з нябес.
Хрыстос васкрэс!
Хрыстос васкрэс!
Хрыстос васкрэс!

Цем жонам ангел тот сказал:
“Хрыстос Гасподзь із мёртвых устаў,
Што ішчэце яго вы здесь?”
Хрыстос васкрэс!
Хрыстос васкрэс!
Хрыстос васкрэс!

Захажваюць і гаворацъ: «Былі мы ў горадзе Ерусаліме і відзелі чуднае дзіва, как ангелы грымелі, Госпаду Богу песні пелі. Мы таго грому збаяліся, з вамі госпада пазналіся. Вы нас пазнавайце, рублём награждайце, рублём, не рублём, хоць грыўнікам. Мы ўсё прымаем, і з Святою Пасхаю вас паздраўляем». І тады выходзіць хазяін і выносіць гасцінцы. Так хадзілі гэтыя валачобнікі па ўсёй дзярэўне да дванаццаці ночы. І ў другую дзярэўню маглі пайці. А калі ў каго ёсць дзеўка на выданне, то пелі дзеўцы:

Добры вечар, паненачка,
Хрыста Гасподзь, Сын Божы.
Просім кінуць калечачка,
Хрыста Гасподзь, Сын Божы.

А назаўтра дзелалі складчыну. Прыходзілі па парам. Пасха праходзіла тры дні. Ніхто нічога не дзелаў.

***Запісана ў в. Новая Гута Гомельскага р-на ад Байковай Зінаіды Антонаўны, 1939 г. н.,***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***студэнткай Ачарот А. (2006 г.)***

На Пасху прыбывала вада. Сож і возера вмесце былі. А ў саўхозе былі дубы здаровыя. Дзеўкі і хлопцы з гармошкай садзіліся ў дубы і песні пелі. Каталіся на лодках. На Пасху ў мячыка гулялі, у кона: нарысуюць, як эта ў нас кавёр, чатырохкутнік. На вуглах стаяці і тых, хто ў сярэдзіне, мячыкам выбіваюць. У цябе мячык ударыў – выходзіш з кона. Калі на вугле стаіш, табе турнулі мячык, а я ўжо сяку, каго выбіць.

Часцей за ўсяго гатовілі паску, яечкі красілі (толькі ў красны цвет), сыр з маслам, бліны, халадзец, мяса тушанае, якое нацёртым хрэнам і бураковым расолчыкам намазвалі.

На ўсеночную ў царкву хадзілі, малітвы слухалі, как бацюшка кажа, маліліся. Крестный ход дзелалі з бацюшкай і пеўчымі вакруг царквы. Патом станавіліся ў рад і бацюшка хадзіў і асвяшчаў тое, што ў людзей было прынесена з сабой. А яшчэ перад тым матушка хадзіла с вядром, і туда все яечкі складвалі сырыя – балагадарнасць бацюшке.

На кладбішча хадзілі ўсягда. Яечкі качалі на магіле, клалі кусочкі паскі, яечка, канфеты, калі былі. Хадзілі адпяваць усопшых.

***Запісана ў в. Новыя Дзятлавічы Гомельскага р-на***
***ад Мартыненка Валянціны Уладзіміраўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Мартыненка А. (2006 г.)***

На Пасху красяць яйца, пякуць паскі. Нясуць свяціць у цэркву ўсё: і сала, і булку, рыбу – усё, што паставяць на стол.

К Пасхе прыбіраюць хату, усё мыюць, каб чыста было. Складаюцца потым, хто што прынясе.

Мужчыны гулялі ў карты на грошы. Да Пасхі не гулялі ў карты. Дзеўкі на качэлях каталіся. Ставілі стоўб, калясо зверху было, 3-4 вяроўкі прывязвалі за яго. Жэрдкамі падымалі ад зямлі 2 чалавекі, а ты ўжэ за вяроўку хватайся. Каталіся адзін за адным.

Яйца красілі ў шкарлупках ад лука. І шчас так красяць. Пускалі з гары яйца па аднаму. Так гулялі. Первы катае, следам другі. Еслі яйца па дароге стукнуцца, то выйграў другі, ён забірае яйца сабе. Еслі не стукнуліся, то выйграе той, чыё далей закаціцца і забірае ён.

Яшчэ біліся. Адзін дзержа яйцо, а ты б'еш носікам у носік, затым ты дзержыш, а ён б'е ўжо з другога бока. Выйграе той, чыё яйцо астанецца цэлае ці цэлае з аднаго боку, а ў другога чалавека яйцо будзе разбітае з двух бакоў. Еслі ў цябе цэлае яйцо, значыць ты забіраеш.

Гуялі ў чыжыка. Клетку рысуюць на зямлі дзесьці паўметра. У серадзіну клеткі ложаць чыжыка – з двух канцоў заточаная палка, прыкладна 20 см. Можна горачку зрабіць, штоб легчы было папасць. Бралі длінную палку ў руку і білі па чыжыку. У тое врэмя, калі ён падскоквае, білі па ім зноў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

каб ён не ўпаў у клетку. Еслі ўпадзе чыжык у клетку, то ты праіграў, выкінуў з клеткі – 2 ачка. Выйграе той, у каго большэ ачкоў.

***Запісана ў в. Пакалюбічы Гомельскага р-на***
***ад Чыжовай Сафіі Іванаўны, 1941 г.н.***
***(прыехала з в. Новая Гута Гомельскага р-на),***
***студэнткай Аніпавай Ю. (2004 г.)***

Перад гэтым днём лаўкі шкраблі, палы мылі, хаты бялілі, каб чыста было. Забівалі кабана і рабілі бужаніну, усялякую страву. Усё гатавалі да Вялікадня, уранні. Яйкі красілі ў чырвоны цвет. З цыбулевага шалупіння рабілі адвар і ў ім красілі. Пяклі паску. Ішлі ў цэркву на ўсеночную маліцца, там свяцілі ежу: сала, паску, яйкі... Прыкмета была: калі ўсю ноч пяе салавей, будзе ясны дзень.

Перад Вялікаднём быў пост, ён заканчваўся і ўранні ўсе разгаўляліся. Хадзілі адзін да аднаго ў госці. Трэба было гаварыць: "Хрыстос васкрэсе – ва ісціну васкрэс". Гэта прыветствіе длілася да Вазнесенія, шэсць нядзель.

Вадзілі карагоды і спявалі:

Што ў нашага Восіпа шырокае возера,
Што на тым на возеры
Серы гусі плавалі.
Як наляцеў гусачок
На серу гасачку
І паразганяў серых па возеру,
А адну сваю чырачку
Ён узяў за крылачка
І павёў яе ў сад к сабе,
Насыпаў пшанца
Да самага крыльца,
Наліў вадзіцы да каленца,
А чырачка не клюе, не п'е,
А пад калінку плакаць ідзе.

***Запісана ў в. Пакалюбічы Гомельскага р-на***
***ад Грыбанавай Н.І., 1935 г.н.,***
***студэнткай Падцерабковай Ю. (2001 г.)***

Посталі перад Пасхай. Ужэ мамка нічога есць не давала. У цэркві ўжэ усеночная. У цэркву ідом. Паскі пякуць, яйкі красяць. Шалуху лука настайваюць. У чацвер ужэ замачуем. Вадзічка красненькая дзелаецца. Закіпяцілі ету шалуху і ў ёй варым яйкі. Тады яны красненькія-красненькія. Арэлі, качэлі ўжэ на первы дзень. Шчэ мы гулялі на первы дзень – вербы такія высокія. Там жа арэлі, качэлі вешалі. Калыхаліся, песні ўсякія пелі:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Вой лі, вой люлі,
Захацей мілой ключавой вады.
Вой лі, вой люлі,
Ключавой вады.

І як паддадуць, а даска здаровая такая – качэлі, аж падскакваю, ажно страшна. Тады гулялі лапту. Збіраюцца па адзін бок і па другі, а ў серадзіне ўжэ сколькі чалавек, і тады выбіваюць людзей (дзевак – хлопцы). У мячыка задаўнога гулялі. Хлопцы, дзеўкі збіраюцца. Як зададуць мячык, мячык той ляціць, а гэта нада прабег два разы – з адных варот у другія варата.

Цэрква была. Збіраліся ўжэ ўсе людзі на цвінтэр. Мужыкі да цэрквы садзіліс у карты гулялі, яйцы выігралі. Адзін бярэ яйцо і другі і б'юць. У каго расколецца яйцо, тому той жа аддае. Хто болей павыграе.

***Запісана ў в. Пакалюбічы Гомельскага р-на***
***ад Скачковай Дзінаіды Фёдараўны, 1939 г.н.,***
***студэнткамі Бакланавай А., Балакішыевай Ю. (2004 г.)***

Перад Вялікаднем прыбіралі ў хаце: мылі вокны, вешалі чыстыя гардзіны, мылі пол. Яйцы красілі ў красны цвет шалушкамі з цыбулі. Булкі пеклі з макам.

У гэты дзень усе гулялі ў біткі. Абязацельна на Пасху хадзілі на кладбішча, насілі памерлым булку і яйцы.

***Запісана ў в. Пракопаўка Гомельскага р-на***
***ад Рабцавай Валянціны Фёдараўны, 1952 г.н.,***
***студэнткай Бажковай С.В. (2006 г.)***

Вялікдзень называлі ў нас Вяліканнем. Ждалі Ісуса Хрыста, штоб ужэ сказаць: "Хрыстос уваскрэс, Хрыстос уваскрэс". Тады весело було, так добрэ, нічого не трэба було рабіць, толькі згатовіць есці да Паскі, а на Паску ўжэ гатовае паесці.

Хадзілі валачобнікі ў панядзелак на другі дзень Паскі. Хадзілі к кумам. Бяруць дзесятак яец, пірага і ідуць мужык з жонкаю к кумам. Там погосцяць ужэ, а тады к сабе завуць. Так радасно було.

Спявалі ўсякіе песні. Прыйдуць да смеюцца, кажуць: "Цётка, му прыйшлі к вам у валачобнае". Весело було, што прыходзяць, за стол седаюць.

***Запісана ў в. Пясочная Буда Гомельскага р-на***
***ад Гашко Евы Пятроўны, 1934 г.н.***
***(раней жыла ў в. Дуброва Конкаўская Петрыкаўскага р-на),***
***студэнткамі Шынкарэнка А., Цімашэнка Т. (2006 г.)***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

На Пасху яйкі красілі ў чырвоны колер у нашай вёсцы. А з горада ўжо бацька прывазіў і зялёныя. У біткі гулялі. Елі ў каго што было, бо было цяжка з мукой і пекці – нічога не пеклі. У біткі гулялі толькі мужчыны. Яны рабілі жэлабок дзе і каталі яйца. Па Палессю хадзілі валачобнікі, а ў нас не. Дажэ запрашчано было песні пець на Пасху.

***Запісана ў в. Пясочная Буда Гомельскага р-на***
***ад Пыталёвай Антаніны Іосіфаўны, 1921 г.н.,***
***студэнткамі Максіменка Н., Пушкарскай Т. (2001 г.)***

Тры гады таму народны фальклорны гурт “Званіцы” зрабіў, а дакладней, уваскрасіў абрад “Валачобнікі”. У гэтым годзе яго паказалі на Вялікдзень на рэспубліканскім тэлебачанні ў праграме “Запрашаем на вячоркі”. Пры напісанні сцэнарыя былі выкарыстаны фальклорныя нататкі з вёсак Брагінскага, Хойніцкага і Чачэрскага раёнаў.

На Вялікдзень сялянскія хаты ўпрыгожвалі вырабамі вясковых майстроў: посцілкамі, ручнікамі, сурвэткамі. На сталах былі чырвоныя яйкі, пірагі, галінкі вярбы. За сталом сядзелі госці. Гаспадыня казала:

Хрыстос Васкрэс!
К табе, о, Божа,
І я ў дзень гэты
Просьбу маю –
Хай Беларусь,
Мая старонка,
Уваскрэсне к вольнаму жыццю!

Потым у хату ўваходзілі дзеці, яны казалі: “Хрыстос уваскрэс!” А гаспадыня ім адказвала: “Сапраўды ўваскрэс!” Дзеці падбягалі да яе і цалавалі. Гаспадыня казала ім: “Дзякую, дарагія мае, што не забыліся у такі дзень на мяне”. А дзеці віншавалі яе са святам, з Вялікаднём. А гаспадыня хаты ім адказвала: “І вас са святам, кветачкі мае! Спяшаліся, каб не спазніцца? У вочах вашых бачу яшчэ сон і тварыкі не паспелі яшчэ памыць... То праходзьце, будзем умывацца адварам, у якім фарбавалі яйкі. Існуе такое павер’е: памыўшыся адварам пафарбаваных яек, чалавек ачышчаецца ад усялякіх нягод”. Яна выносіла чыгунок з адварам і дзеці па чарзе мылі твар. А потым спявалі валачобную песенку:

Сонейка заззяла, над краем узышло,
З небесаў нам паслала святочнае цяпло.
Пачатак Існай ранічкі –
Чароўнае праменне.
Святочная заранічка –
Прыроды абуджэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

На Вялікдзень існавала яшчэ адно павер’е: нібыта ў гэты дзень сонейка іграе, струменіць праменьчыкамі. Гэтае свята ў гонар сонца, абуджэння прыроды і падыходу палявых работ. Таму з сонейкам прывіталіся і віншавалі са святам. Вадзілі карагоды і спявалі:

Свяці, свяці, сонейка,
Свяці, свяці, яснае.
Ой, люлі, люлі, люленькі, люлі,
Ой, люлі, люлі, люленькі, люлі,
Каб нам было цёпленька,
Пад хаткаю седзячы.
Ой, люлі, люлі, люленькі, люлі,
Ой, люлі, люлі, люленькі, люлі,
Пад хаткаю седзячы,
Лусту хлеба дзержачы.
Ой, люлі, люлі, люленькі, люлі,
Ой, люлі, люлі, люленькі, люлі,
Песенкі спяваючы,
Вясну праслаўляючы,
Ой, люлі, люлі, люленькі, люлі,
Ой, люлі, люлі, люленькі, люлі.

Пірог і яечкі ставілі на святочны стол і запрашалі да яго гасцей. На Вялікдзень гатавалі многа страў, але частавацца пачыналі пасля таго, як кожны паспрабуе скрылечак яечка, хлеба і солі. Пачаставаўшыся, дзякавалі гаспадыню, а потым хадзілі ў “жачкі”. Дзеці падыходзілі да гасцей за сталом і гаварылі па чарзе:

Дай вам Божа, гаспадар,
Жыці, быці, весяліціся,
На Бога маліціся.
Добра пажывайце
Ды бяды не знайце.
Я маленькі жачок,
Паўзу, як рачок,
Скачу, як жабка,
Дай яечка, бабка.
Бывай здароў, жыві сто гадоў,
Жыві болей, мей сто коней,
Хадзі каля рэчак, мей сто авечак,
Хадзі каля ладак, мей сто цялятак.
А мы, госці недакучныя,
Недакучныя ды нячастыя,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

А ў гадок адзін разок –
На вялікі дзень, на Вялікдзень.

Потым дзеці хадзілі па другіх хатах, каб павіншаваць гаспадароў і атрымаць жачкі.

Запісана ў в. Рудня-Марымонава Гомельскага р-на
***ад Курпенка Тамары Пятроўны, 1952 г.н.,***
***кіраўніка народнага гуртка "Званіцы", дырэктара СДК***
***(перасяленка з Брагінскага р-на),***
***студэнткамі Міхайлавай Т., Юрасік Т. (2002 г.)***

На Вялікдзень нада было, штоб у кажнай хаце пеклі булкі-паскі. Пеклі, а патом украшалі (храсты ляпілі наверх, ну, хто як). У хаце прыбіралі, штоб чыста была ўсюды. Яйкі абязацельна красілі. У красны цвет – шурпіннем з цыбулі. Бо, кажуць, што нада красным красіць – эта кроў Хрыста. Ну, можна і другія цветы. Я красным фарбавала. Паску ладзілі на дражжах. Як падойдзе, замясіць яе і ў печ, толькі не ў жар. Жар выграсці і туды паску. Еслі паска ўпадзе (не падымецца цеста), то эта плоха. Ну, а ў харошых хазяек дак рэдка падалі.

На могілкі хадзілі. Паскі насілі, яйкі, гарэлку. З яйцамі гулялі ў біткі. Дак і сейчас гуляюць. Як малая была, дак адзін [хлопец] зрабіў якое-та яйцо твёрдае (мо із дзерава ці з чаго), дак хадзіў з намі ў біткі гуляць і паразбіваў нашы яйкі. Ну, дак патом куп ізлавілі і пабілі дужа. Было ўсяк. Чые яйка паб'еш, то сабе забіраеш. Валачобнікаў не было. Не помню.

***Запісана ў в.Старое Сяло***
***ад Мацюковай Ніны Данілаўны, 1930 г.н.,***
***студэнткай Пісарэнка С.***

Вот, напрымер, у суботу, хто ў пятніцу, пячэ пасхі етыя. А так у суботу абыкнавенна: гатуеш на абед усё, топіш печ, пячэш пасхі і ўтрам, штобы вечарам была пасха, штоб пасвяціць. Красіш яічкі, тушыш мяса, ну, што ў каго. І гатуешся, ідзеш на ўсенашную. Бярэш ту пасху, яічкі, сала, што ё, штобы бацюшка пасвяціў. Прыезджаеш, усе ўстаюць, усе. Ну, як мы малыя былі, дык Пасху етую ждалі, штоб адзецца чысценька. Ну, мамка там паш'е плацце. Тады ноч не спіш, штоб скарэй устаць. Усе адзяюцца ўтрам, цалуюцца: "Хрыстос уваскрэс". Садзяцца ўсе за стол, свае родствіннікі, ну, прыходзяць усе. Патом яічкі етыя крашэныя, красіш многа, бяруць мужчыны і ідуць, сабіраюцца іграць у біткі.

На ўтары дзень, раньше, хадзілі старцы, ну, бедныя людзі, нішчыя. Вот, напрымер, у нас быў адзін сляпы такі, і ён усе прымхі і чужое знаў, і етае ўмеў. Калдаваць, ён не калдаваў, толькі аддзелаваў. Вот ён ходзя, яму ўсе дорац пасхі, сало і завядуць, дадуць яму паесць, і ўсё. Ён насабірае цэлую

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сумку. Што старцу падорыш, то на тым свеце сам паясі. Ён пеў бажэственныя песні, благадарыл. Ён жа песнямі етымі заўлякае. Вот ета, вот і ўсё.

*Запісана ў в. Шарсцін*
*ад Ганчаровай Аляксандры Аляксандраўны, 1929 г.н.,*
*Трусавай Валянціны Агееўны, 1923 г.н.,*
*студэнткай Супрун Н.*

На Вялікадзень людзі разгаўляліся. Нямьзя было печ тапіць. І ваабшчэ нельзя было работаць.

Яйкі красілі ў красны цвет. А красілі шалухой лука. Яе сабіраюць цэлы год, ложуць у чугунок, заліваюць вадой, каб настаяла. Патом туда кладуць яйкі і вараць. Шалушкі яйка не выбрасывалі, а хавалі за шыйку.

Зачынялі цеста, а назаўтра жонка рабіла пасхі, ставіла іх на печ, каб падняліся, патом украшала і ставіла ў печ. Калі пасхі выпякаліся, нельзя было стукаць у хаце, каб была цішына. Патом зверху мазалі яйкам і цукрам. Памазок рабілі з пер'я.

Канешне, гулялі ў біткі. Качаюць яйкі з горкі ў латках. З дзерава кусок кары ложаць на зямлю, штоб уклон быў, кідаюць яйка ў латок, пакацілася, у чый бок паказалася, той і забірае.

Хадзілі на могілкі. Качалі яйкі па кругу, астаўляюць на могілках.

Не, валачобнікі не хадзілі. У нас такога не было.

*Запісана ў в. Прысно*
*ад Гарбузава В.В., 1939 г.н.,*
*студэнткай Козыравай А.*

Перяд Паскай быў пост 7 нядзель. На нядзелі перад Паскай у чацверь тапілі баню да рассвета. У чісты чацверь была страсць. У пятніцу выношалі плашчяніцу і хавалі, а перяд Паскай выношалі плашчяніцу ўноч. Пяклі паску, красілі яйкі ў красны цвет, у шалусе. Як пасвяцілі паску, то трэба адразу з'есці яйка, а потым паску. Яйка дзялілі на столькі частак, колькі душ у сям'і. Яйцо астаўлялі да следуюшчего раза, да следуюшчей Паскі. З яйцамі і паскай хадзілі на кладбішче, там яйкам вадзілі па магіле. Скарлупкі ад яйка раскідалі па полю. Яшче яйкам вадзілі па галаве дзіцяці і гаварілі: "Колькі валаскоў у дзіцяці, каб столькі курка яечак знесла". Косці ад мясных страў закопвалі на полі. На Паску хадзілі глядзець, як гуляе сонца.

*Запісана ў в. Вялікія Нямкі*
*ад Дрыгуновай Анастасіі Канстанцінаўны, 1912 г.н.,*
*студэнткамі Чарняўскай В., Платонавай А.,*
*Цэпавай Ю., Пракапоівч І.,*
*выкладчыцай Новак В.С.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

На Паску пяклі яечкі, качалі на галоўцы дзіцяці і гаварылі: “Каб было столькі яечак, колькі ў дзіцяці валаскоў”. Шкарлупкі сыпалі на зямлю і давалі скаціне. Хадзілі на кладбішча, астаўлялі там паску і крошкі з паскі.

***Запісана ў в.Прысно***
***ад Арцяшковай Марыі Цімафееўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Чарняўскай В.***

## Абрад «Важэнне сулы»

На втары дзень паскі вадзілі, вадзілі і на Благавешчанне. Сабіраліся бабы і ішлі з Краўцоўкі ў Дзікалаўку. Дзікаляне накрывалі стол, частавалі, вадзілі сулу, штоб капуста радзіла. Усё ўрэмя ішлі і песні пелі. Называлася сула ад таго, што сабралася многа людзей.

***Запісана ў в. Краўцоўка Гомельскага р-на***
***ад Дубадзелавай Еўдакіі Сергееўны, 1928 г.н.***
***студэнткамі Мендзелевай Т., Ачарэт А. (2006 г.)***

Сула на 3 дзень Паскі. Збіраецца ўсё сяло і ідуць, і песні пяюць карагодныя:

Шла сула да ўздоўж села,
Да ўбіла страла добра моладца,
Па том моладцу некаму плакаці,
Матка старанька, сястра маленька.
Дзе матка плача, там рака цячэ,
Дзе сястрычка, там крынічанька,
А дзе жана малада, там і расы няма.

***Запісана ў в. Краўцоўка Гомельскага р-на***
***ад Сядой Ульяны Аляксееўны, 1918 г.н.,***
***студэнткамі Мендзелевай Т., Ачарэт А. (2006 г.)***

**Як пушчу стралу да ўдоўж сяла...**

Як пушчу стралу да ўздоўж сяла.
Ой, ідзі, страла, уздоўж сяла
І ўбі, страла, добра молайца.
Па том молайцу плача сястра маленька,
А жана малада каля горада.

***Запісана ў в. Крыўск***
***ад Цітарэнка Ніны Васільеўны, 1939 г.н.,***
***студэнткай Цітарэнка Т. (1994 г.)***



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вадзілі стралу. Сабіраецца адна маладзёж, ходзяць па ўліцах у круге. Пелі, а хлопцы ігралі ля хат.

Вядзём стралу
Па ўсяму сялу.
Вой ле, вой ле, па ўсяму сялу.
Ты ляці, страла,
Дый уздоўж сяла,
Ты ўбей, страла,
Майго мілага.

Пад канец пелі песні.

***Запісана ў в. Марозавічы***
***ад Давыдзенка Кацярыны Апанасаўны, 1928 г.н.,***
***Столпнік Ганны Аўрамаўны, 1930 г.н.,***
***Леўчанка Вольгі Сямёнаўны, 1918 г.н.,***
***студэнткамі Азарэвіч В., Карлікавай К., Смірновай А.***

Стралу вадзілі на другі дзень Паскі. Спачатку збіраліся ўсе разам і ішлі на кладбішча. Калі ішлі, то спявалі розныя песні. А пасля вадзілі танка і спявалі песні:

Як пушчу стралу ды па ўсём сялу.
Ты ляці, страла, ды ўздоўж сяла,
Ты ўбі, страла, добра молайца.
Па том молайцу некаму плакаці:
Мамка старанька, сястра малянька,
А жана малада каля горада.

У час гукання вясны вадзілі танка. Танок вадзілі толькі жанчыны. Выбіралі двух жанчын на ролю “старца” і “старчыхі”. Пераапраналіся. Бралі бутылку гарэлкі і дваём выпівалі. Нікому не давалі. А патом усе разам ганялі мужчын палкамі. Калі вадзілі танок, то спявалі песні:

У крывога танка
Нарадзіла бабка сынка,
Паклала на лаўку,
Пакрыла караўкай.
Каравачка ссохла –
Дзіцятачка здохла...

Гулянні прадаўжаліся аж да позняга вечара.

***Запісана ў п. Осаў***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*ад Вішняковай Ганны Дзямідаўны, 1918 г.н.,*
*студэнтам Вішняковым В.*

На Стрэчанне гукалі вясну ў хаце. На Ушэсце, ад Пасхі на 6-й нядзелі, гукалі вясну на вуліцы. Вадзілі вясну ў жыта. Дзеўкі і хлопцы падыходзілі да жыта і качаліся, каб не балелі спіны. Патом гулялі, пелі песні, вадзілі хараводы.

* * *

Выйдзі, Грыця, на вуліцу,
Вынесь гуселькі пад палою.
Зайграйце, гуселькі, пад вярбою,
Пад вярбою, пад чырвонай калінаю.
Чаго, каліна, схілілася,
А малада дзяўчына журылася.

* * *

Вецер вее, павявае, у-у-у,
У каморы дзверы адкрывае, у-у-у,
Свёкар нявестачку пабуджае:
– Уставай, нявестачка маладая,
Пашлі кароўкі, рыкаючы,
Вараны коні, брыкаючы.
Пашлі кароўкі, не доены,
Вараны коні, не поены.

***Запісана ў в. Патапаўка***
***ад Дземянковай Надзеі Парфёнаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Герцавай Т. (2002 г.)***

**Што ў нашых вароцях**

Што ў нашых вароцях
Шырокае возера.
Ой, люлі, ой, люлі,
Шырокае возера.
Што па тым па возеры
Серы гусі плылі.
Ой, люлі, люлі,
Гусі плылі.
Наляцеў, паляцеў
Сізы арол на гусей.
Ой, люлі, ой, люлі,
Сізы арол на гусей.
Дай схваціў, дай схваціў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Гусачку за крылышкі.
Ой, люлі, ой, люлі,
Гусачку за крылышкі.
Ой, не так за крылышкі,
Як за серы пёрушкі.
Ой, люлі, ой, люлі,
За серы пёрушкі.
Як страпянулі гусачкі,
Гусачкі ў крылышкі.
Ой, люлі, ой, люлі,
Гусачкі ў крылышкі.
А хто ж у нас, а хто ж у нас
Уперад будзе плаваці?
Ой, люлі, ой, люлі,
Уперад будзе плаваці.
А хто ж там, а хто ж там
Волны будзе разбіваць?
Ой, люлі, ой, люлі,
Волны будзе разбіваць.
Што ў нашых у вароцях
Шырокая вуліца.
Ой, люлі, ой, люлі,
Шырокая вуліца.
Што па той вуліцы
Дзеўкі танка вадзілі.
Ой, люлі, ой, люлі,
Дзеўкі танка вадзілі.
Наехаў, паехаў
Хлопчык на коніку.
Ой, люлі, ой, люлі,
Хлопчык на коніку.
Дай схваціў, дай схваціў
Дзеваньку за ручаньку.
Ой, люлі, ой, люлі,
Дзеваньку за ручаньку.
Ой, не так за ручаньку,
Як за русу косаньку.
Ой, люлі, ой, люлі,
За русу косаньку.
Як успляснулі, як успляснулі
Дзевачкі ў ладошкі.
Ой, люлі, ой, люлі,
Дзевачкі ў ладошкі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

А хто ж у нас, а хто ж у нас
Будзе ўперадзе хадзіць?
Ой, люлі, ой, люлі,
Будзе ўперадзе хадзіць.
А хто ж наш, а хто ж наш
Будзе танок вадзіць?
Ой, люлі, ой, люлі,
Будзе танок вадзіць.

**Дрэма**

Дрэма дрэмле, дрэма дрэмле пад кудзеляй,
Дрэма дрэмле пад майковай.
Уставай, дрэма, уставай, дрэма, свёкар едзе,
Падарачак табе вязе.
Я не ўстану, я не ўстану, не пагляну,
Я не ўстану, не пагляну.
Уставай, дрэма, уставай, дрэма, свякроў едзе,
Падарачак вязе.
Я не ўстану, я не ўстану, не пагляну,
Я не ўстану, не пагляну.
Уставай, дрэма, уставай, дрэма, бацька едзе,
Падарачак табе вязе.
Я не ўстану, я не ўстану,
Я не ўстану, не пагляну.
Уставай, дрэма, уставай, дрэма, маці едзе,
Падарачак табе вязе.
Я не ўстану, я не ўстану, не пагляну,
Я не ўстану, не пагляну.
Уставай, дрэма, уставай, дрэма, мілы едзе,
Падарачак табе вязе.
Ой, я ўстану, ой, я ўстану, я пагляну,
Ой, я ўстану, я пагляну.

***Запісана ў Буда-Кашалёўскім р-не***
***ад Гаўрусевай Ганны Прохараўны, 1920 г.н.,***
***студэнткай Некрашэвіч А.***

## Юр’е

*Пытанні*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Хто такі святы Юр'я (Юр'е, Ягорый, Георгій)?
Якія абрадавыя дзеянні выконвалі на Юр'е ?
Ці абыходзілі поле?
Што вы выедаеце пра юраўскую расу?
Як выганялі кароў на пашу?
Ці закопвалі пад парог хлява (пад вароты) яйкі ці іншыя прадметы?
Як абаранялі жывёлу ад ведзьм?
Якія дзеянні здзяйснялі пастухі?
Якія дзеянні выконвалі на Юр'е з мэтай забяспечыць добры ўраджай?
Якія юраўскія песні спявалі?

*Узор запісу*

У гэты дзень упершыню выганялі кароў на пашу. Бывае два разы ў год: вясной і восенню. Пагаворка: "На Юр'я даўжно быць сена і ў дурня".

***Запісана ў г.п. Буда-Кашалёва***
***ад Усцінавай Ніны Арцёмаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткамі Міненка В., Барадзіной В., Кашлаковай А.***

У гэты дзень качалі яйцы па жыце, штоб быў харошы ўраджай, самі таксама качаліся. Першы раз выганялі жывёлу на поле. Выганялі галінкамі пасвячонай вярбы, якую свяцілі перад Пасхай.

***Запісана ў г.п. Буда-Кашалёва***
***ад Прусавай Зоі Фёдараўны, 1922 г.н.***
***(нарадзілася ў в. Кутнева Салігорскага р-на),***
***студэнткамі Міненка В., Барадзіной В., Валошынай А.,***
***Кашлаковай А.***

На Юр'е качалі яйца на жыце, штоб быў харошы ўраджай. І самі качаліся па жыту. У гэты дзень выганялі ў першы раз у поле жывёлу. Выганялі вярбой, якую свяцілі перад Пасхай.

***Запісана ў г.п. Буда-Кашалёва***
***ад Прусавай Зоі Фёдараўны, 1922 г.н.,***
***студэнткамі Азарэвіч В., Карлікавай К., Смірновай А.***

Калісь была прымета такая: сеялі гуркі ў еты дзень. А так кароў выганялі першы раз у поле. І выноску дзелалі пастухам. Выноска – гэта ежа. Напрымер, первы раз выганяюць карову, і яна, хазяйка, нясе два яйцы ці тры, ці шчэ што, і ўсё гэта пастуху. Не ўсе, канешна, выносілі, але многія. Вось гэта "выносна" была. А ў гэты дзень выганялі первы раз, бо трава як ужэ харошая, і карове можна есці. І перад выганам пасвяцонай вадой аблівалі і пасвяцонае голле (вярбу) бралі. Гольку бяруць і выганяюць карову. Ета, каб засцерагчы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***Запісана ў в. Бацунь***
***ад Цітарэнка Евы Іванаўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Цітарэнка Н. (2001 г.)***

На Юр’я харашо сеяць агурцы. Выганялі скот святой вербой, угашчалі пастуха. Кагда праганялі карову, снімалі з себя юбку, переводзілі через нее карову і говорілі: “Как моя юбка меня бережет, так карова свой двор берегла”. Сабіралі травы.

***Запісана ў в. Буда-Люшаўская***
***ад Арашовай Любові Яхімаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткамі Фяськовай К., Варажун С., Валошынай А.***

Было 2 Юр’і: адзін халодны, а другі галодны (веснавы). Гаварылі: “Два Юрі і абоі дурні”. Першы раз выганялі жывёлу на пашу ветачкамі свяцонай вярбы. Клалі ніты, яйцо і 3 разы карову пераводзілі. Гаварылі: “Юрый-Ягоры, выйдзі на Сіянскую гару і затрубі ў семігласную трубу. І збяры ўсіх храммоў і храміц, і замкні ім зубы, губы і трэці язык”. Ведзьмы на Юр’я перад усходам не спалі ноч, сабіралі расу цадзілкай, каб карова малако не давала.

***Запісана ў в. Буда-Люшаўская***
***ад Свірыдзенка Таццяны Дзянісаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткамі Фяськовай К., Варажун С., Валошынай А.***

Два Юр’я ў гаду і абодва дурні, адзін халодны, а другі галодны. Два Юр’і – вясной 6 мая і восенью 9 акцября.

***Запісана ў в. Буда-Люшаўская***
***ад Свірыдзенка Таццяны Дзянісаўны, 1923 г.н.,***
***студэнткай Кузьмянковай Н.***

Юр’е празнуецца 23 красавіка. Раней казалі, што святы Юрый вясну адмыкае, жывёлу і поле абараняе. На Юр’е першы раз пасля зімы вывадзілі ў поле каней і кароў. Каней выганялі ноччу перад Юр’ем. Уся сям’я малілася, а гаспадар ішоў у стайню з яйкамі. Яйкі былі шчэ з Вялікадня. Колькі каней у яго было, столькі і яек браў і там іх закапваў пад парогам, каб бераглі коней ад нячыстай сілы. Хрысціўся і казаў: “Прыйшла юр’ева раса, вам ня дам аўса!” Потым ён вывадзіў тых каней, каб перашлі цераз парог, дзе яйкі закапаны, а сам наступаў на парог правай нагой ад нячыстай сілы. Гаспадар або работнік, калі ў іх быў, гнаў каня ў поле, на расу.

Казалі, што трэба на Юр’е і жывёле, і людзям раніцай хадзіць па расе, а дзецям – качацца па расе, каб здаровымі былі.

На Юр’е пелі такую песню:

Ой, ты, Юр’е, устань рана,
Адамкні зямлю,
Выпусці расу,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Каб радзіла жыта буйнае,
Ядраністае, каласістае.

На Юр'е ў поле выганялі кароў. Перад гэтым маліліся ўсёй сям'ёй. Гаспадыня біла карову ветачкай вербы, свячонай у царкве на Вербніцу. Гаспадар вёў кароўку ў поле. Пелі шчэ песню:

Юр'я святы,
Дай нам ключы
Зямлю адмыкаць,
Кароўку напасаць.

Трэба было на Юр'е абайці поле. Пяклі каравай, бралі гарэлку, тыя крашаныя яйкі, што з Вялікадня асталіся, усё гэта лажылі ў чысты белы абрус. Бралі яшчэ якіясьці косткі з велікоднага мяса. На поле сваё ішлі сям'ёй. Прыходзілі і здароваліся:

Здраствуй, ніўка святая!
З хлебам-соллю цябе вітаем,
З Юр'ем святым паздраўляем!

І кланяліся. Потым усе моляцца, а гаспадар абтыкаў косткамі ўсё поле па краям і тыя месцы, дзе ў прошлым гаду плоха расло жыта. Мог ён абходзіць і казаць:

Ой, ты, Юр'я, Мікола,
Абыйдзі жыта наўкола.
А я жыта абайду,
Сваё жыта пагляжу.
Хай расце ядраністае,
Хай расце каласістае.

Раней людзі верылі, што на Юр'е можна пачуць, пра што жыта гаворыць. Потым рассцілалі абрус і ўсёй сям'ёй елі на полі. Казалі:

Будзем піва піць – будзем сына жаніць,
Будзем гарэлку жаць – будзем дачку замуж аддаваць.

На Юр'е былі прыметы. Калі на Юр'е раса, будзе багата аўса. Калі ідзе дождж, будзе багата малака ў кароў. Дождж сільны ідзе – жыта высокае ўзыйдзе.

***Запісана ў в. Глазаўка***
***ад Дзенісенка Ніны Мітрафанаўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Барадзіной В. (2000 г.)***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Гэта свята прыпадала на 6 мая. Юр’я быў богам, які аберагаў скаціну. У гэту ноч нада была вывадзіць скаціну (коней) у поле. Хазяін браў курыныя яйкі, сколькі коней, столькі і яек. Ён іх закопваў возлі хлева, пад парогам. Па павер’ю, гэта абараняла ад нячыстай сілы, якая кругом гуляла ў гэты дзень. Калі хазяін вывадзіў коней з хлева, ён даўжон быў наступіць правай нагой на гэта места, дзе былі закапаны яйкі. Пастухам давалі паесці, гарэлку. Раніцай быў рытуал абходу поля. Сабіралася ўся сям’я, бралі яйкі, ежу, гарэлку і ішлі на поле. Для гэтага абраду спецыяльна пеклі каравай. Калі прыходзілі на поле, то кланяліся яму і гаварылі: “Здраствуй, ніўка святая! З хлебам-соллю цябе вітаем, з Юр’ем святым паздраўляем!” Хазяйка ўсягда пакідала косткі пасля Вялікадня і брала іх з сабой на поле. Там усе абтыкалі гэтымі косткамі вакруг поля і тыя месцы, дзе не было ўражаю. Патом садзіліся каля поля і елі. Калі хазяін абходзіў поле з караваем, то казаў:

Ой, ты Юр’я, Мікола,
Абыходзь жыта наўкола,
А я жыта абыйду,
Сваё жыта пагляджу.
Хай расце ядраністае,
Хай расце каласістае.

Патом ішлі дамоў. У гэты дзень ніхто не працаваў.

*Запісана ў в. Глазаўка*
*ад Цыркуновай Марыі Апанасаўны, 1940 г.н.,*
*студэнткай Герцавай Т. (2002 г.)*

**Пагнала бычка на канюшыну**

Пагнала бычка на канюшыну,
Урасілася па паясіну.
Урасілася, бо раса была.
Хлопцы любілі – хараша была.
Хлопцы любілі – сукню пашылі:
– Насі, дзяўчына, штонядзелечку.
–Успамінай мяне штогадзіначку.
–А як насіла, так успамінала,
–А як знасіла, так праклінала.
– Бадай той кравец з ліца змініўся.
–Як у сукенет падол падбіўся.

*Запісана ў в. Елянец*
*ад Каменчуковай М.І., 1934 г.н.,*
*студэнткай Анапрэенка В.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У нас два Юр'я было. Бывае 6 мая і 9 дзекабря. На Юр'е пелі песні, гулялі, ездзілі ў госці адзін к аднаму, пелі, якія папала песн. Прыстольныя празднікі былі: вот у нас Мікола, у другой дзярэўні Юр'е, у трэцяй Раздво, у пятай Новы год.

Еслі хто гоне карову, тады ўжо выношуюць яду там ужэ. Ужо вродзе як выган. Ну, гэта не абязацельна на Юр'е, калі выганюць.

***Запісана ў в. Забалоцце***
***ад Чыкезавай Ганны Сцяпанаўны.1929 г.н.,***
***Мацвеевай Марыі Раманаўны, 1944 г.н.,***
***Юранавай Анастасіі Андрэеўны, 1924 г.н.,***
***студэнткамі Малаковіч І., Пархоменка Д., Помазавай Т.,***
***Зубец Т., Фяськовай К., Байдаковай К.***

Юр'еў дзень прыходзіцца на 6 мая. У гэты дзень выганялі худобу ў поле. Юр'я лічыўся заступнікам худобы і ўсёй гаспадаркі. Выганялі худобу вярбовым дубцам, які пасвяцалі ў вербную нядзелю. Пастуху выносілі яйцы, масла, твораг. Абходзілі палі з віконай. Пелі песні:

Вол бушуе – вясну чуе,
Дзеўка плача – замуж хоча.

У гэты дзень паяўлялася раса, якую звалі юр'евай расой. Вярбовы дубец ужыналі на полі, дзе пасуцца коні, каровы. Гэта ратавала поле ад граду.

***Запісана ў в. Крыўск***
***ад Цыркуновай Вольгі Цімафееўны, 1912 г.н.,***
***студэнткай Герцавай Т. (2002 г.)***

А дзе ж ты, Юр'я, умачыўся? 2 р.
– Па далам па гарам ходзячы, 2 р.
Да людзям жыта родзячы. 2 р.

***Запісана ў в. Ліпа***
***ад Юрковай Надзеі Мікалаеўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Кудзінавай А. (2000 г.)***

Юр'я святкавалі 6 мая – гэта быў галодны Юрый, а яшчэ быў Юрый 9 снежня – халодны. На Юр'я галоднага выганялі кароў на поле з хлявоў. Паганялі кароў пасвяцонай вярбой. Пастухі трубілі ў трубы. Песен не спявалі, усё ішло як і ў абычны дзень.

***Запісана ў в. Мікалаеўка***
***ад Мацюшэнка Марыі***
***студэнткай Мацюшэнка А. (2001 г.)***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Юр'я святкавалі 6 мая. У гэты дзень выганялі кароў на пашу. Каб выгнаць карову, бралі вярбовы дубец, які асвячалі ў цэркві.

У гэты дзень вечарам на жыце расцілалі скацерку. Калі яна набіралася расой, выціскалі з яе ваду. А патом паілі ёй скаціну, каб яе не брала хвароба.

***Запісана ў в. Осаў***
***ад Вішняковай Ганны Дзямідаўны, 1918 г.н.,***
***студэнтам Вішняковым В.***

Юр'я 6 мая. Уранні хазяйка заходзіла ў хлеў і казала: "Добры дзень таму, хто ў етым хляву. Святы Юрый-Ягорый меднай пугай па хляву шпігае, усю нішчату з етага хлява выганяе". Перахрысцісся 3 разы і ідзеш карову даіць. На Юр'яву расу гналі кароў з хлява. Тапор на еты бок каліткі кладуць на парог. Пасвяцонай вярбінай выганялі і казалі: "Як ета жалеза ляжыць нерухома, хай так і карова будзе незглажона", "Выганяю цяліцу на Юр'еву расіцу".

***Запісана ў в. Патапаўка***
***ад Дземянковай Надзеі Парфёнаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Герцавай Т. (2002 г.)***

Юр'я – прастольнае свята ў вёсцы Рагінь. Вясновае сваята, каторае адзначалася ў маі (6). Гэта свята – дзень св. Георгія-пераможца змія. Юр'я – ахоўнік сваёй жывёлы, асабліва коней. У ноч перад Юр'ем гаспадары стараліся вывесці коней на пашу, наймалі для гэтага пастуха. Спадзяваліся, што з'явіцца ў гэту ноч першая "юрава" раса, якая вельмі карысная для жывёлы. Калі з-за недахопу кармоў худоба цяжка пераносіла зімову, то яе ратавала толькі гэта раса. Даўней гаворылі: "Абы выйшла на Юраву расу".

З'яўленне расы было знакам таго, што зямля прачнулася ад сну, ажыла. Юр'я – божы ключнік – адмыкаў зямлю, пускай расу, расціў траву. Юр'я таксама даглядаў азімае жыта, вельмі важную культуру. Юр'я – свята варожбаў, магічных чынасцяў, каб засцерагчы жывёлу на пашы. На Юр'я гаспадар за караваем абходзіць свае нівы, закапвае на краі поля рэшткі велікоднага снедання, кладзе каравай на ніву, глядзіць, еслі каравай схаваўся ў жыце – быць добраму ўраджаю.

На Юр'я жывёлу абкурвалі, пераводзілі праз агонь, сцябалі вярбовымі ці арэхавымі галінамі. Таксама хадзілі на могілкі. На Юр'я хадзілі валачобнікі, асабліва дзяўчаты, а з імі музыка-скрыпач.

Дзяўчаты спяваюць, прыбіраюцца ў кветкі і ішлі на ўсю ноч, каб усе двары абысці.

Не дай Гасподзь, мінуць чыю хату. Дзяўчаты падыходзілі да хаты і пыталі, ці дазваляць ім гэту хату развесяліць. Атрымаўшы адказ, спявалі:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дай Божа, каб гэты год праваджалі,
Другога года сустракалі, дачакалі
У ураджаі і радасці.

Або:
Маладая маладзіца, малодка,
Каб цябе ігла вукалола,
Каб цябе паднімалі падводаю.

Хадзілі хлопцы і дзяўчаты на Юр'я, віншавалі замужніц. Там частавалі іх, выносілі абавязкова і сыр, бо "дасі сыра – народзім сына".

На Юр'я спявалі песні:

Юр'я, мыйся бела,
Юр'я, ідзі ў стаймо.
Юр'я, сядлай коней,
Юр'я, едзь у поле.
Юр'я, пусці расу,
Юр'я, цёпленькую
Юр'я, беленькую.

***Запісана ў в. Рагінь***
***ад Чаняковай Марыны Яўменаўны, 1902 г.н.,***
***студэнткай Некрашэвіч А.***

На Юр'еў дзень хазяйкі гаварылі замовы, каб пазбегнуць бяды, ратаваць жывёлу. Клалі тапор на зямлю каля варот і гаварылі: "Як гэтае жалеза ляжыць, хай так і скаціна з поля не сходзіць". А тады яшчэ і спявалі:

Ты, Юр'я, святы ключнік,
Сядлай каня варанога,
Едзь у поле чыстае,
Адамкні зямлю, пусці расу,
Пусці расу на ўсю вясну,
І чыстую і частую,
І цёплую, і мокрую,
І на ўвесь свет, на кожны цвет.
Юрый, уставай рана,
Адмыкай зямлю, выпускай расу,
На цёплае лета, на буйнае жыта.

***Запісана ў в. Чабатовічы***
***ад Арловай Ульяны Дзмітрыеўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Якаўлевай А. (2005 г.)***

Юрай святкавалі. У цэрквы маліліся, бабы сабіраліся. Юрый у нас бальшы празнік. Ацец Георгій аб'язджаў усё поле і свяціў. Гэта ўжо 6 мая. Аб'язджаў усё поле і свяціў жыта, штоб было ўсё харашо, не прапаў ні ка-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

ласок, нічога, што Гасподзь даў. Хадзілі ў жыта, маліліся Богу: «Дай, Бог, дожджык земле. Дай, Бог, дожджык земле». Паўтарыць тры разы, «Отче» пелі. Усе святыя песні. На Юр'я варылі калісь і мёд.

На Юр'я кажуць, каб было сена ў дурня. А яно як прыдзецца, дык ні ў дурня, ні ў разумнага.

***Запісана ў в. Стаўбун***
***ад Зуевай Марыі Лаўрэнцьеўны, 1927 г.н.,***
***студэнткай Ведзь А.***

**На Юр'я**

Юр'я, устань рана,
Юр'я, умыйся чыста,
Юр'я, прычашыся,
Юр'я, адзенься,
Юр'я, вазьмі ключыкі,
Юр'я, ідзі ў поле,
Юр'я, адамкні зямліцу,
Юр'я, выпусці расіцу,
Раса на кароўкі,
Трава на конікі.
Напасі скацінку.

**Юр'еўская**

Ой, не стой, Юрый, над вадой,
Не трусі, Юрый, барадой,
Бо вада пад табой.

***Запісана ў в. Янова***
***ад Цішковай Феадоры Ільінічны, 1916 г.н.,***
***студэнткай Касьянавай Г.***

Еты празднік я не ўважаю. На Юр'е была заведзено выганяць скот. Толька скот можна была выгнаць і ў будзень дзень, пасціць ён будзе лучшэ. А можна на Юр'я выгнаць, а балець будзе.

Ёсць пагаворка: "Да на Юр'я сена далжно быць у дурня, а на Міколу падавай, вілкі пахавай" (Мікола 22 мая).

***Запісана ў в. Радуга***
***ад Паладзі Марыі Іларывонаўны, 1925 г.н.,***
***студэнткамі Урбан В., Горбач М.,***
***Галавачовай М., Хадуньковай Н.***

Вот мы на Юр'я, 6-га мая, выганяем кароў. Адзін Юр'я галодны, адзін – халодны. Ета было восенню, і была ета вясной. Халодны – ета ў восені, ета проста абрад такі. Дзелалі сараі цёплыя, штоб скот не балеў, там насыпалі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

зярно, у каторае на Пасху становяць свечкі. Так вот етым зярном пасыпаюць у хлеве, штоб не мёрз, штоб не балеў скот. А на Юр'я галодны, калі выганяюць кароў, бяруць ветачку вербы. А вербнае васкрэсенне бывае, едзіш у цэркву, вярбу бярэш, яе свецяць, ету вярбу хаваеш. Етай вярбой выганяеш на Юр'я скот, ну, і гаворыш малітву: "Памагі, Госпадзі, штоб скот быў здаровы, штоб малака было багата…"

І етай ветачкай нада 6 раз ударыць. А ветачку ету, патом прыходзіш і ў хлеў утыркнеш, нехай. Штоб карова дамой хадзіла. У еты дзень ведзьмы ў хлеў насабіраюць косы, трапкі якія, ну, і што-та там гавораць і тыркаюць. І нажы тыркаюць у хлеў. А тады ў хлеве непарадак. Етыя ведзьмы вот такое вот дзелалі.

*Запісана ў в. Шарсцін*
*ад Ганчаровай Аляксандры Аляксандраўны, 1929 г.н.,*
*Трусавай Валянціны Агееўны, 1923 г.н.*
*студэнткай Супрун Н.*

**Юрэй**

Ой, ты, Юр'я даражэнькі,
Устань ты рана-ранюсенька,
Умывайся добра дабяла,
Прычашыся роўна,
Вазьмі ключы чароўныя,
Выйдзі ў палі агромныя,
Адамкні хутчэй зямлю,
Выпусці адтуль расу.
Хай зямелька ажывае
Ды дабром нас асыпае.

* * *

Па вуліцы, па шырокай, бегла дзеўка-семілетка,
За ёй парэнь малады, кажа хлопец:
– Дзеўка, адгадаеш тры загадкі,
Адгадаеш – вумна будзеш,
Не адгадаеш – дура будзеш.
Што бяжыць без повада, што расце без кораня,
Што гарыць без полымя?
Вада бяжыць без повада,
Камень расце без кораня.
А зара гарыць без полымя.

На Юр'я пелі, скакалі, вадзілі карагоды. Да Юр'я штоб было сена і ў дурня. У цэркві бацюшка чытае малітву.

Юр'еў дзень у нас после Пасхі. Ідзе адправа ў цэркве, бяруць стол такі невялікі, і ўсе людзі ідуць на поле свецяць жыта.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Еслі на Юр'еў дзень варона схаваецца ў жыце, значыць, ета будзе ўраджай, а еслі варона сядзе, а яно і відна, значыць, будзе бедны год, галодны.

Вот кароў выганем на пашу і б'ем: «Будзь здарова, як зямля, будзь сільна, як вада…»

Ужо слава гэтыя гаворым. Кароў гонім, бярэм кусочак сала і яйцо, даем пастуху. Ім ужо як надаюць, а там і бутылку хто прынясе.

На Юр'я свяцілі жыта на полі. Хадзіў бацюшка, і людзі ўсе сцяной ідуць, штоб ураджай быў харошы. На Юр'я кароў рана выганялі на расу. Пастухоў угашчалі хто яечкам, хто кусочак сала, хто грошы, ці бутылку там.

Кагда-та на Юр'я я ішла ў Гомель, пешкі хадзілі. Баба такая пажылая, як я цяпер, так вот, яна хадзіла з куўшынам і расу сабірала жменямі ў куўшын. А я і не знаю, чаго яна на каленках ползала, навернае, яна знала штосьці. А я етага не знаю.

***Запісана ў в. Старое Сяло***
***ад Раманьковай Вольгі Фёдараўны, 1917 г.н.,***
***студэнтамі Кітаевым А., Кавалёвым М.***

Да сонца трэба было выгнаць кароў, каб здаровыя былі. Пад парог хлява клалі яечка, як карова выйдзе, а на яечка бёрды. Пастухі забіралі кароў, а ім за гэта вынасное давалі (яечка, хлеб). А вось на Пятра мы няслі ўсе, у каго скаціна, гарлач малака, хлеба, солі стакан, а ён за гэта на ўсіх абед гатаваў, нас карміў.

На Юр'я кароў выганялі веткай ліпы, каб ніхто малако не забраў, а то жэншчаны такія ёсць, то яны могуць і забраць, каб наўрадзіць.

***Запісана ў в. Залаты Рог***
***ад Лук'яненка Вольгі Цімафееўны, 1935 г.н.,***
***студэнткай Лапіцкай В.***

На Юр'я кароў праганялі на расу. Хадзілі на поле рана ўтрам, качаліся ў жыце. Потым ужо складаліся, хто што мог. Збіраліся ў чыёй-небудзь хаце і гулялі там.

***Запісана ў в. Залаты Рог***
***ад Чайковай Клаўдзіі Цярэнцьеўны, 1930 г.н.,***
***студэнткай Глазковай М.***

Юр'я мы асоба не святкавалі, проста прыязджаў бацюшка, ставілі на жыце стол, бацюшка Богу маліўся. Карову рана ўтрам не выганялі, хаця ў другіх дзяроўнях ёсць такое: вось рана-рана, толькі як сонца выходзіць, на расу карову выганяюць, а ў нас не, нету такого, выганяем карову як заўсёды. Потым, пасля поля ідзём у клуб, гуляем, пяём часоў да двух. Ну, яшчэ на Юр'я дык бярозавым лісцем б'юць кашу, і хто болей пакладзе ў кашу,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

таго і каша. Вось як, а так болей нічога асобеннава не было ў нас на Юр'я. Пад парог нічога не закопвалі, не было ў нас такога.

***Запісана ў в. Старое Сяло***
***ад Малажэўскай Таісы Андрэеўны, 1934 г.н.***
***студэнткай Бужан А.***

Называлі мы гэты дзень – Дзень Святога Юрыя. Я шчытаю, што гэта быў нужны дзень. Скаціна ў доме ўсегда даўжна быць, таму нада ўхажываць за ёй па-ўсякаму. Што і па калдаўству (но так ніколі мы не рабілі), што і пакарміць жа нужна, і напаіць. А на Юрыя з усім пачотам адпраўлялі кароўку на поле.

Пад парог хлява закапывалі абыкнавенныя яйкі, штоб аніякая нячыстая сіла не павадзілася к кароўкі нашай.

Ухажывалі за ёй асобенна ў гэты дзень, мылі, жалелі.

На поле кароўку выганялі са словамі: "Ты ідзі-ідзі, мая каровушка, на полюшка, на травушку зялёненькую, дый вазврашчайся, калі аддахнёш, дамоў, і малачка нам прынясі поўна вядзёрка". А так па-асобнаму, як празнік, не празнавалі.

***Запісана ў в. Старое Сяло***
***ад Васільцовай Матроны Сяргееўны, 1925 г.н.,***
***студэнткай Задзірака А.***

Як прыйдзе Юр'я, дак можна кароў выпускаць. Абязацельна нада выгнаць на юраўскую расу. Іх (кароў) выганялі кнутам ці лазой. Нада, штоб каровы напіліся той расы, дак малака многа будзе. Пасля Юр'я можна ўжэ работаць на полі: араць, сеяць. Выходзілі ўсе ў поле. Абыходзілі яго.

На Юр'я не нада нікому нічога даваць і браць не нада нічога. Нельзя. Песні спявалі разныя.

***Запісана ў в. Старое Сяло***
***ад Мацюковай Ніны Данілаўны, 1930 г.н.,***
***студэнткай Пісарэнка С.***

Юр'я было 6 мая. На Юр'я ходзяць, жыта пасвяцаюць. Ходзіць па полі бацюшка, пасвяцае рунь. Кароў выганяюць рана на Юр'я, на расу.

Хто малака багата хоча, ходзіць і расу сабірае. Эта калдуны дзелаюць. Спадніцу падтыркне і ідзець па жыту з цадзілкай, што малако цэдзяць. Водзе па расе і гаворыць: «Як раса прыбывае, штоб у маёй каровы так малако прыбывала». І выкручае ў вядро, выкручае.

***Запісана ў в. Данілавічы***
***ад Дзмітрачковай Тамары Кузьмінічны, 1936 г.н.,***
***Чуяшковай Любові Кузьмінічны, 1933 г.н.,***
***студэнткамі Кушнаровай К., Булдзінай М.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

На Юр'я нельга працаваць, бо ён абіжаецца і можа што-небудзь утварыць. На Юр'я нічога не дзелаюць. Кароў выганяюць на пашу, на Юр'еву расіцу. Пастуху выносяць полудзень. А калісь яшчэ і шапталі, але я таго не ведаю.

***Запісана ў в. Неглюбка***
***ад Саломеннай Ульяны Мікалаеўны, 1932 г.н.,***
***студэнткамі Чарняўскай В., Платонавай А., Цэпавай Ю.,***
***выкладчыцай Новак В.С.***

Калі выганялі скаціну на пашу, то гаварылі: "Цёмны лес, прынімай маю скаціну – рабую шарсціну, зберягай днём пад сонцам, ноччу пад месяцам".

***Запісана ў в. Неглюбка***
***ад Барсуковай Анастасіі Апанасаўны, 1925 г.н.,***
***студэнткайі Чарняўскай В.***

На Юр'я нельзя нічога дзелаць. Пасвяцалі кароў, бацюшка прыходзіў. Пастухам выношалі сала, хлеб. Клалі касу і наверх засланку, і праз яе праганяюць кароў.

***Запісана ў в. Вялікія Нямкі***
***ад Дрыгуновай Анастасіі Канстанцінаўны, 1912 г.н.,***
***студэнткай Чарняўскай В.***

На Юр'я качаліся на расе і выганялі кароў вярбой на пашу.

***Запісана ў в. Прысно***
***ад Арцяшковай Марыі Цімафееўны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Чарняўскай В.***

Юр'я – гэта галоўны ён над усёю скацінаю. Ён тую скаціну зашчышчае. У нас на Юр'я кажуць: да Юр'я штоб сена было ў каждага дурня, а ў разумнага – да Міколы. Значыцца, да Міколы вясенняга, што ў маі.

***Запісана ў в. Свяцілавічы***
***ад Палтарацкай Ганны Фёдараўны, 1930 г.н.***
***выкладчыцай Новак В.С.,***
***студэнткай Карніеўскай Т.***

6 мая первы раз выганялі кароў, дзе зялёнае жыта. Ставілі свечку і маліліс, каб воўк скаціну ў полі не трогаў. За дзярэўняй было жыта, выносілі стол, збіралася многа людзей і дзелалі малебен.

Выганялі скаціну прутам, які на вербнае васкрасенне асвяшчалі, каб уроку (сглаза) не баялася. На вароты вешалі крапіву, каб змяя не адабрала малака ў каровы. Казалі, што ведзьма ходзіць, у кароў малако адбірае. Абрызгівалі кароў пасвяцонай вадой:

Ідзі з Богам у поле



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

І дамой прыйдзі з Богам.

***Запісана ў в .Брылёва Гомельскага р-на***
***ад Гарбузавай Марыі Яўсееўны, 1929 г.н.,***
***перасяленкі з в.Казацкія Балсуны Веткаўскага р-на***
***студэнткай Кашлаковай А.***

## Пахаванне стралы (Ўшэсце)

*Пытанні*

1 Што вы ведаеце пра абрад, які называецца "Пахаванне стралы" ("Ваджэнне сулы")?

2 Якую мясцовую назву мае гэты абрад у вашай вёсцы?

3 У які час (на Ушэсце, на Вялікдзень) выконваецца абрад "Пахаванне стралы"?

4 У чым заключаецца сутнасць гэтага абраду?

5 Як адбываецца гэты абрад? Раскажыце падрабязна, пачынаючы са збору ўдзельнікаў гэтай цырымоніі і звяршаючы выкананнем заключных карагодных песень.

6 У якой форме выконваецца карагод, прымеркаваны да абраду "Пахаванне стралы" (шэсце ўпоперак вуліцы, хуткі бег уздоўж вуліцы, кругавы карагод і інш.)?

7 Як тлумачыцца сэнс асноўных абрадавых дзеянняў, звязаных з выкананнем абраду?

8 Якія прадметныя атрыбуты выкарыстоўваюцца падчас выканання абраду "Пахаванне стралы" (галінка дрэва, яйкі, мёд, косы і граблі, капейкі і бусы, пярсцёнак, галінка каштана і інш.)?

9 Якія вы ведаеце карагодныя песні, якія суправаджаўся абрад "Пахаванне стралы"?

10 Чаму называецца менавіта так ("Пахаванне стралы", "Ваджэнне сулы") гэты абрад?

11 Які склад удзельнікаў абраду?

12 Дзе канкрэтна ў вашай мясцовасці адбываецца абрад "Пахаванне стралы"?

13 Якія тэатралізаваныя дзеянні персанажаў адбываюцца падчас выканання абраду "пахаванне стралы"?

14 Ці пераносяць у вашай мясцовасці свячу напярэдадні свята?

*Узор запісу*

Послі пасхі на шастой нядзелі, на Ушэсце, вадзілі стралу ўдзень, увечар. Па каждай вуліцы хадзілі, узяўшыся за рукі, браліся за рукі, чалавек было па трыццаць: старухі ўперадзі, маладзёж услед, дзеці бягуць ззадзі:

Павядзем стралу да па ўсім сялу,
По загуменню, ох, і я люлі, па загуменню.

Чучалу дзелалі, як бабу, на палке, насілі па дзярэўне. Тады ўжо за дзярэўняй, на полі, спальвалі, штоб мароз не марозіў.

Песні пяюць, танцуюць, у прысядкі, хто як умее.

Я па жэрдачкі шла, я па тоненькай шла,
Па тоненькай, па яловенькай.
Тонка жэрдачка гнецца, ды не ломіцца.
Харашо з мілым жыць, ды й не тошніцца.
Хоць і тошніцца, развяселіцца.
Выхадзіла малада за новыя варата,
За новыя, кляновыя, за рашоцістыя.
Выпускала сакала з правага рукава.
Ты ляці, ляці, сакол, высако і далеко.
Высако і далеко, на радзіму старану.
На радзімай старане родны бацюшка жыве.

Стралу правядуць, ужо пасля песні вясны не пелі.

***Запісана ў в.Данілавічы***
***ад Дзмітрачковай Тамары Кузьмінічны, 1936 г.н.,***
***Чуяшковай Любові Кузьмінічны, 1931 г.н.,***
***студэнткай Кушнаровай К.***

Сабіраліся ўвечары і пелі стралу. Некаторыя выносілі стол, гарэлку і зноў пелі песні. Стралу ў жыта не праводзілі. Закопвалі лялльку вясной на Ушэсце. Лялльку дзелаюць, прыбіраюць, становяцца стралой і ідуць з аднае вуліцы на другую, і так хадзілі па ўсіх вуліцах. Лялльку насілі наперадзе, яе, як цвет, прыбіралі:

Павядом стралу па ўсём сялу,
Ой, лю-ля, лю-ля, да па ўсём сялу.
Ты ляці, страла, ды ўздоўж сяла,
Гой, лю-ля, лю-ля, ды ўздоўж сяла.
І ўпала страла добру моладцу,
Ой, лю-ля, лю-ля, добру моладцу.

***Запісана ў в.Данілавічы Веткаўскага р-на***
***ад Чурбатавай Ніны Ларывонаўны, 1929 г.н.,***
***студэнткай Кушнаровай К.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

На Ушэсце – абрад пахавання стралы. Усе сабіраюцца, ідуць музыкі, танцуюць. Уперадзе – два старца, у іх потым нараджаліся. На Ўшэсце адзяюць смярцёнае адзенне, каб проста пранасіць, каб прасвяжылася. Усей гурбой ідуць у жыта, пяюць песні:

А ў том сяле пад ігрушаю
Там ляжыць цела, як папер бела.
К тому целечку не прыступішся.
Прыступілася стара бабачка,
Стара бабачка, яго мамачка.
Узяла цела да й на ручачкі,
Панясла цела а і ў цэркаўку.
Самі дзверачкі растварыліся,
Самі свечачкі запаліліся.

А ішла страла ды ўздоўж сяла,
А ўбіла страла добра моладца.
А па тому моладцу некаму плакаці:
Сястра маленька, матка старанька,
Жонка малада каля гораду.
Дзе матка плача, там рака цячэ,
Дзе сястрычанька, там крынічанька,
Дзе жонка плача, там расы няма.

Заходзяць у жыта, закапваюць грошы, цэннае, жалезнае. Платок не закапваем. Выходзяць, водзяць карагод і дадому.

***Запісана ў в. Колбаўка***
***ад Кавалёвай Еўфрасінні Паўлаўны, 1930 г.н.,***
***Новак В.С.,***
***студэнткамі Крупскай Н., Шабалінай Н.***

На Ушэсце ў жыта хадзілі. Ета было ад Пасхі на 6-й нядзелі ў чацвер. Ушэсце – ета кагда “Гасподзь ідзе на небеса, цягне жыта за валаса”. У жыце танцавалі, карагоды вадзілі, песні спявалі. Як ідзем у жыта – вясну пяём, а назад ідзем – “салаўя” вядом.

***Запісана ў в. Вялікія Нямкі***
***ад Дрыгуновай Анастасіі Канстанцінаўны, 1912 г.н.,***
***студэнткамі Чарняўскай В., Платонавай А.,***
***Цэпавай Ю., Пракаповіч І.,***
***выкладчыцай Новак В.С.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**Песня на Ўшэсце**

Стаяла белая бяроза над ракою,
Пускала белае карэнне над вадою.
Забылася белае бярозы наламаці,
Забылася свайму мілому прыказаці:
"Не пі-ка, мой міленькі, водкі-малінаўкі,
Не любі-ка, мой міленькі, дзеўкі-чарнаброўкі.
А што водка-малінаўка – яна не здаровая,
А што дзеўка-чарнаброўка – яна не вясёлая".

Запісана ў в.Вялікія Нямкі
***ад Дзярнушкінай Веры Міхайлаўны, 1927 г.н., студэнткамі Чарняўскай В., Платонавай А., Цэпавай Ю., Пракаповіч І., выкладчыцай Новак В.С.***

Гэты абрад праходзіў на Ушэсце, 6 нядзель пасля Пасхі. Дзяўчаты і хлопцы ішлі ў жыта, пры гэтым спявалі песні, вадзілі карагоды. Каля жыта хлопцы і дзеўкі рассыпаюцца. Дзяўчаты нанізаюць каралі на нітачку і хаваюць у ямачку, каб ніхто не бачыў. А хлопцы потым шукаюць. Калі ішлі назад, пелі зусім іншыя песні.

Сядзеў голуб на каморы,
А галубка на хаце.
Пытаецца сын у мацеры,
Каторую дзеўку браці.
Ці тую багатую, што валы да каровы,
Ці тую бедную, што чорныя бровы.
У багатае – валы да каровы паздыхаюць,
А ліцо белае не змяніцца,
І бровы не зліняюць.
Бяры, сыначка, тую дзяўчоначку,
Што рубашачка бела,
А людзі кажуць, і сам знаю,
Яна паследнюю надзела.
Дак бяры, сынечка, тую дзяўчоначку,
Што каралечак густа,
А людзі кажуць, і сам знаю,
У яе розуму пуста.
Бяры, сынечка, тую дзяўчоначку,
Што рубашачка чорна,
А людзі кажуць, і сам знаю,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У яе работка не спорна.

Ты мой міленькі, з кім мне гуляці?
Не гуляй-ка, красівая дзевачка,
З тымі маскалямі.
Маскалі ўсе – вары, зладзеі,
На нас ліхадзеі.
Яны ў цябе, красівая дзевачка,
А ўсё ўваравалі.
Залатыя кольцы ў цябе пазнімалі,
А цябе, красівая дзевачка,
Плакаць застаўлялі.

***Запісана ў в. Акшынка***
***ад Гусаковай Л.І., 1907 г.н.,***
***студэнткай Лютай А.,***

На другі дзень Пасхі – песні, карагоды. Ідуць і маладыя, і старыя, і ўжо гармонь іграе, а тутака песня "Мы на сена ідом":

Мы на сена ідом,
Мы на новае,
Мы на ганачкі,
На каралёвыя…–

Штоб сена радзіла. Усюды гульні такія былі. Жэншчыны ідуць па-прыбіраўшыся, была такая адзёжа празнічная, красівая. Ідуць усе кругам такім, усе бяруцца за рукі, на другой вуліцы другі круг. Патом ідуць кругом дзярэўні, а тыя – з другога боку. Ужо паўстрэчаюць адзін другога два карагоды і вродзе так біцца, хто каго пабядзіць. Крычаць: "Ай-я-яй! Мы пабядзім! Мы пабядзім…" Песня такая была:

Із-пад лесіку, лесіку цёмнага,
З-пад садзіку, з-пад зялёнага
Прыйшлі ды прыйшлі два молайца.
Два молайца вот вы холасты,
Вот вы холасты, не жанатыя,
Не жанатыя, кудравыя.
А яны ішлі да астанавіліся,
За красну дзеўку пабраніліся.
Вы не біцеся, не сварыцеся,
Аднаму каму я дастануся.

***Запісана ў в.Залаты Рог***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

***ад Сакуновай Марыі Карпаўны, 1917 г.н.,***
***студэнтамі Кітаевым А., Кавалёвым М.***

## Абрад “Пахаванне стралы”

Сама я не помню гэты абрад. Але бабка расказвала. Стралу дзелалі на Пасху. Вадзілі па дзярэўні. Браліся за рукі адзін за аднаго і ішлі ўздоўж дзярэўні, і спявалі песні.

Калі не было доўга дажджу, то хадзілі па дзярэўні і здымалі гладышкі. Калі багата іх вісела, то ўсё паздымаюць, а адну аставяць і кідалі ў калодзеж. Узрослыя кідалі.

***Запісана ў в. Рэкорд Лоеўскага р-на***
***ад Гаўрыленка Ніны Сямёнаўны, 1928 г.н.***
***(раней пражывала ў п. Пабядзіцель Лоеўскага р-на).***

Ляльку здзелаюць з барахла якога, платок завяжуць. Возьмуць, калясачкай вязуць, штоб дождж прайшоў. Вязуць ужэ ўродзе на кладбішча. У канцэ дзярэўні крэсцік стаіць, ён засцерагае дзярэўню. Бабы кросны ткуць, штоб дождж ішоў.

***Запісана ў в. Вулкан Лоеўскага р-на***
***ад Жураўскага Сяргея Адамавіча, 1910 г.н.,***
***Рагознік Марыі Сяргееўны, 1938 г.н.***
***(нарадзіліся ў п. Кірава (раней Зарэзаў) Лоеўскага р-на)***

У нас страла называлася завадка. 10 чалавек бяруцца і бягуць, бягуць, а паследняя адстае і ўпадзе.

***Запісана ў в. Гарадок Лоеўскага р-на***
***ад Якушэнкі Мікалая Сямёнавіча, 1917 г.н.,***

Нічога не рабілі, а толькі хадзілі па сялу і пелі. Гэта вясной было.

Ой, пушчу стралу
Ды па ўсяму сялу.
Ох, і я ўмею,
Ды па ўсяму сялу, у-у-у!
Упала страла
Ды на канец сяла.
Ох, і я ўмею,
Ды на канец сяла, у-у-у!
Ды ўбіла страла
Добра моладца.
Ой, і я ўмею,
Ды добра моладца.
Ой, ляжыць цела,
Як папер бела.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ніхто к целу не прыступіцца,
Ніхто к целу не прыменіцца.
Прыступілася, прымянілася
Ганна Іванаўна.
Узяла цела да на ручанькі,
Панесла цела да й да цэркаўкі.
Сама цэрква адчынілася,
Самі кніжкі зачыталіся,
Самі папы заўспяваліся.

***Запісана ў в. Крупейкі Лоеўскага р-на***
***ад Карась Аляксандры Емяльянаўны, 1914 г.н.***

Вадзілі стралу. Паўбіраюцца дзеўкі, хлопцы ў шэрэнгу, па дзерэўні вадзілі. Песні розныя спявалі. Па-за гумнамі бегалі.

***Запісана ў в. Ястрабка Лоеўскага р-на***
***ад Коўзік Ганны Рыгораўны, 1928 г.н.,***
***2005 г.***

Стралу пускалі на Благавешчанне. Хадзілі па дзярэўне і пелі песню:

Ой, пушчу стралу
Да па ўсяму сялу,
Да каля горада.

У жыта не хадзілі і ў зямлю нічога не закапвалі. Толькі песні пелі.

***Запісана ў в. Дзімамеркі Лоеўскага р-на***
***ад Ігнаценка Яўгеніі Іванаўны, 1925 г.н.***

Кагда-та правілі Ушэсце. Іменна перад етымі празнікамі насілі па дзерэвне ікону. Ушэсце празнуецца толькі в чэцвер.

На втары дзень Ушэсця немцы палілі эту дзерэвню, людзей всех гналі чэраз парцізанаў. Парцізанскі лагер быў на Зялёным востраве.

А после вайны сталі празнаваць Прачыстаю. Гналі многа самагонкі і чэраз рэчку ездзілі.

***Запісана ў в. Удалёўка Лоеўскага р-на***
***ад Герасіменка Івана Васільевіча, 1927 г.н.,***
***Герасіменка Юліі Лявонаўны, 1927 г.н.***

Вадзілася страла на Ушэсце. Збіраліся, дзелалі ляльку, клалі ў скрынку. Барышня несла скрынку, туды клалі грошы.

Як пушчу стралу
Да ўдоўж сяла.
Ты ляці, страла,
Да ўдоўж сяла.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ты ўбі, страла,
Добра молайца.
Па гэтым молайцу
Некаму плакаці.
Матка старая,
Сястра малая.
Ішлі па вуліцы і пелі:
Таня пана не ўзлюбіла,
Ды купіла атруты, атравіла,
У садочку схараніла.
Прыехала два браточкі:
– Братавая маладая,
Дзе нашага брата дзела?
А яна атвячае:
– Ён на войну паехаў…

Ляльку закапвалі ў жыце, а потым адкапвалі. Гэта дзелалі для дажджу. Ляльку хавалі і пелі песню. А калі закапвалі, то галасілі, як па мерцвяку.

***Запісана ў г. Ветка***
***ад Ермаковай Марыі Назараўны, 1925 г.н.***
***студэнткамі Цэпавай Ю., Пракаповіч І.,***
***выкладчыцай Новак В.С.***

На Ушэсце збіраліся к клубу і кала клуба. Дзелалі ляльку, яе клалі ў скрынку. Надзяваліся жанчыны ў барышню і кавалера. Людзі кідалі грошы ў скрынку, а мы ішлі і пелі.

***Запісана ў г. Ветка***
***ад Ермаковай Марыі Назараўны, 1925 г.н.***
***студэнткамі Аўчарэнка А., Бужан А.,***
***выкладчыцай Новак В.С.***

Абрад “Пахаванне стралы” мы святкавалі ў Неглюбкі, наражалі старца, рабілі ляльку, старцы ішлі з палкамі.

Старыя вымазывалі ліцо сажай і хацелі каго-небудзь стукнуць імі. Карагод ішоў асобна ад іх. Стралу пяюць, калі ідуць да жыта, а по тым ужэ стралу не спяваюць.

Як ішла страла да й удоль сяла,
Охі-ой лёлі, да й удоль сяла.
Убіла страла добра молайца,
Охі-ой лёлі, добра молайца.
Па том молайцу некаму плакаці,
Охі-ой лёлі, некамі плакаці.
Матка старэнькая, сястра маленька,
Охі-ой лёлі, сястра маленька.
Жэна молада кала горада,
Охі-ой лёлі, кала горада.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Дзе маці плача, там рака цячэ,
Охі-ой лёлі, там рака цячэ.
Дзе сястрычанька, там крынічанька,
Охі-ой лёлі, там крынічанька.
Дзе жана плакала, там расы няма,
Охі-ой лёлі, там расы няма.

Ад Спаса да Ушэсця (Ушэсце – таму, што шэсць нядзель ад Пасхі) пелі песні вясны.

У жыта закапвалі хто пугавіцу, хто платочак, хто што.

***Запісана ў г. Ветка***
***ад Рэзвяковай Марыі Піманаўны, 1937 г.н.,***
***Лімантавай Галіны Піманаўны, 1930 г.н.,***
***Новак В.С.***
***студэнтамі Крупскай Н., Шабалінай Н.,***
***Малашковай Л., Вержахоўскай В., Фяськовым С.***

На Ўшэсце стралу вадзілі. Ідуць тры-чатыры рады па вуліцы. Выбіралі старцаў, якія ішлі спераду. Старцоў рабілі для шутак. Ляльку рабілі. Цыган і цыганка ідуць, з лялькай шуцяць. Пелі песню:

Ды ідзець страла
Ды ўдоль сяла,
Ды ўдоль сяла,
Ды ўдоль вуліцы.
Ды і сустрэла страла
Добра моладца,
Па тым моладцы некаму плакаці:
Мамка старенька,
Сястра маленька,
Дзеткі дробныя, неспасобныя.

Да жыта вадзілі стралу. Там ставяць стол, выносяць хлеб-соль, карагод водзяць. Бяруць зямлю і кідаюць уверх, каб лён радзіў.

Ад Пасхі да Ушэсця пелі лёлюшкі, а потым ужо нельга было пець іх.

***Запісана ў г. Ветка***
***ад Дзюньдзікавай Праскоўі Еўдакімаўны, 1920 г.н.,***
***Новак В.С.,***
***студэнтамі Крупскай Н., Шабалінай Н.,***
***Малашковай Л., Вержахоўскай В., Фяськовым С.***

Сабіраемся ў адну хату, потым становімся ў рад на ўсю вуліцу і спяваем песні, ідом хаваць вясну. Наперадзе ідуць пан з паненкай і нясуць ляльку хаваць.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Мы па сена ідом,
Да ідом мы па новае.
Мы па новае да па зялёнае.
Падайдом пад сад
Да пад зялёненькі.
Як пад тым садам
Да людзі гаворуць,
Да выгаварваюць.
Да й брат у брата
Да й пана прося.
За пана, брацяц,
Я ні слоўца.
Ой, брат у брата
Да жану прося.
За жану, брацяц,
Галаву зрублю.
Галаву зрублю
Да як макаўку.
Да як макаўку,
Да як макаў цвет.
Па вуліцы па шырокай,
Па мураўцы па зялёнай
Бегла дзеўка-семілетка,
А за ёю стары дзедка.
– Пастой, дзеўка-семілетка,
Загадаю тры загадкі.
Адгадаеш – вумна будзеш,
Не адгадаеш – дура будзеш.
А што ж цвіце без цвету?
А што ж расце без карэння?
А што ж бяжыць без повада?
– Кавыль цвіце без цвета.
Камень расце без карэння.
Вада бяжыць без повада.
На гарэ лён, белы кужаль,
Не с кім стаць і лён убраці.
Маці скажа: “Мы з табою,
Мы з табою, з маладою”.
То не бранне, гаваранне,
Цяжолае ўздыханне.
Мілы кажа:
“Мы з табою, з маладою”.
Ой то бранне,
Вясёлае ўздыханне.
Паня пана не ўзлюбіла
Да й атруты купіла.
Да й атруты купіла,
Свайго пана атруціла,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Ды ў садочку схараніла.
Ды ў садочку схараніла,
Лілею абсадзіла.
Ты расці, мая лілея,
Покуль мілы не сатлея.
Прыехалі два гасцёчкі,
Майго мілага браточкі.
– Братавая маладая,
Дзе ж ты нашага брата дзела?
– Дзевярочкі-сакалочкі,
Ён на вайну паехаў.
– Братавая маладая,
Чаго ж коні на стаянні?
– Дзевярочкі-сакалочкі,
Ён на воліках паехаў.
– Братавая маладая,
А што ж у садзе за магіла?
– Дзевярочкі-сакалочкі,
Я дзіцяці схараніла,
Лілею абсадзіла.

Ідзём да жыта, выкапваем ямку, дзелаем хрэсцік у жыце, хаваем ляльку і пяём песню:

Песянка мая малененькая й,
Каму будзеш мілененька.
Мілененька ой ці старому
Ці маладому?
Закапаюць цябе к налецяйку.
К налецяйку
Прыеду поле араці
Ды й араці буду.
Цябе, песянка, спяваці,
Спяваці харошаю,
Вясну дажыдаці.
Закапалі ляльку і ідом дамоў.
Ты ляці, страла,
Да й удоль сяла.
Ты не бі, страла,
Добра моладца.
Па том моладцу
Да некаму плакаці.
Матка старынька,
Сястра малінька,
А дзеткі дробныя
Ды не галодныя.
Да ідзе ж мамка плача,
Там рэкі цякуць.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Дзе сястра плача,
Дык там калодзезі,
Да дзе жана плача,
Дык там расы няма.

***Запісана ў г. Ветка***
***ад Гапеевай Наталлі Трафімаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткай Дарашковай С.***

Гэты абрад прыпадае на канец вясны, прычым у ім прымаюць удзел толькі дзяўчыны. Яны збіраюцца гуртам, бяруцца за рукі і атрымліваецца цэп, падобная да стралы, але ў в.Рудня Стаўбунская яе называюць сулой. Затым ідуць у пачатак вёскі і пачынаюць вадзіць карагод вакол кожнага дома. Але гэты карагод абыходзіць толькі тыя хаты, у якіх гаспадары даюць дазвол. Дзяўчыны пляшуць, спяваюць, а потым гэты ж карагод ідзе за вёску ў жытняе поле. Там дзяўчаты разыходзяцца паасобку і ў жыце хаваюць абавязкова пярсцёнак. Схаваўшы яго, дзяўчаты вяртаюцца разам, усім гуртам у вёску. Не захаваўся амаль гэты абрад. Ён забяспечвае ахову раслін (дрэў, капусты) ад зайцоў.

***Запісана ў в. Рудня Стаўбунская***
***ад Гулевіч Тэклі Мяфодзеўны, 1900 г.н.,***
***студэнткай Гаўрыленка І.***

У нашай мясцовасці празднавалі "Хрэн" ("Страла") пасля Пасхі на шастой нядзелі ў чацвер. Спачатку дзеўкі ёлку дзелалі з сухога дзерава, дзелалі бумажныя цвяты на ёй. Потым ідом таўпой па вуліцах, нясом елку да жыта, танцуем і пяём "Хрэна":

У пастын хаджу, хрэн-рамон саджу,
У цябе, татка, халастой хаджу.
Жанісь, сыночак, жанісь, родны мой.
Я вялю цябе доч купецкую.
Ды купецкая ж не жана мая,
Не жана мая, не слуга ваша.
Ды хазяйская – то жана мая,
То жана мая, то й слуга ваша.

Пасля ў жыце ўжэ не пяём, елку ў жыта ставім. Нітачкі з хустак дзеўкі ў зямлю закапываюць, штоб жыта расло. Пелі песню:

З-пад лесіку, лесу цёмнага,
З-пад садзіка, з-пад зялёнага,
Там ішло-прайшло два малойчыка,
Яны ішлі-прайшлі астанавіліся,
З-за адну дзеўку пасварыліся.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

–Вы не біцеся, не сварыцеся,
Па-харошаму разбярыцеся,
Аднаму каму я застануся,
Ці беламу, ці румянаму,
Ці Ванюшачкі кучараваму…

Пасля ўжэ ідом на вёску, заходзім у адну хату, там стол стаіць, гарэлка. Гуляем у той хаце. Потым ідом у другую хату, там пяём, танцуем і далей пайшлі. Так і гуляем цэлы дзень.

***Запісана ў в. Шарсцін***
***ад Лосевай Веры Цімафееўны, 1918 г.н.,***
***Ганчаровай Еўдакіі Яфрэмаўны, 1919 г.н.,***
***студэнткамі Біран В., Грышчанка А., Базылевай В.***

На Ушэсце – гэта 6 нядзель гасподзь Бог ходзя па зямлі, ад Пасхі да Ушэсця, а потым падымаецца на неба. Ён паглядзеў усё, распрадзяліў і тады наказвае. На Ушэсце ідуць у жыта. Сабіраецца кампанія. Узялі сасну, ветак навешалі, ідзем і песні ўсякія пяем. Ета дзелалася, каб сагнаць нячыстую сілу, выгнаць, а загнаць Бога. штоб ураджай быў. Ёлку абносім вот так вот, кругам, вакруг жыта, тады прыходзім і пяём песні, што і дома. Пелі такую песню:

Хрэн, ты, мой хрэн,
Ліхаматры твае,
Я ж цябе паліваў,
А ж цябе асякаў.
Дай, госпадзі, ураджай,
Дай, Бог, штоб жылі,
Штоб не плакалі,
Штоб дзеткі раслі,
Штоб унукі былі,
Госпадзі, ой, хрэн, ты, мой хрэн,
Ліхаматры твае.
Да хто цябе садзіў, паліваў?
Халімон, Халімон,
Халімонава жана
У гародзе была, прыкапачывала,
Ва ўсе бакі паварачывала.

Пелі і вадзілі харавод вакол ёлкі. Заносілі ёлку ці ў пшаніцу, ці ў жыта, ці дзе ячмень пабліжэ і ўбівалі яе, штоб стаяла. Прыбіралі яе красіва. Тады ўжо прастыя песні пелі, карагод вадзілі, браліся за рукі і вакруг ёлкі хадзілі. Ёлку зарывалі ці ў пшаніцу, ці ў жыта, штоб уражай быў. А тады ўжо пелі:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Я паз тын хаджу,
Хрэн-рамон саджу,
У цябе, татка,
Халастой хаджу,
Не жанаценькі,
А жанісь, сын мой,
Жанісь, родны мой.

Вот мы сабіраліся тут, а ў тым канцы сабраліся другія. Гармонь бяруць і гармонь іграе, і песні пяюць. І навстречу ідом друг другу і сустракаемся, цалуемся ды і ўсё Бога благадарым, што мы жывы, здаровы і ўстрэціліся. Яны свае песні пяюць, а мы па-своему. Па жыту не качаліся, толькі вот еслі калдунні былі, дык дзелалі вот ету куксу. Хто й первы возьме ету куксу, той тады гаруе. Яшчэ на Ўшэсце трэба, штоб варона схавалася ў жыце, тады жыта будзе харошае.

***Запісана ў в. Шарсцін***
***ад Прусавай Валянціны Агееўны, 1923 г.н.,***
***студэнтамі Кавалёвым М., Кітаевым А.,***
***Стрэльчанка Д., Кандраценка В.***

Ішлі ўсе стралой па ўсіх вуліцах, а патом шлі  ў жыта хавацьстралу. Гармонь вядуць, граюць, скачуць. Хавалі куклу, а потым шукалі.

***Запісана ў в.Малыя Нямкі***
***ад Кірэевай Праскуты Барысаўны, 1913 г.н.,***
***Зайцавай Наталлі Кузьмінічны, 1923 г.н.,***
***Бахмат В., Кончыц Г.***

Отмечают его на Вознесенье (на 6-й нядзелі пасля Пасхі ў чацвер – Ушэсце). Да гэтага празніка сабіраюцца і пяюць песні. Жанчына перадзяваецца ў хлопца, а хлопец – у жанчыну.

Ой, шла страла да ўдоль сяла,
Ой, ой, люлі, да ўдоль сяла.
Убіла страла добра моладца.
Ой, ой, люлі, добра моладца.
Па том моладцу некаму плакаць,
Ой, ой, люлі, некаму плакаць.
Матка старэнька, сястра маленька.
Ой, ой, люлі, сястра маленька.
Жана молада возле горада.
Ой, ой, люлі, возле горада.
Ідзе матка плача – там калодзежы,
Ой, ой, люлі, там калодзежы.
Дзе сястра плача – там руч'і бягуць,
Дзе жана плача, там расы няма.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ой, ой, люлі, там расы няма.
Як ідуць па вуліцы, пяюць:
Не лятай-ка, галачка, рана на зарэ,
Люлюшкі, люлі, рана на зарэ.
Не збівай жа, галачка, ранняе расы.
Ужо ж тая росачка даўно адбіта,
Ужо ж тая дзевачка даўно прапіта,
А хлопчык Ванечка на кані едзе,
А дзевачка Светачка па ваду ідзе.
Добры вечар, Ванечка,
Што ж ты мне вязеш?
Бялілечка, Светка, бяліла табе.
Ой, спасіба, Валечка, за тваё бялілечка
За беленькае.
За тваё за славечка, за верненькае.

Выходзяць із сяла, бегаюць, хаваюцца, хто пераадзеты. Іх ловяць і б'юць, выходзяць на вуліцу і кідаюць яйкі ўгору, каб лён высокі быў. Выносяць гармошку, песні пяюць.

***Запісана ў в. Дубовы Лог***
***ад Жукавай Марыі Фядотаўны, 1925 г.н.***
***(перасяленкі з в.Ірыноўка Веткаўскага р-на)***

Самым буйным веснавым святам, якое мы адзначалі (і зараз адзначаем), было свята "Пахаванне стралы". Яго адзначалі на Ўшэсце (шосты тыдзень пасля Пасхі). Збіраемся ў канцы сяла, каля маёй хаты, тут раней крыж быў. Становімся, бяромся за рукі і водзім хараводы. Калі гэты харавод водзім, спяваем розныя песні. Вось такія.

**У крывога танка**

У крывога танка, у крывога танка
Вяду, вяду, ды й не выведу.
З дзеўкамі ў карагод пайду.
Лёлюшкі-лёлі,
З дзеўкамі ў карагод пайду.
А маленькая пташка
Сіня мора пераляцела.
Лёлюшкі-лёлі,
Сіня мора пераляцела.
А пераляцеўшы, села, зашчабятала,
Як дзеўка плакала.
Лёлюшкі-лёлі,
Як дзеўка плакала,
За старога замуж ідучы,
Маладога ўспамінаючы.
Лёлюшкі-лёлі,
Маладога ўспамінаючы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

А ты стары, як пень, як пень,
А я млада, як Вялікдзень.

**Гора, гора, дзявоцкае**

Гора, гора, дзявоцкае,
Дзеўкам гора – гуляць воля…У!
А замуж пойдзем – пагорае,
Работачкі паболяе…У!
Стане дзіця маленькае,
Стане свякруха ліхенькая…У!
Будзе біці, ругаць,
І на работу пасылаць…У!

**Пад бярозай, пад кудраваю**

Пад бярозай, пад кудраваю,
Муж жану браніў, жану бравую.
А жана мужу неўкарылася,
Свёкру-бацюшку пакланілася –
"Свёкар-бацюшка, радной,
Абарані мяне ад мужа нявернага!"

Яшчэ калі харавод водзім, гуляем у гульню. Выбіраем у круг адну жанчыну ці дзяўчыну. Вакол яе водзім харавод і пяём:

**У нашага Трыхвана**

У нашага Трыхвана
Сем дзяцей, сем сынавей.
Яны пілі, яны елі,
Друг на друга паглядзелі,
Дзелалі вось так…

Пасля гэтых слоў тая жанчына, што ў крузе, выконвала розныя двіжэнія: ці то прысядала, ці то танцавала, ці то ў ладкі плёскала, а ўсе павінны былі за ёй паўтараць. Так выканалі, зноў пайшлі харавод вадзіць і тыя самыя словы спяваць. Так і вадзілі некалькі разоў.

Пасля гульні зноў харавод вадзілі і спявалі песню, хто якую выдумае. Такую вось:

**Дзевачкі, падружачкі**

Дзевачкі, падружачкі,
Ой, якой нынче свет.
Каго не палюбіш,
І ні ў ком жа праўды нет.
Ні ў старым, ні ў малым
І ні ў міленькім дружку.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Пайду я, прайдуся
Па круценькім беражку.
Гляну я на мора –
Там караблічак плывёт.
Карабель мой новы,
На ім піцерскі ўбор.
Галубчык мой мілы,
Што смяешся нада мной?
Бог цябе накажыць
Разняшчаснаю судзьбой.

Калі ўжо гэтыя хараводы паводзім, песні паспяваем, ідзем у канец сяла. Бяромся за рукі і ідзем па ўсёй вуліцы, песню пяём:

**Мы нясом стралу да й па ўсім сялу**

Мы нясом стралу да й па ўсім сялу,
Ох і вой, люлі, да й па ўсім ся…У!
Ты ляці, страла, да й уздоўж сяла,
Ох і вой, люлі, да й уздоўж ся…У!
А ты ўбі, страла, добрага молайца,
Ох і вой, люлі, добрага мола…У!
Па том молайцу ж некаму плакаці,
Ох і вой, люлі, некаму плака…У!
Матка старэнька, сястра ж маленька,
Ох і вой, люлі, сястра мале…У!

Прыходзілі ў другі канец сяла. Там прысыпалі рукамі зямлю каля дрэў.

Пасля гэтага ўжо нельга спяваць веснавыя песні. Ужо сапраўднае лета прыходзіць. У нас у зямлю нічога не закапвалі. Толькі каля дрэў рукамі зямлю прысыпалі. Далей падзяляліся на некалькі груп, каб прайсці па ўсім вуліцам вёскі. Ішлі таксама з песнямі. Цяпер ужо пелі, хто якую захоча. Ну, вось такую пелі:

**Што ў тым лесе зашумела**

Што ў тым лесе зашумела?
Пабяжаў бы туда смела
Себе парачку іскаць.
Лет 17-ці дзяўчонку,
Ліцо бела, румяно,
Глазы чорны, як чарнок,
Брові вузкі, як шнурок.

Ці яшчэ даведаемся, які хлопец з якой дзеўкай гуляе, дык тады вось такую песню спяваем: “Што на нашай вуліцы…” А ў яе ўжо імёны хлопца, дзяўчыны паўстаўляем.

**Што на нашай вуліцы**



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Што на нашай вуліцы,
Што на нашай шырокай.
Вадзілі, вадзілі дзевачкі таночкі.
Наехаў хлопчык (імя) на коніку,
Разагнаў, разагнаў
Дзевачак па вуліцы.
Ухапіў, ухапіў дзевачку (імя) за ручку,
За правую ручку, за медзенец-палец,
За медзенец-палец, за залаты пярсцёнак.
Плеснулі, плеснулі дзевачкі ў ладошкі:
"Хто ж у нас, хто ж у нас
Рана уставаць будзе?
Хто ж у нас, хто ж у нас
Песні запяваць будзе?"

Вось так з песнямі пройдземся па ўсім вуліцам і ўсё. Ужо тады дамоў вяртаемся.

***Запісана ў в.Рудня Стаўбунская
ад Гулевіча І.К., 1916 г.н.,
Гулевіч Ф.І., 1922 г.н.,
студэнткай Гаўрыленка І.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Тройца (Сёмуха)

*Пытанні*

Якія абрадавыя дзеянні выконваліся на Тройцу?

Што вы ведаеце пра абрад кумлення?

Якія дзеянні выконвалі дзяўчаты з мэтай хутчэй выйсці замуж?

Якія дзеянні выконваліся з зелянінай? Ці прыносілі бярозкі з лесу, каб паставіць іх каля хаты? Ці прыбіралі пабудовы зелянінай (маем)? З якой мэтай?

Ці вадзілі карагоды?

Ці ездзілі (хадзілі) у госці?

Якія траецкія гульні існавалі?

Якія траецкія варожбы вы ведаеце?

Якія сёмушна-траецкія песні выконвалі?

*Узор запісу*

Абязацельна качаліс на качэлях і пелі песні, калі качаліс:

Дзяўчаткі-галубачкі,
Как будзеце вяночкі віць,
Завіце і мяне.

***Запісана ў г.п. Буда-Кашалёва***
***ад Мільячэнкі Анатоля Мікалаевіча, 1941 г.н.,***
***Мільячэнка Веры Аляксандраўны, 1946 г.н.,***
***студэнткамі Міненка В., Барадзіной В.,***
***Валошынай А., Кашлаковай А.***

На Тройцу ліпавымі веткамі ўсе абтырквалі, усю хату, ну, і хлявы тожа. Або яшчэ клюшнік рвалі, каб на палы класці (клюшнік – гэта па канавах расце такая высокая трава). А бярозай не, толькі ліпай ці клюшнікам. А потым зелень ету сабіралі і выносілі ў сарай, клалі, дзе куры нясуцца, абкладалі там, дзе бульбу закапваюць, штоб мышы не рыліся. Май жа ўсё плахое выганяў. На Тройцу не куміліся, а куміліся на Пятра.

***Запісана ў в. Бацунь***
***ад Цітарэнка Евы Іванаўны, 1927 г.н.***

Над дзверямі торкалі клён, ліпу, патом сабіралі. Еслі нет даждзя, іх брасают в речку.

***Запісана ў в. Буда-Люшаўская***
***ад Ерашовай Любові Яхімаўны, 1928 г.н.,***
***студэнткамі Фяськовай К., Варажун С., Валошынай А.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

На Троіцу свячу пераношвалі: хату прыбіралі  калінай, рабінай. Вешалі іх на варотах. Калі Троіца адойдзе, збіралі гэтыя галючкі, звязвалі іх у пучок і падвешвалі. Потым купалі ў гэтых галючках дзяцей ад розных хвароб. Троіца і Крашчэнне – прыстольныя праздзнікі, ззывалі гасцей з іншых дзеравень.

***Запісана ў в. Буда-Люшаўская***
***ад Свірыдзенка Таццяны Дзянісаўны, 1923 г.н.,***
***студэнткай Кузьмянковай Н.***

Сем нядзель ад Вялікадня – празнуюць Тройцу. Прыносяць дамоў явар, ставяць яго ў хаце, вешаюць на варотах, у двары. Даўней у нашай вёсцы на Тройцу куміліся – гатавалі настойку з парэчак, хадзілі ў госці, частавалі ёю суседзей. Дзяўчаты ішлі ў луг ці ў лес, спявалі:

Пойдзем, дзевачкі, у лужок гуляць,
У лужок гуляць, вяночкі завіваць.
Хай палюбяць нас хлопцы малады,
Хлопцы малады ды павязуць к сабе ў дамы.

Знаходзілі ў лесе бярозкі, каб яны былі малодзенькія, тонкія, звязвалі іх лентачкамі. Цераз гэтыя варота праходзіла кожная дзеўка і ламала галінкі. Гэтыя бярозавыя галінкі называюцца маем. З іх дзеўкі плялі вянкі, каб хутчэй пайсці замуж. Неслі май і дамой, ставілі ў хаце.

***Запісана ў в. Глазаўка***
***ад Дзенісенка Ніны Мітрафанаўны, 1938 г.н.,***
***студэнткай Барадзіной В. (2000 г.)***

У суботу вечарам, перад Тройцай гаспадыні вымывалі, вычышчалі, бялілі хаты, прыбіралі ў двары. Гатавалі смачную страву. Затым ехалі ў лес па веткі маладых бярозак, ліпак. Гэтымі галінкамі прыбіралі каля двара і ў двары. У хаце падлогу ўсцілалі аірам, для прыемнага паху. На сценкі хаты ўтыкалі галінкі ліпы і бярозы. Існавала павер’е, што ўсё гэта дзеянне прынясе дабро сялянскаму ўраджаю. Праз некаторы час усе галінкі здымалі і выкарыстоўвалі засушаныя галінкі ўвосень. Клалі ў сена, бульбу (калі прыкопвалі яе на зіму). На само свята паміналі на зараней прыбраных магілках сваякоў. На Тройцу ездзілі ў госці да знаёмых і сваякоў у тыя вёскі, дзе гэта свята лічылася прыстольным. Гаспадары частавалі гасцей смачнай ежай, хадзілі да сваіх кумоў, сватоў і родзічаў. Спявалі, танцавалі, дзеці гулялі ў гульні. Троцу гулялі тры дні. Два дні прымалі гасцей, а на трэці збіраліся суседзі ў гурт. Неслі з хат, што ў каго засталося ад святочнай ежы, і ўсе разам праводзілі Тройцу. Пелі абавязкова траецкую песню:

Гасподня Тройца весяліць молайца,
Прысвятая Тройца!
На зелена свята жывіце багата,
Прысвятая Тройца!

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Да стаўце дубочкі, каб шчаслівыя дочкі,
Прысвятая Тройца!
Да стаўце бярозкі, каб не лілі слёзкі,
Прысвятая Тройца!
Да сцяліце ліпу Госпаду на ўцеху,
Прысвятая Тройца!

***Запісана ў в. Губічы***
***ад Касцючэнка М.П., 1934 г.н.,***
***студэнткай Ламанос А.***

На Тройцу тры дні гулялі, нічога не рабілі. Толькі некаторыя бабы, якія ведалі, збіралі травы лячэбныя. Перад Тройцай упрыгожвалі хату зелянню.

***Запісана ў в. Мікалаеўка***
***ад Мацюшэнка Марыі,***
***студэнткай Мацюшэнка А. (2001 г.)***

Тройца была на 50-ты дзень пасля Пасхі. З клёна насілі галюкі, якія называліся “май”. На вокны іх торкалі, торкалі ў сена ад грому, у хлеў ад нячыстай сілы, палілі на выгане. На Тройцу куміліся. Сабіраліся ўсе на дварэ адным і складаліся: хто тарэлку, хто чашку, хто сала, хто хлеб і г.д., а патом пелі песні і гулялі.

* * *

П’юць кумачкі-галубачкі,
Мяне моладу з сабой не завуць,
А хоць і пазавуць, дык я не пайду,
А хоць пайду, не буду піць,
А еслі нап’юся, не павалюся,
А хоць і павалюся, устану і пайду,
Устану і пайду к новаму двару,
К новаму двару, к татачку свайму.
У майго татачкі растуць красачкі,
Растуць красачкі, усе нягодачкі,
Нашы дзевачкі – самаволачкі.
Дзе мёд пачуюць, там ноч начуюць,
Дзе гарэлку – там нядзельку.

***Запісана ў в. Патапаўка***
***ад Дземянковай Надзеі Парфёнаўны, 1924 г.н.,***
***студэнткай Герцавай Т. (2002 г.)***

На Тройцу ліпу, клён (ва Уваравічах), бярозу (на Слонімшчыне) вешалі над дзвярыма, вокнамі, варотамі. Асінавыя веткі станавілі на варотах, потым забівалі іх пад дзвярамі хлява, каб карова праходзіла цераз іх і ногі не балелі.

***Запісана ў г.п. Уваравічы***
***ад Свярдловай Кацярыны Сямёнаўны, 1932 г.н.,***
***студэнткай Свярдловай К.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тройца, Тройца, Святая Багародзіца,
Пасею я жыта, ды няхай зародзіць.
Пасею я жыта, пасею пшаніцу,
Зарадзі, Божа, усяку пашніцу.
Што зародзіць – то для майго бацюхны,
Што не зародзіць – то для майго свёкара,
Саладок мядок – то для маёй маменькі,
А чарка гарэлка – то для маёй свякоркі.

***Запісана ў в. Чабатовічы***
***ад Шаўчэнка Алены Паўлаўны, 1961 г.н.,***
***студэнткай Якаўлевай А. (2005 г.)***

Свята Тройца называецца Пяцідзесятніцай таму, што явленіе Святога Духа на Апосталаў было ў пяцідзесяты дзень па Вялікадню. Гэта трайная радасць. Гэта Бог Ацец, Бог Сын, Бог Святы Дух. Тры дні святкавалі гэта свята. Па вёсцы ў нас усягда прыбіралі хату, хлявы ў веткі зелені і называлі маем. Патом гэтыя голлі клалі ў капцы, калі закопвалі на зіму бульбу, і гаварылі: “Мышы, мышы, грызіце май, а май дабро не чапай”. У гэты дзень прыбіралі ў кляновае адзенне і дзелалі такі ж вянок самай прыгожай дзеўкі. Яе называлі “куст” і вадзілі вакруг яе харавод, пелі песні. Удзельнічалі адны незамужнія дзеўкі. Гэта адбывалася ў лесе каля луга. Дзеўкі выбіралі дзве маладыя бярозы і сплятали вярхушкі як вянок, арку. Пад ёй праходзілі па парадку (колькі каму год, ад старэйшай) і пелі песні. У нядзелю нада была развіць гэты вянок, бо бярозы маглі праклясці дзеўку, якая яго завівала, і яна магла памерці. У гэты дзень дзеўкі гадалі на сваю судзьбу. Знімалі з галавы вянок і кідалі яго ў ваду, загадваючы:

Вянок, вянок,
Мой куманёк,
Плыві, плыві,
Судзьбу знайдзі.

Калі вянок плыў, то дзеўка будзе ў пары, калі не плыў, то яе ждала скорая смерць.

***Запісана ў п. Чарняціна***
***ад Удодавай Ганны Сафронаўны, 1921 г.н.,***
***студэнткай Герцавай Т. (2002 г.)***

На Троіцу кумяцца (кумы), выезжаюць за дзярэўню. Гуляюць, ставяць веткі зелені.

***Запісана ў в. Шарыбаўка***
***ад Гаевай Марыі Цімафееўны, 1958 г.н.,***
***студэнткамі Азарэвіч В., Карлікавай К., Смірновай А.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Абязацельна качаліс на качэлях і пелі песні, калі качаліс:

Дзяўчаткі-галубачкі,
Как будзеце вяночкі віць,
Завіце і мяне.

***Запісана ў в. Глазаўка***
***ад Мільячэнкі Анатоля Мікалаевіча, 1941 г.н.,***
***Мільячэнка Веры Александраўны, 1946 г.н.,***
***студэнткамі Міненка В., Барадзіной В.,***
***Валошынай А., Кашлаковай А.***

На скрыжаванні 4-х дарог найці падарожнік. Палкай прыкмеціць. А ноччу дзеўкам ад хлопцаў схавацца – шукаць падарожнік. Яго вырывалі зубамі. Прыгаворвалі: "Падарожнік,. Падарожнік, ты расцеш каля дарогі, бачыш старога і малога, не бачыў ты майго мілога?" Потым яго хавалі ў рукаў мужской сарочкі. Пад утра сасніцца сужаны.

***Запісана ў в. Сінічына***
***ад Козыравай Любові Ягораўны, 1932 г.н.,***
***студэнткамі Міненка В., Барадзіной В., Кашлаковай А.***

Троіца. Шастая нядзеля пасля Пасхі. Ета сама такі празнік, да якога гатовіліся. Гасцей пріглашалі з другіх дзеревень, усіх родственнікаў і 3 дні тады гарэлку пілі.

Сабіраліс усе кучамі, ішлі талпой. Раньшэ інцерэсна была. Абезацельна нада была лісця клёна нарваць, паўтарквяць па вуглах, на вокнах. Вон явар у нас расце. Яго ставяць на вокны, на іконы, у каго ё. Нада было ў цэркаў зайсці. Сейчас ходзяць, калі ё ўрэмя. Старэйшыя ходзяць, а маладзёж – не, толькі на Паску, а так яе не загнаць туда.

***Запісана ў в. Навасёлкі***
***ад Козыравай Валянціны Васільеўны, 1955 г.н.,***
***студэнткамі Урбан В., Горбач М.,***
***Галавачовай М., Хадуньковай Н.***

Тройца – эта празнік кумаўёў. Кумяцца на Тройцу. Сабіраюцца хто каму дораг. У каждым дварэ празнік. Раньшэ так хадзілі: сёння ў мяне пагуляем, тады, бывала, к куме маёй пойдзем. Ці выносім сталы агулам, сабіраемся суседзі, усё, што ў каго ёсць, зношваем. І тады ўжо гулянне, песні, танцы, гармошка. На Тройцу кляны ссякалі, на вароты і ў хаты вешаем.

Павер'е было: еслі на Тройцу ветку ў хату ўнёс, на сценку пацапіў, еслі за суткі гэты ліст высахне, значыць, будзе лета жаркае і сухое. А другі раз тры дні ён зялёны, як паставілі, так і стаіць, гэта значыць, што лета сырое

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

будзе, дажджлівае. На Тройцу гулянкі ўсякія былі. У лес хадзілі гуляць. Песні ўсякія пелі.

*Запісана ў в. Данілавічы*
*ад Дзмітрачковай Тамары Кузьмінічны, 1936 г.н.,*
*Чуяшковай Любові Кузьмінічны, 1933 г.н.,*
*студэнткамі Кушнаровай К., Булдзінай М.*

Ну, Троіца – кумушкі, сядьмая нядзеля ад Пасхі. На етыя кумушкі сабіраюцца маладзёж, тожа гуляюць. Патом качэлі вешаюць, на качэлях гуляюць. Ламаюць ветачкі клёну і перад Троіцай, не на Троіцу, а перад Троіцай. Еслі ветачка клёну завяла за суткі, значыцца, лета будзе сухое, а еслі не завяла – будзе дажджлівае. Я іх навешала, яны і сейчас тарчаць. На кумушкі пелі песні, што і абычна, на качэлях качаліся.

*Запісана ў в. Шарсцін*
*ад Ганчаровай Аляксандры Аляксандраўны, 1929 г.н.,*
*Трусавай Валянціны Агееўны, 1923 г.н.,*
*студэнткай Супрун Н.*

У нас на Троіцу мала гулялі. Да гэтага дня кожная дзеўка абязацельна шыла новае плацце. Калі ўсе сабяромся, то разглядаем нарад, кожная хоча красівей быць. Усе збіраліся, брали хто якую яду і ішлі ў лес. Тут выбіралі паляну, дзе ягады і грыбы, як пара. Хлопцы касцёр клалі, а дзеўкі пелі, танцавалі, карагод вялі. А спачатку нада было разрашэнне ў ляснога спрасіць, каб разрашыў у лесе пабыць, патанцаваць. Яго адорвалі ежай, пад дрэвы клалі. Як цямнела, пачыналі гуляць. Кулдыкаліся цераз галаву, хто як можа. Усе смяяліся. Патом рэку гукалі, слухалі, што адгукалася. Пелі розныя песні, якія толькі ведалі, і хлопцы пелі. Патом хлопцы пачыналі нас пугаць рознымі страхамі пра русалак, лешага, дамавіка.

Я русалак баялася, мяне ёй часта мама пугала, гаварыла, што прыдзе русалка і забярэ мяне. Людзі гаварылі, што ў нас у садзе жыве яна, таму можа ноччы прыйці, во я і баялася.

Калі пачынала ўставаць сонца, усе ішлі дамой.

*Запісана ў в. Залаты Рог*
*ад Лук’яненка Вольгі Цімафееўны, 1935 г.н.,*
*студэнткай Лапіцкай В.*

На Троіцу ставілі на вокны па тры яверы. А шчэ ліпу абязацельна на вокны вешалі. На другой дзень ужо складаліся, хто яйка, хто сала, хто муку. Так і рабілі. Стол рабілі для ўсіх, хараводы вадзілі.

*Запісана ў в. Залаты Рог*
*ад Чайковай Клаўдзіі Цярэнцьеўны, 1930 г.н.,*
*студэнткай Глазковай М.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

На Троіцу хадзілі ў лес, сабіралі ветачкі, шышачкі, цветочкі. Патом неслі эта всё ў цэркаў, сваціілі. Патом прыхадзілі дамой і вешалі перад парогам, вездзе ў хаце, над кравацямі, штобы ад злых духаў берагчыся. Гатовілі і стол таксама ж, як і на ўсе празнікі, грыбочкі там, гуркі, картофлю, пірагі, бутылачку.

У нас как-та даўно жанчына адна не прыбрала хату зелянінаю, дак патом доўга балела, і можа б дажай памерла, еслі б баба-загаворшчыца не прышла.

Не куміліся і бярозак не завівалі, проста сабіраліся ўсёй маладзёжжу з гармонікам, пелі і танцавалі, гулялі ў розныя гульні да ўпаду – аж галава кругам ішла. Не, у той час усё было не так. Сейчас неінцярэсна: абы напіцца, накурыцца. А мы пашці і не пілі, курылі адныя хлопцы і то не ўсе. І было так добра, весела, і ёсць, што ўспомніць.

*Запісана ў в. Старое Сяло*
*ад Васільцовай Матроны Сяргееўны, 1925 г.н.,*
*студэнткай Задзірака А.*

После Юр'ева дня на сёмай нядзелі ў нас Троіца. Вот празнавалі Троіцу, у людзей празнуюць у васкрэсенне, а ў нас празнуюць у паня-дзельнік. Вот едзем мы на луг і рвем явар, многа яго прывозім і ў цэркву.

Дама ўкрашалі на Троіцу ліпай, «божым дрэвам», і клёнам, і яварам. Ліпу ірвуць для шчасця, здароўя. Толькі етым і ўкрашалі хаты і сараі, штоб мы здаровыя былі, штоб здаровая скаціна была, штоб ніякая гадасць у сараі не велася. Ёсць ласічкі, такія, як кацяткі, так тады па карове яны бегаюць, ды карова пацея. Так, як выганяеш, яна ўся мокрая, ета ласічкі. А як ужо ета ложыш у сараі, каб яна не вялася.

Кумілісь, сабіраемся мужчыны з жэншчынамі, а дзеткі ўжо сабе. Я тамака прынясу яечка, мукі трошкі, смятанкі, так робяць другая, трэцяя. У адной хаце сабіраліся. Тыя сабе, тыя сабе, чуць не ў кожнай хаце. Ну ўжо пеем, п'ём, закусваем – гэта ў складчыну гуляем.

На Троіцу ў цэркву хадзілі, маліліся, хадзілі рваць явар, ліпу, украшалі дамы. На вуліцы, на вокны ліпу набівалі, а хату насцілалі яварам етым.

Куміліся на Троіцу. І дзевушкі маладыя, і жанчыны, і дзеці складаліся. Кагда-та мамка дасць яец, смятаны і пойдзем ў адзін двор. Там п'ём, ядзім, там танцы, гармоні іграюць. Тады была маладзёж, што вуліцы трашчалі. Песні пелі, якія хто знаў.

Было ў нас святое месца – Капліца, дзе зараз мост. І ў яе дужа верылі, там стаяў хрэст, на ім ікона і рушнічок. Яшчэ мая бабушка расказвала, калі была «Дзесятуха», дзесятая нядзеля ад Пасхі, прыезджалі, прыходзілі з усёй Гомельскай вобласці лячыцца. Тамака была крыніца і чыстая такая вада была. Вот гавораць, звязвалі вяроўкі і прывязвалі камень і не дасталі дна. Так вот прыезжалі вочы лячыць це людзі, якія страдалі глазамі.

Там збіраліся людзі, каб палячыцца, а яе зараўнялі, асушылі балота, дык етым бульдозерам закапалі і яе няма.

*Запісана ў в.Старае Сяло*
*ад Раманьковай Вольгі Фёдараўны, 1917 г.н.,*
*студэнтамі Кітаевым А., Кавалёвым М.*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Праводзіны русалкі

*Пытанні*
Хто выконвае ролю русалкі?
Якое ў яе было ўбранне?
Адкуль і куды вялі русалку?
Хто ў гэтым удзельнічаў?
Ці наладжвалі гульню ў русалку?
Куды яе вялі?
Ці шукалі русалку?
Дзе яна хавалася?
Чаму русалку трэба было праводзіць?
Хто такія русалкі, паводле народных павер'яў?

*Узор запісу*

## Праводзіны русалкі

Мы вадзілі русалку. Сабіраемся ўдзень, дзелаем вянкі. Дзелалі па тры вянкі: адзін вянок лажылі на капусту, а другі – пускалі на воду, трэці адзявалі на галаву і ўжо вадзілі русалку. Завядом у жыта, дзе та жыта, а бывае, што і далёка, бывае за 2 кіламетры. Панясом туды, а мы ж не знаем, кажуць, што там русалка сядзіць у жыце. Мы яе не бачылі. Да жыта хто дабег, а хто не дабег, наробім віску, пашвыраем тыя вянкі ў жыта і назад ходу. Бяжым, вішчым, а хлопцы вяроўкі пабяруць, вуліцу паперапінаюць, а мы ўжо бяжым, хто зачэпіцца за тую вяроўку, падаем, але ўсё роўна бяжым. А як жа русалку тую праводзім, дак ідом жа туда яшчэ з песняю, пяём:

Завяду русалку за гору,
А сама пайду спаць у камору.

Гэта ў нас вот такая песня була. А назад ужо бягом. Хлопцы ж знаюць, што мы туды пайшлі. Адны дзеўкі ходзяць, хлопцы не ідуць. Ды яны вось такое робяць.

***Запісана ў в. Негаўка***
***ад Мартыненка Марыі Сцяпанаўны, 1929 г.н.***
***(перасяленка з в.Ясяні Брагінскага р-на),***
***студэнткай Дзедзенка М. (2004 г.)***

Там русалкі ў жыце
Зялёным сядзелі,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Рана-рана
Зялёным сядзелі
А мой каласочак,
Як яварочак,
Рана-рана
Як яварочак.
А мая жыцінка
Як праскурачка,
Рана-рана,
Як праскурачка:
У печцы – піражком,
На стале – калачыкам,
Рана-рана
На стале – калачыкам.

***Запісана ў в. Сялец***
***ад Сцепаненка Марыі Кірылаўны, 1926 г.н.,***
***студэнткай Малчанавай М. (1997 г.)***

Калісь праводзілі русалак у русальны дзень так: дзеўкі плялі з бярозы вянкі, неслі іх на кладбішча і пелі:

Сядзела русалка
На белай бярозе.
Ой, рана, рана,
На белай бярозе.

А яна сядзела
Ды лета пытала.
Ой, рана, рана,
Ды лета пытала.

Ды лета пытала,
Зіму не ўгадала.
Ой, рана, рана,
Зіму не ўгадала.

А скажыце, хлопцы,
А хто каго любіць.
Ой, рана, рана,
А хто каго любіць.

А хлопчык кажа:
"Я дзевачку люблю".
Ой, рана, рана,
Я дзевачку люблю.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Я дзевачку люблю,
Ды за сябе вазьму.
Ой, рана, рана,
За сябе вазьму.

На кладбішчы, ноччу яны білі етымі вянкамі аб красты і казалі:

Мы да вас прышлі, вянкі прыняслі.
Із белай бярозы, то нашыя слёзы,
Мы па крастах вянкамі пастукаем,
Да русалак папужаем.
Ідзі, русалка, у цёмны лес, за многа вёрст,
Каб назад не прышла і нам зло не прынесла.

А тады беглі дадому, надзявалі вянкі на капусту, каб качаны былі вялікімі. А хлопцы пахаваюцца ў гумно і ждуць, калі дзеўкі нясуць вянкі дадому, паймаюць якую дзеўку і шлакочуць. Так пужалі нас русалкамі.

***Запісана ў в.Шырокае***
***ад Данюк Варвары Яўхімаўны, 1930 г.н.,***
***студэнткай Кірпічовай І. (2004 г.)***

Калісь праводзілі русалак у русальны дзень так: дзеўкі плялі з бярозы вянкі, неслі іх на кладбішча і пелі.

Сядзела русалка на белай бярозе,
Ой, рана, рана на белай бярозе.
А яна сядзела ды лета пытала,
Ой, рана, рана ды лета пытала.
Ды лета пытала, зіму не ўгадала,
Ой, рана, рана зіму не ўгадала.
А скажыце, хлопцы, а хто каго любіць?
Ой, рана, рана, а хто каго любіць?
А хлопчык кажа: я дзевачку люблю.
Ой, рана, рана я дзевачку люблю.
Я дзевачку люблю, ды сябе вазьму,
Ой, рана, рана, за сябе вазьму.

На кладбішчы ноччу яны білі етымі вянкамі аб красты і казалі:

Мы да вас прышлі, вянкі прыняслі.
Із белай бярозы – то нашыя слёзы,
Мы па крастах вянкамі пастукаем,
Да русалку папужаем.
Ідзі, русалка, у цёмны лес, за многа вёрст,
Каб назад не прышла і нам зло не прынесла.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

А тады беглі дадому, надзявалі вянкі на капусту, каб качаны былі вялікімі. А хлопцы пахаваюцца ў гумно і ждуць, калі дзеўкі нясуць вянкі дадому, паймаюць якую-небудзь дзеўку і шлакочуць. Так пужалі нас русалкамі.

***Запісана ў в. Шырокае***
***ад Юркевіч Нілы Мікалаеўны, 1928 г.н.***
***(персяленка з в. Новая Гута),***
***студэнткай Кірпічовай І. (2004 г.)***

Вадзілі карагоды, пелі песні:

На гранай нядзелі русалкі сядзелі,
Ой, рана, рана, русалкі сядзелі.
Русалкі сядзелі, на Бога глядзелі.
А ў Бога дарога торная, шырокая,
Торная, шырокая, ад Бога далёкая.
А на той дарозе зяць да цёшчы едзе,
Зяць да цёшчы едзе з яравой свячою.
Ой, рана, рана, з яравой свячою.
З яравой свячою, з маладой жаною,
Ой, рана, рана, з маладой жаною.

***Запісана ў в.Стаўбун***
***ад Чуяшовай Галіны Фёдараўны, 1930 г.н.,***
***студэнткай Трухановіч Л.***

**А на грядной нядзелі…**

А на грядной нядзелі
Русалкі сядзелі.
Эй, рана, рана,
Русалкі сядзелі…У!

Русалкі сядзелі,
На дзевак глядзелі.
Эй, рана, рана,
На дзевак глядзелі…У!

Дзевачкі ды сястрычкі,
Падайця вадзічкі.
Эй, рана, рана
Падайця вадз…У!

Падайця ж вадзічкі
З халоднай крынічкі.
Эй, рана, рана,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

З халоднай крыні..У!

Залётная пташка,
Ты ляці да Бога.
Эй, рана, рана,
Ты ляці да Бо…У!

Паслухай-ка, пташка,
Што там Бог гаворя.
Эй, рана, рана,
Што там гаво…У!

Бог гаворя:
«Буду піва варіць,
буду сына жаніць.
Эй, рана, рана,
Буду сына жані…У!

Буду сына жаніць
Ай і дочку браці.
Эй, рана, рана,
Ай і дочку бра…У!

Толькі ж Бог із-за горкі,
Дак Ілья ў ладонькі.
Эй, рана, рана,
Дак Ілья ў ладо…У!

Дак Ілья ў ладонькі,
Ні дал свае донькі,
Эй, рана, рана,
Ні дал свае донь…У!

***Запісана ў 1997 г. у в.Янова***
***ад Талсцянковай Еўдакіі Іванаўны, 1929 г.н.,***
***студэнтам Рыдкіным Ю.***

Кала рэчкі сустракаліся, палілі кастры. Кала агня вадзілі карагоды. Дзеўкі стаялі і пелі песні, плялі вянкі.

На граной нядзелі
Русалкі ў жыце сядзелі.
Русалкі ў жыце сядзелі,
Ды й на дзевак глядзелі.
– Ух вы, дзевачкі-сястрычкі,
Падайце вады з крыніцы,
Надаела мне стаяці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

І калоссямі махаці,
Вазьміце сярпочкі
І сажніце каласочкі.
Сажніце каласочкі
І пакладзіце ў снапочкі.

Плялі вянкі і кідалі ў рэчку. Чый вянок патоне, тая замуж пойдзе, пелі вясну.

***Запісана ў г.Ветка***
***ад Ермаковай Марыі Назараўны, 1925 г.н.***
***студэнткамі Аўчарэнка А., Бужан А.,***
***выкладчыцай Новак В.С.***

Быў абрад "Праводзіны русалкі". А ніхто яе не выконваў, гэта толькі гаворка такая была. А праводзілі яе 7 ліпеня ў жыце. Праводзілі яе таму, што была русальная нядзеля. Яшчэ на гэтай нядзеле не трэба было спаць, бо, казалі старыя, што ўвесь год праспіш.

***Запісана ў в. Аздзеліна Гомельскага р-на***
***ад Санько Вольгі Маркаўны, 1941 г.н.,***
***перасяленкі з в. Нудзічы Брагінскага р-на,***
***студэнткай Буйневіч В. (2005 г.)***

Русалку вадзілі перад Ражаством Іанна Хрысціцеля (6 юля). У полі дзеўкі рвалі цвяты і етымі цвятамі прыбіралі адну з дзевак. Звалі к сабе дзяцей, якія перадзяваліся ў цыганак, і ўсе яны ішлі па сялу. Малыя дзеці, перадзетыя цыганкамі, з крапівай у руках, бегалі ад адной прызбы да другой, на якіх сядзелі бабы і паказвалі ім русалку. Малыя дзеці маглі таксама ім гадаць. Бабы, паглядзеўшы русалку ілі паслухаўшы гаданні, адорвалі іх. Калі не адорвалі, то дзеці маглі паджыгаць іх крапівай. Усё ета было ўвечары, пасля чарады. Бабы, калі ішлі дадому спаць, вешалі крапіву на ручку ў хвортцы ілі на заборы. Абязацельна вешалі крапіву на хлеў і дзверы ў хлеў, дзе была карова. Думалі, што ў етую ноч ходзіць ведзьма і доіць карову ілі што-небудзь паддзелуе. А крапіва яе джыгала, і яна ўцякала.

***Запісана ў в.Гадзічава Гомельскага р-на***
***ад Басавай Таццяны Іванаўны, 1934 г.н.,***
***студэнткай Пашчанка Г. (2005 г.)***

Перад жнівом збіраемся ўместо, жэншчыны. Дак мы ўжо ідзем і спеваем, шчэ й венкі поплетам. Себе на голову надзенем. Мы ідом да броду, да воды і спеваем:

Проведом русалку, проведом,
Дай осінкою заломнём.
Поведу русалку до броду,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Сама вернуся до дому.
Проведу русалку ў цёмны бор,
Сама вернуся в таткаў двор.
Проведу русалку до межы,
Сама вернуся до дзежы.
Вам, русалочкі, веночкі,
А нам, молодым, серпочкі.
Вам, русалочкі, у земле спаць,
А нам, молодым, жыто жаць.

І тогда вжэ эці венкі кідаем і варочаемся назад.

***Запісана ў в. Даўгалессе Гомельскага р-на***
***ад Антоненка Вольгі Мінічны, 1927 г.н.***
***(пераехала з в. Дзёрлавічы Нараўлянскага р-на),***
***студэнткамі Мендзелевай Т., Ачарэт А. (2006 г.)***

Русалку выбіралі дзеўку маторную. Косы ёй распусцяць, адзежу здымуць, на плечы толькі андарак накінуць. І плятуцб вянок з васількоў, хмелю, зорачак. Вянок вялікі. Плесці абавязкова павінны ўсе. Надзенуць русалцы вянок і вядуць у жыта, і спяваюць, і барабаняць у дошчэчкі, у заслонкі, і агонь паляць. Прывядуць русалку да поля і піхнуць у жыта. Вянок зрываюць, андарак разрываюць і бягуць уцякаць. А яна, голая, за імі ў далоні плешча. Правёўшы русалку ў жыта, дзеўкі вярталіся на месца, дзе плялі вянкі, спявалі песні, вадзілі карагоды. Усе дзевачкі былі ў вянках. Свае вянкі дзяўчаты кідалі ў жыта або ўцякалі з імі дахаты і кідалі на добрыя гуркі, капусту, бульбу ў свае агароды. А калі кідалі вянкі ў жыта (як мага далей), беглі назад у вёску, каб русалка не дагнала і не заслакатала да смерці або не зацягнула ў раку. На наступны дзень кожная дзяўчына ідзе зноў да жыта, шукае там свой вянок і нясе яго на гарод. Там яна разрывае яго і абсыпае грады. Ад гэтага на капусце не бывае чарвякоў.

***Запісана ў в. Глыбоцкае Гомельскага р-на***
***ад Крукавай Тацяны Іванаўны, 1931 г.н.***
***(нарадзілася ў в.Жураўлёўка Гомельскага р-на)***
***студэнткай Аўхуцкай С. (2001 г.)***

Русальны тыдзень наступаў адразу пасля Тройцы. Дзяўчыны плялі кожная сабе вянок. Адзявалі яго на галаву. А затым выбіралі самую смелую дзяўчыну. Ёй распускалі валасы, здымалі адзёжу, надзявалм толькі адзін андарак.

Сплятылі вянок з хмелю, васількоў. Плялі ўсе дзяўчаты, вянок атрымліваўся вялікі, яго адзявалі дзяўчыне на галаву і вялі ў жыта.

Спявалі песні, барабанілі ў засланку з печы. Піхнуць дзяўчыну ў жыта, андарак зрываюць і бягуць уцякаць. А яна голая за імі даганяць! Плешча ў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ладкі і громка рагочыць. А дзяўчаты ўцякаюць і кожная свой вянок з галавы здымае і як мага далей у жыта кідае.

На наступны дзень ідуць шукаць свае вянкі і нясуць на агарод. Разрываюць іх там і абсыпаюць грады, каб на капусце не было чарвякоў.

Прывяду русалку, прывяду,
Да й асінкаю заламлю.
Прывяду русалку да бору,
А сама вярнуся да дому.
Прывяду русалку ў шчыры бор,
А сама вярнуся ў таткаў двор.
Вам, русалачкі, вяночкі,
А нам, маладым, сярпочкі.
Вам, русалачкі, у зямлі спаць,
А нам, маладым, жыта жаць.

Хлопцы гоняцца за русалкай па жыце, пакуль яна не ўцячэ ад іх у лес. Яны спяваюць:
Прывяду русалку ў лясок,
Няхай яе там з'есць воўк.

Старыя людзі вельмі баяліся русалак, бо яны маглі зацягнуць у лес ці заказытаць да смерці.

***Запісана ў в. Краснае Гомельскага р-на***
***ад Шкляровай Антаніны Фёдараўны, 1930 г.н.,***
***студэнткайФраловай А. ( 2001 г.)***

Русалкай выбіралі самую прыгожую дзяўчыну, абязацельна з доўгімі касамі. Русалку ўпрыгожвалі вянкамі, упляталі ў косы кветкі, з розных ветак і лісцяў рабілі нешта падобнае на плацце.

Русалку выводзілі за вёску ў поле і кідалі ў жыта, а астальныя дзяўчаты разбягаліся хто куды. Русалка іх даганяе, якую паймае, слакоча і ў жыта цягне.

Пасля гэтай гульні русалка хавалася ў жыта. Дзеўкі яе шукалі, а пасля з песнямі вялі яе ў вёску:

Вяду русалачку ў чыста поле,
А патом у клецьґ, а патом дамой.

Прыводзілі русалку к ёй у хату і там гасцявалі. Калі разыходзіліся па хатам, кожная з дзяўчат шла на гарод і адзявала свой вянок на капусту, каб год быў не пусты.

***Запісана ў в. Макаўе Гомельскага р-на***
***ад Маісеенка Праскоўі Рыгораўны, 1920 г.н.***
***(перасяленка з в. Глухавічы Брагінскага р-на),***
***студэнткай Бажковай С. (2006 г.)***



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Збіраюцца хлопцы і дзеўкі. Выбіраюць самую прыгожую дзеўку і наражаюць у кветкі. Ета і была русалка. Водзяць вакруг яе хараводы, пяюць песні, а патом вядуць у поле, прыгаворваючы:

Павяду русалачку ў лес,
Няхай яе там воўк заесць.
Павяду ў чыста поле,
Хай яна там лён паполе.

Прыводзілі яе ў поле і кідалі ў жыта, а самі хаваліся. Кожны з іх хацеў забраць русальчын вянок, каб адзець яго на капусту, штоб быў добры ўраджай.

***Запісана ў в. Макаўе Гомельскага р-на***
***ад Сяргейчык Марыі Мікалаеўны, 1936 г.н.,***
***студэнткай Бажковай С.В. (2006 г.)***

А як ішлі ў зажон, зажынаць жыта перад Іванам, дзелаюць русалку такую, абкладаюць саломай, ну, там абы чым, трапкамі ўсякімі, і ідуць ужо, і пяюць, і крычаць, і русалку тую вядуць, і выводзяць за сяло тую русалку, і паляць яе, і розныя песні пелі.

***Запісана ў в. Маркавічы Гомельскага р-на***
***ад Юравай Анастасіі Яфімаўна, 1922 г.н.,***
***студэнткамі Яськовай Т., Парашчанка С. (2006 г.)***

Днём мы не спалі і не купаліся, бо нельзя было, таму што русалкі дровы возіць будут, так гаварылася.

Я малая была, зайшлі туда да возера. І гэты зайшлі да етае возера і пабрылі па етыя рыбалкі, па яечкі. Із вады выскаквает жэншчыны, дзевушка голая, і вот такія косы (паказвае па пояс). Яна вот так па пояс выскачыла і вот, как шчас помню, толькі рукі вот так вот і: “У-у-у”, - крычыць і рукі падняла і захавалася. І тады другі раз і зноў так, і трэці, і тады да нас дайшло, ну, гаворць, што русалкі етыя зашчакочваюць людзей, да нас дайшло, што гэта русальны тыдзень і сягодня мы далжны былі русалкі праводзіць. І мы як драпнулі, як прыбеглі дадому і шчаўлю ацураліся, і ўсяго.

Ну, а русалку праводзіць у нас сабіраліся жэншчыны, маладзёж сабіраецца. Плялі вянкі з дуба і з етае, бярозы, і з асіны. Пелі песні старыя, тыя, хто помніў, ну, старэйшыя, зразумела. Праводзілі русалку за дзярэўню. Памятаю мы пелі:

Правяду русалачку за гору,
А сама вярнусь дадому.
Правяду русалачку ў той бор,
А сама вярнусь у таткаў двор.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Жглі кастры маладзёж, хлопцы, бралі вяроўкі хлопцы, качалі, а мы адбягалі, бо яны безжаласна і ногі паабдзіраюць. Ну, а больш я нічога і не помню такога.

*Заўвага: рыбалкі – яечкі дзікіх гусей.*

***Запісана ў в. Сасноўка Гомельскага р-на ад Яшковай Марыі Міхайлаўны, 1935 г.н., студэнткай Смірновай М.***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**Вучэбнае выданне**

**Новак** Валянціна Станіславаўна
**Кастрыца** Алена Аляксандраўна

# ФАЛЬКЛОРНАЯ ПРАКТЫКА

**ПРАКТЫЧНЫ ДАПАМОЖНІК па раздзеле**
**“КАЛЯНДАРНАЯ АБРАДНАСЦЬ”**
**для студэнтаў спецыяльнасці**
**1-21 05 01 “Беларуская філалогія**

**У 2 частках**

**Частка 1**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

Падпісана ў друк 27.05.2009 (46) Фармат 60х84 1/16. Папера пісчая № 1. Гарнітура “Таймс”. Ум.-друк. арк.6,9. Ул-выд. арк. 5,35. Тыраж 50 экз.

Аддрукавана ва ўстанове адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны”
246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104